Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 31 (4422) 3 жніўня 2007 г.

У нумары:

Жыве на Беларусі Бог
Па разнастайнасці архітэктурных помнікаў Беларусь багацейшая нават за Расію
Стар. 4

Падзвіжнік духу
Пра незабыўнага Уладзіміра Калесніка — пад рубрыкай "Асобы"
Стар. 5

«Мая Беларусь»
Сачыненні школьнікаў, студэнтаў і моладзі, дасланыя на конкурс
Стар. 12

З біяграфіі аднаго кніжніка
Лявонція Клока памятае шмат адукаваных і проста інтэлігентных беларусаў
Стар. 13

Дзядзька Скалабан
Некалькі штрыхоў да партрэта нашага слыннага сучасніка-юбіляра
Стар. 15

ПАДПІСАЦЦА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛіМ» МОЖНА З ЛЮБОГА МЕСЯЦА

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 5400 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 6960 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: другое паўгоддзе, на 1 месяц — 4000 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 5640 руб.
Падпісны індэкс — 63880

Тэатр, і толькі

Самыя шчаслівыя імгненні — тэатр. Самы лепшы адпачынак — у тэатры, самыя запаветныя мары таксама звязаныя з тэатрам. Гэты самаадданы творца вобразаў і характараў нацыянальнай драматургіі проста жыве сцэнай... А сцэна ажывае, калі на ёй — Арнольд Памазан!.. Народны артыст Беларусі, лаўрэат прэміі "Крыштальная Паўлінка"(2007), найталенавіцейшы акцёр Арнольд Памазан сыграў больш як сто роляў у сотнях спектакляў на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, у якім працуе ўжо сорак гадоў. Аб'ездзіў усе куточкі Беларусі і бліжняга замежжа... Творчы лёс акцёра сапраўды можна лічыць шчаслівым! У яго прафесійнай скарбонцы вобразы Адольфа Быкоўскага ("Паўлінка"), ролю якога ён выконваў аж трыццаць два гады, Лейзера-Вольфа ("Памінальная малітва"), Мяжэніна ("Бераг"), Навума Прыгаворкі ("Ідылія"), Міхалкі ("Ажаніцца — не журыцца"), купца Абдуліна ("Рэвізор"), Алёшкі ("На дне") і многія, многія іншыя. Гэта цяпер ён чалавек знакаміты, але ж дарога да прызнання была няпростая і пакручастая...

Арнольд Памазан нарадзіўся ў Камсамольску-на-Амуры: бацькоў накіравалі туды будаўнікамі. Потым сям'я пераехала ў Дубляны, што пад Львовам. Там Арнольд скончыў школу, і трэба было вырашаць свой далейшы лёс. Маці хацела, каб ён быў медыкам, тата марыў, што будзе шахцёрам... А ён любіў на гармоніку граць! Ніякай граматы музычнай не ведаў, ставіў пласцінкі, падбіраў мелодыі і граў! Яго на сцэну ўвесь час цягнула. Але ці адразу атрымалася?

"Э-э-э... Не... Дзе там!" — прыгадвае Арнольд Кандратавіч. — Спачатку ўсё ж у медыцынскі спрабаваў — не паступіў! Потым прайшоў па конкурсе ў чыгуначнае тэхнічнае вучылішча. Скончыў, год працаваў памочнікам машыніста паравоза. І ў гэтым самым паравозе ўбачыў аб'яву пра набор у студыю пры тэатры імя Марыі Занькавецкай. Туды мяне прынялі, адвучыўся і год працаваў у тэатры — аж пакуль не звольнілі як "неперспектыўнага". Так-так... Потым спрабаваў паступаць у ГІТІС. Па конкурсе праходзіў, але з'явілася іншая праблема. Я паказаў камісіі характарыстыку са студыі, якую скончыў — думаў, што гэта дапаможа, а атрымалася наадварот. Мне адмовілі... Пакрыўджаны, абураны няўдачай я пайшоў у Міністэрства культуры СССР, да самой Кацярыны Фурцавай!.. Але ж трапіў толькі ў кабінет інспектара па ВНУ Масквы. Чыноўнік, на маё здзіўленне, захацеў мне дапамачы і прапанаваў паступаць вучыцца... Ведаеце, проста яго вялікасць выпадак: тыцнуў пальцам у карту — і гэта быў Мінск".

У Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут Арнольд Памазан паступіў таксама не адразу. Успамінае: "Галоўным у прыёмнай камісіі быў тады Дзмітрый Арлоў. Мы здавалі апошні экзамен. Выйшаў нейкі абітурыент з вёскі. Арлоў у яго запытаўся, ці ўмее той танцаваць чарльстон. А ён, зразумела, зніякавеў, разгубіўся — якія замежныя танцы ў вёсцы?! Тады Дзмітрый Аляксеевіч папрасіў каго-небудзь дапамагчы. Усе маўчаць. Я падняў руку. Мы станцавалі, я — добра, бо ведаў, як гэта рабіць, хлопец той — як змог... Нарэшце, чытаюць адзнакі: "Памазан — "два!". Ніяк я не мог зразумець, за што такі бал! Таго ж, каму я дапамог, прынялі! Прыйшоў я да Дзмітрыя Аляксеевіча запытацца: што тут да чаго, дзе ў мяне недаробкі?.. А ён мне кажа: "Баценька, вам жа трэба караля Ліра іграць, Гамлета!". Але ж я настойваў, што вельмі хачу вучыцца".

На здымку: Арнольд Памазан і актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Юліяна Міхневіч у сцэне са спектакля "Паўлінка", паказанай ля помніка песняру падчас юбілейнай імпрэзы 7 ліпеня 2007 года.

Фота К. Дробава

(Працяг на стар. 11)

Да юбілею песняроў

Светла і ўзнёсла

Святочная і ўрачыстая атмасфера панавала ў Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П. Труса, дзе адбылося літаратурнае свята "Жывое купалаўскае слова". Да яго рыхтаваліся ўсе бібліятэкары раёна і самыя актыўныя чытачы. На абанементце была разгорнута вялікая кніжная выстаўка "Пуцявінамі Янкі Купалы", якая акрэсліла ўвесь жыццёвы і творчы шлях славутага песняра. У чытальнай зале арганізавана выстаўка вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мясцовых умельцаў. Зрэшты, уся бібліятэка ў той дзень ператварылася ў вялікі кветнік, дзе ўсюды былі размешчаны прыгожыя букеты, экспазіцыі з прыроднага матэрыялу пад агульнай назвай "Кветкі роднай Беларусі — любімаму паэту".

Потым усе прысутныя апынуліся ў цудоўным свеце паэзіі — поўным святла і ўзнёсласці. Тут гучалі купалаўскія вершы ў выкананні бібліятэкараў А. Кучук, С. Ярмілінай, В. Курыльчык. Натхнёна прагучаў у выкананні бібліятэкара Лашанскай сельскай бібліятэкі Л. Салавей таксама ўрывак з паэмы "Бандароўна", якую яна помніць яшчэ са школьных гадоў. У выкананні бібліятэкара Віркоўскай сельскай бібліятэкі-клуба Лейко Ірыны Віктараўны, дырэктара Камянкоўскага СДК Шышко Наталлі Яўгенаўны, сацыяльнага работніка Пармон Валянціны Міхайлаўны, бібліятэкара Камянкоўскай сельскай бібліятэкі Сацура Тэрэсы Іосіфаўны і яе дачкі Наталлі, вучаніцы 11 класа Суткаўскай школы-сада, быў прапанаваны гледачам урывак з п'есы "Паўлінка". Бібліятэкары Азерскага сельскага Савета зрабілі інсцэніроўку невялікай паэмы Янкі Купалы "На папасе". Верш Янкі Купалы "А хто там ідзе?" на беларускай, рускай, нямецкай і англійскай мовах прагучаў у выкананні юных чытачоў Кухціцкай сельскай бібліятэкі пад кіраўніцтвам бібліятэкара Людмілы Аляксандраўны Астравух.

Важнейшай старонкай свята стала падвядзенне вынікаў конкурсу юных чытальнікаў вершаў Янкі Купалы "І плыве твой радок, і гучыць тваё слова", які быў аб'яўлены дзіцячым філіялам цэнтральнай бібліятэкі яшчэ на пачатку года. Урачыста былі названы імёны пераможцаў: Арлова Аліна, вучаніца 9 класа СШ №2, Арлова Таццяна, вучаніца 6 класа СШ №3, Дзегцярэнка Марына, вучаніца 9 класа СШ №3, Камеш Валянціна, вучаніца 8 класа СШ №3, Лазоўская Вольга, вучаніца 7 класа СШ №2. Усе дзеці-ўдзельнікі свята атрымалі ў падарунак мяккія цацкі і салодкія прысмакі, якія прадаставіў тэрытарыяльны цэнтр па абслугоўванні сям'і.

Закончылася свята прыгожымі беларускімі песнямі ў выкананні Ірыны Лук'яненкі, студэнткі Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, якая прыехала дадому на канікулы ў вёску Ліцвяны.

Аксана ДРАЧАН,
метадыст Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

У Пінскім раённым цэнтры пазашкольнай работы амаль з самай раніцы было надзвычай людна. Акрамя мясцовых школьнікаў у калідорах цэнтра можна было сустрэць хлопчыкаў ды дзяўчынак з Дабраслаўкі, Плешчыц, Аснежыц, Пучынаў, Бобрыка. Гэта ўсё дзеці, якія перамаглі на конкурсе "Лепшы малюнак па творах Якуба Коласа" і былі запрошаны на свята.

На свяце — пераможцы конкурсу

Завіталі ў госці да пінкаўчан і дзеці з вёсачкі Люсіна Ганцавіцкага раёна, дзе таксама ёсць свой музей народнага пісьменніка. Дарэчы, прыехаў і загадчык люсінскага музея Якуба Коласа В. Занько.

На свяце прысутнічаў і заснавальнік музея Якуба Коласа ў Пінкавічах І. Калоша. Яму было што расказаць вучням пра Коласа і яго час. Больш як 30 гадоў Іван Іосіфавіч збіраў звесткі аб палескім часе жыцця песняра, яго асяроддзі: што — з успамінаў самога Коласа, што — са слоў яго вучняў, людзей, з якімі ён калісьці сустракаўся, гутарыў, што — з расказаў блізкіх, сяброў і г. д.

Цікавай і змястоўнай атрымалася ўся святочная праграма, падрыхтаваная супрацоўнікамі і выхаванцамі раённага цэнтра пазашкольнай работы. Гучалі песні, вершы, урыўкі з паэмы "Новая зямля", "Курган". Запрошаныя на свята паэты Мікалай Лаўровіч, Анатоль Шушко, Марыя Ляшук, юная паэтка Вольга Курдзюмава дэкламавалі свае творы, прысвечаныя Радзіме, Коласу. Акрамя таго, яны падаравалі Пінкавіцкаму музею Коласа свае новыя кнігі.

Маргарыта АНДРЭЕВА

Фота аўтара

Сучаснае прачытанне «Другога чытання...»

Першая друкаваная кніга Якуба Коласа "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" дагэтуль існавала толькі ў выглядзе факсімільных выданняў. У жніўні, да 125-годдзя з дня нараджэння народнага паэта, выдавецтва "Мастацкая літаратура" выпусціць ілюстраваную кнігу метадычнай спадчыны песняра-педагога.

"Другое чытанне для дзяцей-беларусаў" было выдадзена ў 1909 годзе. Малады педагог Якуб Колас адчуваў недасканаласць "Першага выдання для дзетак-беларусаў" Цёткі. Колас склаў сваю чытанку, для якой адмыслова напісаў вершы, апавяданні і казкі. На яго думку, дзеці павінны пазнаваць жыццё такім, якое яно ёсць, з усёй яго чароўнасцю і суровасцю аднаасова. Таму тэксты чытанкі падчас наводзяць на зусім не дзіцячыя роздумы.

Мастак Сяргей Чарановіч, які афармляў новае выданне "Другога чытання...", надаў тэкстам Коласа сучаснае бачанне. Яго ілюстрацыі адразу прыцягваюць нейкай дзіўнай "няправільнасцю", мяккасцю і цёплым спакоем.

Каб узмацніць цікавасць шырокага чытача да тэкстаў мінулага стагоддзя, над кнігай працавала тэкстолаг Тамара Строева. Яна імкнулася адаптаваць мову "Другога чытання..." да сучаснасці.

Выкладчык кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры БДУ Ірына Саматыя напісала прадмову да кнігі. Даследаванне змяшчае біяграфічныя звесткі, гісторыю стварэння "Другога чытання...", а таксама аналіз тэкстаў.

Пісьменніца Алена Масла, якая ўдзельнічала ў стварэнні кнігі, так разважае пра неабходнасць новага выдання чытанкі:

"Чым можа зацікавіць гэтая кніга сучаснага чытача? Па-першае, гэта твор, які з'яўляецца адметным у творчасці Якуба Коласа, і мы імкнуліся зрабіць яго больш лёгкім для ўспрымання з дапамогай грунтоўнай прадмовы, адаптаванай да сучаснага чытача мовы, цікавых ілюстрацый, якаснай паліграфіі. "Другое чытанне..." — гэта падарожжа ў часе: дзецям будзе цікава, чым жылі іх пагодкі на пачатку мінулага стагоддзя, дарослыя могуць даведацца пра побыт сялянства, пра пачатак беларускай адукацыі і педагагічныя прыёмы, якія выкарыстоўваў Колас. Ну і наогул, выданне прызначаецца для ўсіх, хто неабыякавы да беларускай культуры і спадчыны".

Саша ДОРСКАЯ

На здымку: з ілюстрацый Сяргея Чарановіча да кнігі.

На справаздачу — да Купалы

Сёлетнія сёмы і адзінаццаты нумары часопіса "Полымя" асаблівыя: ліпеньскі — купалаўскі, лістападаўскі — коласаўскі. Калі другі яшчэ толькі рыхтуецца, то з першым чытачы ўжо змаглі пазнаёміцца.

Невыпадкова, што прэзентацыя купалаўскага нумара адбылася менавіта ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы. Сюды, да захавальнікаў і шчырых прапагандыстаў багатай спадчыны народнага паэта, і прыйшлі ў поўным складзе супрацоўнікі часопіса, а таксама іх аўтары.

Па прапанове галоўнага рэдактара часопіса Міколы Мятліцкага пры рэдакцыі вырашана стварыць рабочы савет па прапагандзе спадчыны Янкі Купалы, у які ўвойдуць знаныя даследчыкі купаліняны і, вядома ж, супрацоўнікі музея. А гэта значыць, што плённае супрацоўніцтва палымянцаў з музейцамі-купалаўцамі будзе доўжыцца і надалей.

Сяргей КРЫВІЧОЎ

Кніга пра сяброўства

Штогод мацнее сяброўства мінчан і маскавічоў. Пра гэта гавораць нядаўнія Дні Масквы ў Рэспубліцы Беларусь, шматлікія пагадненні, сумесныя праекты... Сяброўству, якое выйшла за межы сталіц абедзвюх дзяржаў, прысвечана кніга "Города-побратимы Минщины и Подмосковья" (складальнік Алена Галіноўская).

Выданне распавядае пра міжабласное супрацоўніцтва, у аснове якога — развіццё гандлёва-эканамічных, сацыяльных, культурных зносінаў. Кніга больш нагадвае вялікі, багата ілюстраваны альбом, у якім у звязках пададзены геаграфічныя і гістарычныя звесткі аб гарадах абодвух рэгіёнаў. Адчувальна, што кніга здольная не толькі распавесці аб сяброўстве і паказаць яго вынікі, а таксама і завабіць турыстаў да наведвання Міншчыны і падмаскоўных мясцін.

Ажыццявіла выданне РУП "Міжнародны цэнтр інтэграцыйнай інфармацыі. Грамадскі прэс-цэнтр Дома прэсы" па заказе Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы. Тыраж выдання — 1000 экземпляраў.

Анатоль ВАСІЛЬЧАНКА

«Советской Белоруссии» — 80!

Пярлінкі для роздуму і душы

Газета "Советская Белоруссия" — вядучае, змястоўнае і проста прывабнае выданне. Пра колькасць жадаючых з ёю пасябраваць гаворыць і яе тыраж, і яшчэ штосьці падсвядомае. Мабыць, інтуіцыя, якая падказвае, што менавіта на гэтых старонках ты знойдзеш сваю пярлінку — той скарб, які шукаеш, той свет, у які хочаш увайсці. Так, хочацца засяродзіцца на "Советской Белоруссии" і літаратуры, бо менавіта гэтая газета — адно з нямногіх выданняў, якое літаратуру падтрымлівае, як і ўсё мастацтва ў цэлым, незалежна ад мовы, на якой пішацца, ад стыляў і накірункаў. Таму з нумара ў нумар шукаеш для сябе тыя рубрыкі, да якіх паспела ўжо прывыкнуць і якія маглі б упрыгожыць любое літаратурнае выданне. Міжволі згадваю рубрыку "Літаратура, быт і час", з якой запомніўся, да прыкладу, артыкул Людмілы Рублеўскай "Міколка-шатл на мове падонкафф" — разважанні пра феномен няшчырасці ў літаратуры. Стала чаканай і рубрыка "Трыялет", а дакладней, госці рубрыкі, якую таксама вядзе гэтая таленавітая пісьменніца. Не абмінаеш і яе "Кніжнага навігатара", дзе ўвага праектуецца на тыя кнігі, без якіх нельга сучаснаму чалавеку ў сучасным грамадстве. Дарэчы, Людміла Рублеўская — кіраўнік аб'яднання маладых творцаў "Літаратурнае прадмесце", што вось ужо колькі гадоў існуе пры "Советской Белоруссии".

Да літаратуры, гісторыі і, увогуле, да айчыннай культуры чытача газеты далучае і знакаміты Адам Мальдзіс. Рубрыка "Суайчыннікі", якую ён вядзе, артыкулы кшталту "Хрысціянская цвярдыня Паазёрнага краю" альбо "За брэнд трэба плаціць, асабліва за княжы" не аднаму чытачу даюць падставу для роздуму: што мелі, што маем, да чаго вяртаемся. Таму і не дзіўна, што менавіта ў "Советской Белоруссии" з'явілася рубрыка "У пошуку страчанага", дзе кожная публікацыя мае незвычайна шырокі водгук.

Вядома, што падчас юбілеяў людзі не абмяжоўваюць сябе толькі аднымі віншаваннямі, абавязкова прысутнічаюць прызнанні. Прызнаюся, што калі ў свой час прапанавалі мне пасаду галоўнага рэдактара часопіса "Маладосць", пачала шукаць інтэрв'ю, якое брала калісьці ў галоўнага рэдактара газеты Паўла Ізотавіча Якубовіча для часопіса "Алеся": а раптам у тэксце ці паміж радкамі падгледжу для сябе нейкі прафесійны "сакрэт"? Думаю, што "часопіс у часопісе" пад назвай "Фантаст" у "Маладосці" з'явіўся па аналогіі таго ж "Субяседніка" ці "Дамскага клуба" ў "Советской Белоруссии"...

80 — гэта ўзрост! За тысячамі газетных старонак — часы і эпохі, і якімі б яны ні былі, на першым плане заўсёды застаюцца людзі. Пра адных у газеце пішуць, іншыя — проста чытачы. Сёння ўсе яны віншуюць сваю газету са святам!

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва» далучаецца да гэтых віншаванняў і жадае "Советской Белоруссии" далейшых узлётаў і поспехаў.

Раіса БАРАВІКОВА

На здымку: галоўны рэдактар газеты Павел Якубовіч.

Нядаўна ў памяшканні Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" адбылося ўрачыстае ўручэнне дыпломаў і грашовых прэмій пераможцам конкурсу на лепшы сцэнарый, прысвечаны Дню Незалежнасці Беларусі (падрабязней пра тэмы твораў і канкурсантаў глядзіце ў "ЛіМе" за 20.07.2007).

У абдымках кіно

Падчас урачыстай цырымоніі генеральны дырэктар кінастудыі Уладзімір Замяталін азнаёміў прысутных з планамі развіцця ўстановы. Ён выказаўся за працяг падобных конкурсаў сцэнарыяў, якія будуць насіць тэматычны характар, а не схіляцца да шырокага профілю. Прычым гэта не будуць толькі фільмы пра вайну — актуальных для нашага грамадства і нераскрытых тэм дастаткова. Уладзімір Пятровіч падкрэсліў, што на сённяшні дзень у вытворчасць запушчана ўжо 7 фільмаў.

Нягледзячы на тое, што фінансавы стан "Беларусьфільма" трохі палепшыўся, усё ж кінавытворцам прыходзіцца спадзявацца на ўласныя сілы. Зразумела, у пракаце беларускія фільмы пакуль сябе не акупляюць. Каб яны прыносілі прыбытак, трэба выходзіць на належны ўзровень якасці, магчыма, нават і праз колькасць. А таксама — з дапамогай татальнай рэканструкцыі кінастудыі, якая распачнецца ўжо 1 верасня. Вызначаны і асноўны інвестар — АТ "Ханер" (Літва).

Зараз ідзе падрыхтоўка ўсёй неабходнай дакументацыі. Пытанне аднаўлення "Беларусьфільма" актыўна абмяркоўвалася на адным з ліпеньскіх пасяджэнняў Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Дарэчы, некаторыя новыя фільмы нацыянальнай кінастудыі ўжо можна знайсці ў продажы.

Сяргей ДУБОВІК

На здымку: Уладзімір Замяталін.

Фота аўтара

«Зоркі» супраць СНІДу

Два гады таму, у Дзень сусветнай барацьбы са СНІДам, які адзначаецца 1 снежня, стартавала сусветная акцыя пад назвай "Спынім СНІД. Выканаем абяцанне". На Беларусі яна праводзіцца ў межах сумеснага праекта Міністэрства аховы здароўя і Праграмы развіцця ААН. Сімвал — "Прафілактыка і лячэнне ВІЧ/СНІДу ў Рэспубліцы Беларусь".

Як і ў іншых краінах, тварамі акцыі сталі значныя асобы ў сферы кіно, тэатра, папулярнай музыкі і спорту. Сярод нашай "зорнай" каманды — тэлевядучыя Валерый Кашчэеў, Наталля Немагай і Люся Лушчык, спартсмены-фрыстайлісты Асоль Слівец і Дзмітрый Дашчынскі, тэнесістка і спявачка Вольга Барабаншчыкава, гурты "Цяні-Талкай" і J:MOPC, актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Святлана Зелянкоўская і іншыя. Усе яны добраахвотна і з гонарам узялі на сябе гэту важную місію. Падчас акцыі, якая разлічана з перспектывай да 2010 года, тэлегледачы ўбачаць ролікі сацыяльнай рэкламы. Твары герояў зорнай каманды з'явяцца таксама на білбордах. Арганізатары мяркуюць, што прыклад клопату аб хворых на СНІД і прапаганды здаровага ладу жыцця паспрыяюць памяншэнню лічбаў жудаснай статыстыкі.

Як паведаміў намеснік міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Міхаіл Рымжа, на 1 ліпеня 2007 года агульная колькасць зарэгістраваных выпадкаў ВІЧ-інфекцыі перавысіла за 8 тыс., толькі сёлета выяўлена 544 хворых. Прычым асноўная колькасць (больш за 70 працэнтаў) інфіцыраваных — моладзь ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў. Пераважна гэта — спажыўцы наркатычных прэпаратаў.

Ёсць у акцыі і свая эмблема — чырвоная стужачка, згорнутая пяцелькай, якую ў выглядзе значка носяць усе ўдзельнікі акцыі. Між іншым, яна з'яўляецца міжнародным сімвалам людзей, што клапоцяцца пра хворых на СНІД. Дарэчы, арганізатары абвясцілі конкурс вершаў і абяцанняў, лепшыя з якіх будуць публікавацца на сайце праекта www.hiv-aids.by.

Уладзімір ШУГАВЕЕЎ

На здымку: "зорная" каманда і арганізатары акцыі.

Фота аўтара

У Ракуцёўшчыну, да Максіма

У Ракуцёўшчыне, дзе знаходзіцца філіял Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, прайшло чарговае традыцыйнае свята паэзіі "Ракуцёўскае лета-2007".

Яно пачалося з адкрыцця мемарыяльнай часткі экспазіцыі ў адноўленым доме, дзе падчас свайго адпачынку ў фальварку гасцяваў паэт. Перад прыхільнікамі яго таленту выступіла дырэктар музея Таццяна Шэляговіч і госця з Санкт-Пецярбурга, нашчадак роду Луцкевічаў, якім належаў фальварак, Маргарыта Пярова. Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея мастак Уладзімір Пракапцоў падарыў калегам з Літаратурнага музея сваю карціну, на якой многія пазналі мясцовы краявід.

А потым свята перамясцілася на канцэртную пляцоўку каля Максімавай крыніцы. Адкрыла яго намеснік старшыні Маладзечанскага райвыканкама Людміла Кананович. У выкананні мясцовых самадзейных артыстаў і харавых калектываў прагучалі песні на вершы Максіма Багдановіча і сёлетніх юбіляраў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Затым па традыцыі была прадстаўлена літаратурная старонка "Ракуцёўскага лета". Свае вершы чыталі Васіль Жуковіч, Леанід Дранько-Майсюк, Анатоль Зэкаў, Віктар Шніп, Людміла Хейдарава, іх малодшыя калегі Віка Трэнас, Зміцер Арцюх, Віктар Іваноў, Зміцер Вішнёў, Ганна Федарук і Мікола Кандратаў, мясцовыя паэткі Лідзія Гардынец і Тамара Бярэзіна. Цёпла сустракалі гледачы, якія размясціліся не толькі на лаўках, а і на травяністым пагорку, паэтаў-бардаў Эдуарда Акуліна і Алеся Камоцкага. І усё ж, відаць, найбольш апладысментаў выпала на долю членаў гістарычнага аб'яднання "Спадчына" з вёскі Дварэц Дзятлаўскага раёна. Свае самыя шчырыя вершаваныя радкі юныя паэты прысвяцілі Максіму Багдановічу.

Свята беларускай паэзіі закончылася, каб праз год ізноў сабраць прыхільнікаў класіка нацыянальнай літаратуры на новае "Ракуцёўскае лета".

Сяргей БЯРНАЦКІ

Фота Ірыны Шорац

Магічныя моманты Хельмута Цвергера

Нядаўна ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адкрылася выстава жывапісу "Магічныя моманты" вядомага мастака Хельмута Цвергера (Аўстрыя).

Спадар Цвергер вядомы ў Аўстрыі як мастак-партрэтыст. Яго творчая скіраванасць пачынае фарміравацца яшчэ напрыканцы 70-х гадоў. Мастак захапляецца ігрой на піяніна. У яго кватэры праходзілі шматлікія джазавыя сесіі з вядомымі музыкамі. Тады ж Цвергер часта гасцюе ў кафэ "Цэнтраль", дзе збіраюцца журналісты, мастакі, архітэктары, палітыкі, акцёры. Менавіта тут, у незвычайным асяроддзі інтэлектуалаў з разнастайнымі поглядамі, думкамі і ідэямі, выспявае адмысловы талент мастака, які ў сваёй творчасці абвясціў свабодную гульню ліній, фарбаў і каляровых плямаў. У работах мастака няцяжка знайсці лепшыя рысы яго таленту — карціны поўныя сэнсу і моцы, яны незвычайныя, яркія і дзіўныя.

Геаграфія выставак Цвергера ўключае ў сябе разнастайныя краіны, сярод якіх —Італія, Францыя, Іспанія, ЗША, Індыя. Ён — аўтар шматлікіх партрэтаў еўрапейскіх і амерыканскіх знакамітасцяў сферы палітыкі, мастацтва і шоубізнесу, сярод якіх — Лучана Павароці, Дэні дэ Віта, Элтан Джон, Кіт Рычардс, Арнольд Шварцэнегер, канцлер Аўстрыі Ханс Враніцкі і іншыя.

Валерый КРУЧКО

Фота Сяргея Дубовіка

"Сеанс" — праект адметны

У галерэі " Лабірынт" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі распачаў сваю дзейнасць міжнародны мастацкі праект "Сеанс", мэта якога, як вызначыў яго куратар Фёдар Ястраб, паказаць, з чаго пачынаецца мастацкі твор. Магчыма, таму падчас адкрыцця выстаўкі было прадстаўлена некалькі пачаткоўцаў у галіне мастацтва. Да прыкладу,Фёдар Ястраб пазнаёміў публіку з Іванам Семілетавым, які працуе ў станкавай графіцы і афорце. " У жывапісе, — адзначыў малады мастак, — мяне цікавіць тое, як можна выразіць смак, водар ..."

На выстаўцы — лепшыя творы сучасных мастакоў з некалькіх краін свету, што працуюць у розных мастацкіх накірунках. Так, карціна Ганны Колас " Святло, якое ледзяніць" выканана ў гравюрным жанры, " Карабель дурняў" Дар'і Букацінай — у афорце, а "Шыпшына" і "Старыя хвоі" Георгія Паплаўскага — у алоўку. Убачыць можна і замалёўкі Уладзіміра Ісачанкі з серыі "720 дзён" ды Віктара Афанасьева, а таксама экслібрысы Міколы Рыжага і мастацкія творы Рыгора Данеляна, напоўненныя ўсходнім каларытам. Работы фотамастакоў Ёхансана Ян Эрык Сульберга, прадстаўніка Нарвегіі (серыя фотаздымкаў "Край зямлі"), Андрэя Дубініна ("Матылёк") вызначаюцца высокім узроўнем прафесійнасці і арыгінальнасцю. Асаблівую цікавасць выклікае работа Вадзіма Качана "Забытыя фрэскі маёй памяці", якая сумясціла ў сабе фотаздымак і малюнак. "У гэтай рабоце, — кажа аўтар, — я выкарыстаў партрэты маіх дзяцей. На камп'тэры "апрацаваў" іх, дадаў фактурную аснову — сцяну старой хаты, яна выступае як сімвал часу ці новай памяці, на якой праступаюць вобразы дарагіх майму сэрцу людзей". На выставе былі прадстаўлены таксама шматлікія карціны мастакоў партрэтнага жанру.

Для наведвальнікаў выстаўкі было некалькі прыемных сюрпрызаў. Так, у спецыяльнай латарэі арганізатары выстаўкі разыгралі каля 20-і карцін вядомых сучасных аўтараў, удзельнікаў "Сеанса". Усе прысутныя маглі стаць сведкамі стварэння новых твораў мастацтва, убачыць так званую "мастацкую кухню". Тут на суд гледачоў была выстаўлена крапатлівая праца майстра боды-арта, а таксама не меньш захапляльны працэс стварэння цудоўнага малюнка мастаком-жывапісцам. А самым, бадай, прыемным было тое, што кожны жадаючы мог атрымаць свой партрэт, выкананы прафесійным мастаком.

Алена ЮХНЕВІЧ

«Мінск, якога няма...»

Менавіта так называлася адна з экспазіцый у Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва, якая знаходзіцца ў сталіцы на праспекце Ракасоўскага. На карцінах і фотаздымках, якія прэзентаваліся на ёй — выявы беларускай сталіцы сярэдзіны дваццатага стагоддзя, атмасфера пасляваеннага горада, частка якога не была зруйнавана і цудам захавалася.

Выявы горада, якія прадстаўляліся ў экспазіцыі, ужо можна разглядаць у якасці гістарычных дакументаў. Эвалюцыя сталіцы і выкліканыя гэтым маштабныя змены прывялі да таго, што такім, як на выстаўцы ў "Мінск, якога няма...", горад не пабачыць ужо ніхто. Нешта захавалася на паштоўках, нешта — на жывапісных карцінах і пажоўклых літаграфіях. Наведвальнікі мелі магчымасць убачыць Мінск такім, якім яго ўспрымалі вядомыя беларускія жывапісцы Сяргей Каткоў, Міхаіл Даўгяла, Міхаіл Чэпік, Іван Дзмухайла, Валерыя Жолтак і іншыя.

Большая частка работ была прадстаўлена прыватнымі калекцыянерамі Інай і Аляксандрам Радаевымі, з якімі шчыльна супрацоўнічае галерэя ў межах праекта "Прыватная калекцыя".

Ягор МАРЦІНОВІЧ

№ 31 3 жніўня 2007 г. Літ

Жыве на Беларусі Бог



Спецыялісты сцвярджаюць, што па разнастайнасці сваіх архітэктурных помнікаў Беларусь значна багацейшая за Расію.

І гэта сапраўды так, асабліва калі разглядаць нашы культавыя збудаванні, нашы цэрквы ды касцёлы ды яшчэ ў гістарычнай рэтраспектыве. Наша гісторыя, капрызлівая ды пераменлівая, падзеі, якія адбываліся на гэтай зямлі, прыносілі нам не толькі пакуты ды разбурэнні, але пакідала нам і адзнакі часу ў выглядзе непаўторных шэдэўраў. Карункавыя ды казачныя, некаторыя з іх захаваліся, — яны могуць расказаць многае, трэба толькі хацець ды ўмець гэтую кніжку чытаць. Чым далей будзе доўжыцца развіццё незалежнай Беларусі, тым знаўцаў ды аматараў расшыфроўваць гэты "каменны летапіс" будзе рабіцца больш. Ужо сёння нашы дзеці цікавяцца асобаю таго геніяльнага Іаана, што пабудаваў Спаса-Еўфрасіньеўскі храм у Полацку, альбо Глаўбіца, які перарабіў Сафію ў тым жа Полацку. Іхняе жыццё трэба вывучаць ды іх імёнамі называць вуліцы і плошчы, а не рознымі кнорынымі ды ландэрамі, якія, дарэчы, былі зацятымі ворагамі ўтварэння тагачаснай Беларусі — БССР.

Імя Іаана тут нагадалася нездарма. Мы мала ведаем пра яго, ён толькі пакінуў свой аўтограф на адным са слупоў сваёй пабудовы. Самаю першаю каменнаю царквою на Беларусі была Сафія, але гэта быў крыжова-купальны храм па ўзоры Канстанцінопальскай ды Кіеўскай Сафій, а Спаса-Еўфрасіньеўскі храм — гэта першы прыклад і ўзор цэнтрычна-вежападобнай храмавай кампазіцыі, яго вынайшаў і пабудаваў майстар Іаан з Полацка і ў гэтым ягоная геніяльнасць, таму што раней такога не рабіў ніхто. З гэтага пачалася Полацкая школа дойлідства.

Полацкія будаўнікі працавалі і па-за межамі сваёй зямлі — у Смаленску, напрыклад, пад уплывам іхняй тэхнікі склалася свая школа, вельмі падобная на Полацкую, ды ўжо адтуль яна паўплывала на будаўніча-архітэктурны стыль Пскоўска-Наўгародскіх, Уладзіміра-Суздальскіх ды Чарнігаўскіх дойлідскіх школ.

Пад уплывам полацкіх будаўнікоў пачала развівацца і яшчэ адна адметная школа дойлідаў на Беларусі — Віцебская. Доўгі час захоўваўся адзіны ўзор гэтай своеасаблівай тэхнікі выкарыстання муроўкі з чаргаваннем плінфы і каменных блокаў. Гэта была Віцебская Благавешчанская царква, пабудаваная ў сярэдзіне XII стагоддзя. Яна дажыла амаль што да нашых дзён, яе мінулі нават ваенныя віхуры, фашысцкія бомбы, толькі не людзі... У 1961 годзе яе, у ліку многіх іншых, узарвалі па загадзе тагачаснага партыйнага кіраўніка з Масквы — так званыя хрушчоўскія былі часы.

Больш лакальнае распаўсюджванне мела яшчэ адна архітэктурная школа на Беларусі — Гродзенская. Ад яе захаваўся толькі адзін помнік — Барыса-Глебская альбо Каложская царква, хоць археолагам па раскопках вядомы яшчэ многія пабудовы такога стылю ў Гародні ды ў Ваўкавыску, але яны, на жаль, не захаваліся.

Росквіт альбо заняпад будаўніцтва і дойлідства прама звязаны з гісторыка-палітычным станам дзяржаўнасці і грамадства. Так, у сувязі з нападамі татар і крыжакоў, з мангольскім нашэсцем і гібеллю Кіеўскай Русі, культавае будаўніцтва з канца XII стагоддзя спынілася ў яго ранейшым выглядзе амаль на дзвесце гадоў. Прыйшоў час узводзіць абарончыя збудаванні, замкі, вежы-данжоны, а разам з імі і цэрквы абарончага тыпу.

Надышло Сярэднявечча, перыяд, які называюць змрочным, нявесёлым, час калі кожны баяўся за сваё і сваіх блізкіх жыццё.

Эпоха адлюстроўваецца ў архітэктуры. Сцены дамоў зрабіліся тоўстымі, вокны маленькімі ды вузенькімі, з'явіліся пад'ёмныя краты-"герсы", машыкулі, з якіх абаронцы лілі на галовы ворагаў вар ды кіпень — на Беларусь прыйшоў новы архітэктурны стыль пад назваю готыка. Але ўсё гэта тычылася толькі багатых, толькі ўладнікаў ды ўласнікаў, просты ж люд па-ранейшаму жыў у нізенькіх драўляных дамках, а то і ў зямлянках. І над усім гэтым убоствам, над шэрасцю і граззю ўзвышаліся цэрквы, а крыху пазней і касцёлы, цэнтры асветніцтва ды прыгажосці, дамы, якія ўзлюбіў Бог.

XIII стагоддзе прынесла на нашу зямлю новыя стылі, новыя рэлігіі і нават новую дзяржаву. Паступова тут набірала моцы Вялікае княства Літоўскае. Хрысціянства прыйшло да нас праз Кіеў яшчэ да падзелу на праваслаўе і каталіцызм. Каталіцкая ж царква пачала пранікаць сюды разам з місіянерамі ў XI стагоддзі. Яна стала замацавалася з хрышчэннем Міндоўга, а пануючай зрабілася пры Ягайлу ў 1385 годзе. Цэнтрам каталіцызму зрабілася Вільня, там жа ж з'явіліся першыя касцёлы ды кляштары.

Каталіцкая царква, папства, заўсёды былі больш самастойныя ў сваіх зносінах са свецкімі ўладамі, у якіх бы краінах яны ні дзейнічалі. І на Беларусі, і ў межах Расійскай імперыі, і пры балышавіках. Касцёл заўсёды змагаўся за сваё рыма-каталіцкае ўздзеянне на вернікаў. Таму і цярпеў вельмі моцна ад пануючых у той альбо іншы час палітычных рэжымаў. Напрыклад, у Савецкім Саюзе, пасля цэлай серыі судовых працэсаў у 1922-м, 1923-м, 1933-м гг. і г. д. над ксяндзамі, пасля турэмных зняволянняў і расстрэлаў, каталіцкая царква на Беларусі была цалкам зліквідавана. На 1938 год ва Усходняй Беларусі, падуладнай балшавікам, не дзейнічаў ні адзін касцёл.

Усё ж, якімі б цяжкімі ні былі тыя два стагоддзі, але ж будаўніцтва храмаў — што праваслаўных, што каталіцкіх — працягвалася. Цэрквы зрабіліся абарончымі, нават канструкцыямі нагадвалі замкі, ды сваёю двухколернасцю, чырвонаю цэглаю ды белаю афарбоўкаю розных нішаў, арак, машыкулей яны былі падобныя на замкі. Параўнайце, напрыклад, Мірскі замак і такія цэрквы як Мураванка ды Сынковіцкая. Але, нягледзячы на ўплыў зменлівага часу, у праваслаўных цэрквах шмат што заставалася ад традыцый, запазычаных яшчэ ў Полацкай Сафіі. Амаль усе цэрквы XIII—XV стагоддзяў былі трохапсіднымі. Праўда, Супрасльская ды Сынковіцкая абарончыя цэрквы ўжо мелі рысы новага часу і новага стылю: іхнія паўкруглыя апсіды аб'ядноўваліся, памяншаліся, і гэта сведчыла пра ўплыў Заходняй Еўропы на наша дойлідства. А Мураванка, якая была пабудавана пазней, дык і наогул мела ўсяго толькі адну алтарную апсіду.

На самым пачатку XVI стагоддзя ў цяперашнім Ваўкавыскім раёне быў пабудаваны Гнёзнаўскі касцёл Міхаіла Архангела. Потым ён шмат разоў перарабляўся, выконваў розныя прызначэнні, нават быў калгасным складам у 1968-м годзе, але ўсё ж неяк ацалеў. Гэты касцёл — узор ранняй беларускай готыкі і таго, як зліваліся нашы мясцовыя традыцыі з візантыйскімі ды цэнтральнаеўрапейскімі ўплывамі. У гэтым жа касцёле для ўзбагачэння двухколернага, чырвона-белага, вырашэння ў муроўку дадавалася перапаленая цэгла-жалязняк.

Вельмі цікавая гісторыя была ў Гародненскага касцёла, так званай "Фары Вітаўта". Упершыню гэтая святыня ўзгадваецца ў грамаце Вялікага князя Вітаўта, які яго заснаваў. Кароль Стэфан Баторы завяшчаў пахаваць сябе ў гэтым храме і ахвяраваў вялікія сродкі на яго перабудову. Але, здаецца, ні супраць аднаго каталіцкага храма так зацята не змагаліся маскоўскія ўлады, як супраць гэтага. У 1804 годзе яго адабралі ў каталікоў і аддалі праваслаўным. Напрыканцы XIX стагоддзя перабудавалі ў псеўдарускім стылі ды прычапілі да яго ажно пяць цыбулін, а ўнізе апярэзалі какошнікамі. У 1919 годзе ён зноў зрабіўся каталіцкім, а пасля 1939-га зноў быў зачынены і ўжо больш ніколі не адчыняўся. Раптам у 1961 годзе, па загадзе ўсё таго ж багаборцы Хрушчова, гэты храм, які прастаяў 450 гадоў, быў узарваны і знішчаны. На яго месцы цяпер стаіць раённая "дошка гонару". Дык ці не варта аднавіць справядлівасць — выкінуць "дошку" ды нанава пабудаваць святыню, без цыбулін ды без какошнікаў? Мы ж цяпер незалежная дзяржава...

Усё на свеце, як вядома, прыходзіць і сыходзіць. Адыходзіла ў мінулае і Сярэднявечча, пачынаўся так званы Рэнесанс, а разам з ім з'яўляліся і новыя архітэктурныя формы. Мы, беларусы, народ сялянскі, кансерватыўны, прынамсі, ні ў якім разе не рэвалюцыйны. Таму ў нашай архітэктуры разам з новым рэнесансным увасабленнем яшчэ доўга заставаліся элементы готыкі, а ў праваслаўным царкоўным будаўніцтве — дык і шмат візантыйскіх дамангольскіх запазычанняў.

У XVI стагоддзі каталіцкая царква напаткала раптам у сярэдзіне самой сябе моцнага канкурэнта, ерэтыка і ворага — Рэфармацыю. Народжаная спачатку ў Германіі, яна хутка разышлася па ўсёй Еўропе, дапяла і да Беларусі і нават мела тут шырокае распаўсюджанне, асабліва сярод уладных ды арыстакратычных колаў. Рэфармацыя стварыла свой архітэктурны стыль у будаўніцтве храмаў. Кальвіністы, лютаране ды іншыя пратэстанты маліліся не ў касцёлах ды цэрквах, а ў кальвінісцкіх зборах. Узорамі такіх пабудоў з'яўляюцца храмы ў Заслаўі, Смаргоні, Асташыне, Койданаве. Зніклі з фасадаў кантрфорсы, замест гатычных стрэльчатых скляпенняў узнікалі цыліндрычныя аб'ёмы, а гэта значыць, што готыка адышла ў мінулае.

Каталіцкая царква знайшла сілы, каб перамагчы Рэфармацыю, стварыла новую з'яву — Контррэфармацыю і разам з гэтым узнік новы архітэктурны стыль — барока. Першым барочным храмам на Беларусі стаў Нясвіжскі касцёл Божага Цела, пабудаваны ў 1593 годзе італьянскім архітэктарам Янам Марыяй Бернардоні. Гэты першы ўзор ранняга барока паўплываў і на абліччa іншых нашых храмаў таго перыяду: касцёл у Замосці Слуцкага раёна, у Дзераўной, і нават на кальвінісцкія зборы, пазней перароблены ў каталіцкія касцёлы.

Напрыканцы XVI ст. на Беларусі ўзнікла новая царква — Уніяцкая, названая так па імені Берасцейскай Уніі, заключанай у Бярэсці ў 1596-м годзе. Саперніцтва ажно чатырох цэркваў — праваслаўнай, каталіцкай, уніяцкай і рэфармацкай — станоўча адбілася на мясцовым культавым будаўніцтве. На нашай зямлі ўзнікла унікальная архітэктурная школа, якая называецца Беларускае барока. Аднаапсідныя храмы такога тыпу характэрныя сваімі двухвежавымі фасадамі.

Яшчэ раз дазволю сабе напомніць, што забудова беларускіх гарадоў была нізкаю і драўлянаю і сяродтакіх дамоў Андрэеўскі касцёл у Івянцы альбо ў Слоніме ствараў адзіную кулісу, дзякуючы якой увесь горад нават і сёння набывае незвычайны дызайн. Калі ж улічваць, што такія "двухзубцы" ёсць і ў Глыбокім, і ў Мядзелі, і ў Мінску, і ў Ракаве, і амаль у кожным раённым цэнтры і мястэчку, дык і ўся Беларусь стварае ўражанне стромкай, светлай, застаўленай белымі падвоенымі вежамі, краіны. Дзятлаўскі касцёл Успення Багародзіцы, касцёл брыгітак у Гародні, касцёл Святой Марыі ў Вішневе, — усё пералічыць немагчыма, але пра адзін такі шэдэўр расказаць неабходна.

Полацкая Сафія, першапачаткова пабудаваная ў XI ст., была традыцыйным крыжова-купальным храмам а сямі галовах. Яна шмат разоў гарэла, а ў 1468 годзе, пасля чарговага пажара была адрамантавана, але засталася ўжо з пяццю галовамі. У 1705 годзе, калі царква ўжо была уніяцкаю, рускі цар Пётр I закрыў яе, размясціў там парахавы склад, а ў 1710 годзе ў памяшканні здарыўся выбух. Так, паўразбураная, Сафія Полацкая прастаяла ажно да 1738 года, пакуль тагачасны архіепіскап Фларыян Грабніцкі не загадаў яе адрамантаваць. Рэстаўрацыяй Сафіі займаўся Ян Крыштаф Глаўбіц, і цягнулася адбудова аж да 1750 года. Глаўбіц пабудаваў зусім іншую царкву — каталіцкі двухзубы касцёл у стылі Віленскага барока. Але геніяльны майстар выкарыстаў ад старой праваслаўнай Сафіі ўсё што толькі было магчыма, і старыя скляпенні пакінуў некранутымі.

Апошні раз Сафію пачалі аднаўляць у 1949 годзе, цяпер у яе верхняй частцы — арганная зала, а ў ніжняй, праваслаўнай, той што засталася з XI стагоддзя — вельмі цікавы музей. Такая гісторыя 4-й па ліку Сафіі, што знаходзіцца на нашай Зямлі.

Знешняе аблічча праваслаўных цэркваў мянялася больш павольна. Можа, такой няспешнасці спрыяла артадаксальная кананічнасць гэтай канфесіі. Напрыклад, рускія святары не могуць служыць у царкве, калі на ёй няма хаця б адной цыбуліны.

Калі ў Гродзенскую Каложу пусцілі вернікаў, яе настаяцель доўга цярпеў, а потым наняў работнікаў, каб тыя на Каложу(!) таксама прышпандорылі... цыбуліну. Гісторыя гэтая скончылася тым, што бацюшку з прыхода знялі і адправілі некуды, як я чуў, у Тамбоўскую губернію. Беларусь у тыя часы ўжо была незалежнаю дзяржаваю.

Пасля XVIII стагоддзя нашы землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі і пачалася новая, чарговая, эпоха. Каталікоў паступова адсоўвалі ад актыўнага грамадскага жыцця, Унію разагналі ў 1839 годзе, храмы будавалі выключна праваслаўныя,

Здаецца, мы ўжо пачалі ўсведамляць, якое багацце нам выпала ад мінулых вякоў — не меншае, чым егіпецкія піраміды ды розныя пальміры.

а тыя каталіцкія, што яшчэ заставаліся, па большасці забрала сабе таксама праваслаўнае кіраўніцтва. Напрыклад, Свята-Духаў сабор у Мінску, які быў некалі касцёлам бернардзінак, касцёл кармелітаў у Глыбокім ды мноства іншых. Архітэктура наогул уся змянілася, і не ў лепшы бок. Пасля нядоўгага выкарыстання запазычанага ампіру ды класіцызму пачалася эпоха эклектыкі, гэта значыцца, няўдалага змешвання розных стыляў — псеўдарускага, псеўдараманскага і гэтак далей. Потым прыйшлі балшавікі. Дарэчы, Хрушчоў абяцаў у 1980-м годзе паказаць свету апошняга папа. Вельмі дасціпны быў чалавек. Цяпер ён, мусіць, ліжа сваім языком распаленую патэльню, а сатана паклэпвае яго па спіне і кажа: "Дзякуй табе, Мікітка, але ты пайшоў далей за тыя інструкцыі, што я табе даваў..."

Час ідзе, людзі разумнеюць, а Незалежнасць наша ўмацоўваецца. Здаецца, мы ўжо пачалі ўсведамляць, якое багацце нам выпала ад мінулых вякоў, не меншае чым егіпецкія піраміды ды розныя пальміры. Калі нашае грамадства і наша дзяржава прыкладуць адпаведныя намаганні, скажам, такія як да Мірскага ды Нясвіжскага замкаў, дык яно, гэтае багацце, шмат разоў павялічыцца. І не толькі грашыма, бо на нябесных лічыльніках фіксуецца ўсё, не толькі камерцыйная маёмасць. Але і яна таксама.

Ігар ВАЛАСЕВІЧ

Фота аўтара

..Прыснілася: я паставіў сваю машыну ў гараж да Калесніка!.. У тым гаражы, што ўніз па вуліцы Спакойнай, адразу за Трышынскімі могілкамі, яшчэ пры жыцці гаспадара я быў усяго адзін раз. І нават, калі б хацеў, не змог бы сёння знайсці ні сам гараж, ні нават прыблізнае яго месца... Але хто ходзіць тваімі сцежкамі, Божа! І хто паказвае нам тыя сцежкі... Самохаць заехаць у Калеснікаў гараж, ды яшчэ і паставіць туды сваю машыну!.. І гэта нібы яшчэ пры ім, жывым, прысутным... Абсурднасць і абсалютная немажлівасць таго, што адбывалася незалежна ад маёй волі, выклікалі ўва мне нават у сне нейкую стрэсавую ашаломленасць, пачуццё непапраўнай віны, што паступова ахоплівалі ўсю істоту гарачаю хваляю сраму і прыкрасці...

Падзвіжнік духу

....Містычны сон перарваўся зусім рэальным тэлефонным званком. На тым канцы проваду была Зося Міхайлаўна, ягоная жонка і найблізкі сябра, якая цяпер, пасля смерці гаспадара, узяла на сябе клопат аб усіх яго недавершаных справах, аб ягоных асірацелых аспірантах і дыпломніках... І вось цяпер клапацілася пра лёс аднаго з іх, беручы пад сваю абарону і апеку...

І сон, іява звязваюць нас з ім, адышоўшым, інерцыяй прыцяжэння агромністага касмічнага цела, таямнічага і маласпазнанага, што ціха праплыло каля нас, захапіла ў сваю арбіту, ускалыхнула ўяўленне гарызонтамі нязвыклымі, невядомымі...

Памяць не адпускае. Памяць лучыць нас з ім (жывых з мёртвым) адзіным ланцугом лёсу, дзе ў грандыёзным працэсе тварэння нацыянальнай свядомасці (Калеснік паэтычна называў гэта "тварэннем легенды") кожны толькі звяно, з'яднанае родавым абавязкам і духам з папярэднікамі і наступнікамі. Продкі цанілі і ставілі гэтае пачуццё лучнасці вышэй за ўсё: пачынаючы пабудову храма ці крэпасці, засяваючы белае поле пергаменту ці паперы зернем мудрых ісцін, ведалі: нашчадкі давершаць пачатае, бо вечны род людскі духам і добрымі справамі. З тым прыходзілі ў свет, аб тым клапаціліся, адыходзячы з яго.

Я чую іх спавядальныя галасы з глыбіні стагоддзяў.

Еўфрасіннін: "Но что Успѣша при нас бывшии и родове наши? И женишася, и посягоша, и княжиша, но не вѣчноваша. И житие их мимо тече. Слава их погыбе, яко прах, и хужши паучины».

Скарынаў: "Таковый убо был милосник наукы и мудрости (пра Пталамея Філадэльфа. — **Г. П.**), иже болѣй избрал оставити в науце и в книгах вечную славу и паметь свою, нежели во тленных великих царских сокровищах".

У гэтым духоўным запавеце продкаў, з іх прагай выйсці за межы наканаванага зямнога быцця, прадоўжыцца ў памяці нашчадкаў праведнай сілай і аўтарытэтам сваёй духоўнай існасці, свайго духоўнага подзвігу, мне чуецца і яго саслабелы, балесны голас там, у бальнічнай палаце, калі, пакутуючы ад болю і мройна паказваючы вачыма некуды ўвысь, пад столь пакоя, ён як выдыхнуў нешта сваё запаветнае, вынашанае: "...От, каб дзе-небудзь там застацца, пісаў бы, думаў..."

Канцэнтрацыя на духоўным змесце жыцця, адчуванне сваёй прафесіі і творчай дзейнасці крытыка, літаратара найперш як місіі слугавання свайму народу і людзям, праз якую і ён сам як бы выходзіў у сферу вечнага чалавечага духу, альбо наасферу, як яе называў Вярнадскі, былі, як мне здаецца, магутным унутраным рухавіком і сэнсам яго падзвіжніцкай творчай дзейнасці на ніве нацыянальнай літаратуры, культуры, асветы.

Юнаком спазнаўшы пекла вайны і гераічны драматызм партызанскага змагання, страту сяброў і страх смерці, меру чалавечага і нечалавечага ў самім чалавеку, ён вельмі рана пачаў вымяраць сваё жыццё і ўчынкі катэгорыяй вечнага, маштабам гістарычнага поступу нацыі і ў гэтай сваёй грамадзянскай і чалавечай звышзадачы альбо місіі, старанна прыхаванай абалонкай знешняй прастаты і звычайнасці, вельмі часта заставаўся незразумелым не толькі абывацелю, але і людзям блізкім, нават сябрам...

Да гэтага трэба дадаць незвычайна развітую эстэтычную і маральна-этычную ўражлівасць і бясспрэчную сумленнасць, памножаныя на гарачлівы, бескампрамісны характар, якія непазбежна штурхалі яго ў самы вір жыцця, у эпіцэнтр грамадска-палітычных і літаратурных праблем і канфліктаў, з самага пачатку творчай дзейнасці выводзячы на вастрыё грамадска-навуковай думкі, што найперш канцэнтравалася тады ў сферы літаратуры і літаратуразнаўства.

Нацыянальная адраджэнская ідэя, прыціснутая напластаваннямі марксісцкіх догмаў, задушлівай атмасферай ідэалагічнага ўціску і цкавання, падспудна жыла ў ім заўсёды.

Нездарма пасля вайны, калі вынішчаная ў 30-я гады беларуская літаратура і крытыка пачалі пакрысе апрытомніваць, збіраць сілы і інтуітыўна намацваць пераараны бульдозерамі сталінізму і вульгарна-сацыялагічнай крытыкі нацыянальны шлях, расстаўляць новыя вехі, тады яшчэ малады, пачынаючы крытык адразу ж замацаваўся на гэтым грунце як даследчык літаратуры Заходняй Беларусі. Нацыянальная адраджэнская ідэя, прыціснутая напластаваннямі марксісцкіх догмаў, задушлівай атмасферай ідэалагічнага ўціску і цкавання, падспудна жыла ў ім заўсёды. Цяпер жа яна станавілася той унутранай духоўнай апорай, што надавала сэнс жыццю, навуковай і літаратурнай творчасці, спакваля гартавала ў ім дух апазіцыйнасці і ўнутранага супраціўлення афіцыйнай ідэалогіі таталітарызму і уніфікацыі.

Дарэчы, У. Калеснік ніколі не быў ні руйнавальнікам сацыялістычных асноў, ні палітычным праціўнікам сістэмы. Ягоная апазіцыйнасць у цэлым не выходзіла за рамкі памяркоўна-ліберальнай рэфармісцкай ідэалогіі шасцідзесятнікаў, а арыентацыя на сацыялістычную ідэю і сацыялістычны выбар была і да апошніх дзён заставалася па-за ўсякай палітычнай кан'юнктурай. У пачатку 80-х гадоў мне нават даводзілася чуць на яго адрас папрокі ў залішняй артадаксальнасці.

Зрэшты, ці можна нешта пэўнае сказаць пра верніка па тым, як часта ў царкве кладзе ён паклоны?! Не палітычная фразеалогія і не марксісцка-ленінская аснашчанасць асобных прац У. Калесніка (месцамі і сапраўды густаватая) вызначалі глыбінную сутнасць, змест і напрамак яго літаратурна-крытычнай дзейнасці, а прафесійная сумленнасць і нацыянальны грунт мыслення, пазіцыя шчырага заступніцтва і абароны беларускасці, роднай мовы і культуры, што рэалізаваліся ў фундаментальнай распрацоўцы ім ідэалогіі і эстэтыкі нацыянальна-вызваленчага адраджэнскага руху ў гісторыі беларускай літаратуры XVI—XX стст. Варта задумацца над значэннем хоць бы аднаго толькі факта адкрыцця і грунтоўнай прапіскі ў гісторыі нацыянальнага пісьменства творчасці У. Жылкі, В. Таўлая, Л. Родзевіча, К. Сваяка, І. Канчэўскага, Л. Геніюш, М. Машары, М. Васількa, М. Засіма, шматлікіх іншых імёнаў і твораў паднагляднай і санацыйнай да самага апошняга часу літаратуры Заходняй Беларусі. І гэта ва ўмовах, калі нават на былых членах КПЗБ ляжаў цень падазронасці, закрываліся беларускія школы, ішоў шалёны русіфікатарскі наступ, а правадыры БССР ліхаманкава рыхтаваліся папоўніць беларусамі новую гістарычную супольнасць — савецкі народ...

Дзівакам-рамантыкам, накшталт У. Калесніка, пры такім раскладзе, што прапаноўвала сваім грамадзянам магутнейшая ў свеце таталітарная дзяржава з яе жорскай сістэмай іерархічнага падпарадкавання, строгай рэгламентацыяй і кантролем за ўсімі формамі выяўлення грамадскай думкі, не заставалася нічога лепшага, як разгортваць свой ідэал дзяржаўнага і грамадскага ўладкавання на пляцоўках ідэалагічна больш ціхіх і бяспечных, чым сфера рэальнай палітыкі. Скажам, дрэйфаваць у мінулую гісторыю Беларусі, да цьмяных берагоў Сярэднявечча, дзе ўзгаралася зорка беларускага Адраджэння, пачынаўся Новы час, наступаў Залаты век... І Францыск Скарына са старонак "Библии русской" разважаў аб мудрых законах, якіх павінны слухацца і якім мусяць падпарадкоўвацца нават цары...

Непапраўны ідэаліст і фантазёр, які публічна бажыўся ў сваіх камуністычных перакананнях, ён чамусьці захапляўся і аддаваў відочную перавагу ў сваіх працах прымітыўна-простым, змадэляваным паводле законаў жывой прыроды і боскай справядлівасці формам арганізацыі грамадства і грамадскага жыцця. Тым самым, паводле якіх жылі першыя хрысціянскія абшчыны, што яшчэ не скаштавалі пладоў рэальнага сацыялізму, паводле якіх і сёння жывуць у прывольных пушчанскіх лясах чароды асілкаў-зброю, раяцца пчаліныя раі... Звяры і птушкі ведаюць свае лагавіскі і гнёзды, а людзі навекі захоўваюць у сваім сэрцы любоў і ласку да мясцін, дзе нарадзіліся і ўзгадаваліся з ласкі Божай...

Непапраўны ідэаліст і фантазёр, які публічна бажыўся ў сваіх камуністычных перакананнях, ён чамусьці захапляўся і аддаваў відочную перавагу ў сваіх працах прымітыўна-простым, змадэляваным паводле законаў жывой прыроды і боскай справядлівасці, формам арганізацыі грамадства і грамадскага жыцця.

Чалавек нябесны, улюбёны ў Сярэднявечча і паэзію класічных рамантыкаў, ён быў адначасна і чалавекам надзіва зямным, рэалістычным, які хадзіў па грэшнай зямлі, і гэты цвёрды грунт пад нагамі, смак цяжкой штодзённай навуковай і творчай працы, вір службовых, гаспадарчых, бытавых і іншых дробязных і нядробязных клопатаў і спраў былі для яго такой жа неабходнай і сэнсоўнай часткай жыцця, як і патрэба ўзірацца ў зорнае неба над галавой і недасяжны іскрысты Млечны Шлях...

Жыццё, людзі, свет цікавілі яго ва ўсёй разнастайнасці і шматаблічнасці сваіх праяў, ва ўсіх сваіх унутраных дачыненнях, сутыкненнях і супярэчнасцях, гармоніі і анамаліях, высокім і нізкім, трагедыйным і камічным.

Ён і сам быў чалавекам няпростым, складаным — як уласнай неардынарнай, рэдкай натурай, так і адбітым у ёй часам з яго кантрастамі, супярэчнасцямі і ілюзіямі, з яго надзеямі і памылкамі, з яго праўдамі і горкімі крыўдамі. Ён быў як само жыццё... І нават назвай сваёй развітальнай кнігі дзякаваў жыццю за дар бласлаўлёнага святога і грэшнага чалавечага наканавання...

Ягоны чалавечы характар можна суаднесці са спектрам дзённага святла: у ім як бы ўсе мажлівыя адценні і грані чалавечай натуры, узятыя ў іх дыялектычных антыномах... Ён быў мудры і гарачліва безаглядны, праніклівы і наіўна-даверлівы, адчайна смелы, нават дзёрзкі і абачліва асцярожны, бескампрамісны і памяркоўны, паблажлівы і педантычна строгі, па-таварыску просты, даступны і субардынацыйна недасягальны... Быў шляхетна далікатны і абыходлівы з людзьмі і мог прылюдна разануць такое... у духу не горшых узораў вуснай творчасці народа, што заставалася толькі пачухаць патыліцу... Усё залежала ад узроўню асобы субяседніка і сітуацыі, грамадскай важнасці і прынцыповасці дыскутаванага пытання ці праблемы, унутранага настрою і стану душы.

Але над усімі антыномамі дамінавала і звязвала іх у цэласны чалавечы характар ягоная непаўторная мудрая, іранічнамяккая ўсмешка, якая гаварыла пра яе ўладальніка больш і глыбей, чым усе напісаныя ім кнігі і сказаныя словы...

...Мне здаецца, што якраз у шматграннасці і дыялектычнасупярэчлівым універсалізме натуры і чалавечага характару Уладзіміра Андрэевіча, што дазваляла яму лёгка распазнаваць розныя тыпы аўтарскай індывідуальнасці і характараў літаратурных герояў, прагназаваць і дакладна ацэньваць іх псіхалагічныя рэакцыі і паводзіны ў канкрэтных жыццёвых сітуацыях і, адпаведна, адэкватнасць іх эстэтычнай сублімацыі ў мастацкім вобразе, якраз і прыхавана таямніца яго унікальнага крытычнага дару.

Прычым сама літаратурна-крытычная праца была для яго не толькі інструментам пазнання рэчаіснасці і мастацтва, але і формай самога жыцця, той яго унікальнай гранню, якая дазваляла спаўна рэалізаваць якраз найбольш моцныя бакі яго шматграннай таленавітай натуры.

Калеснік — літаратар, творца і Калеснік — жывы чалавек — шмат у чым розныя людзі. Пісьмо, праца над словам астуджвалі яго гарачую імпульсіўную натуру, яго імгненную, часта непрадказальную рэакцыю на падзеі і з'явы грамадска-палітычнага і літаратурнага жыцця, людзей, дазваляліспыніць і вярнуць час, скарэкціраваць празмерна эмацыянальныя ацэнкі альбо недакладныя высновы. Пісанае слова вызваляла ў ім прастору для вечнага, для глыбіннага філасофскага роздуму над сутнасцю жыцця і з'яў мастацтва, вызваляла ў ім мысліцеля, як Радэн вызваляў скульптурны вобраз, адсякаючы, па яго словах, усё лішняе.

Ён і сапраўды быў у гушчыні жыцця, быў як само жыццё, але адначасна і над жыццём.

Ён жыў у сваім часе, але і над часам.

Ён заўсёды быў самім сабою, але і над сабой, больш за самога сябе...

Усё ягонае жыццё ёсць гісторыя бязлітаснага спаборніцтва, змагання і барацьбы: з часам, лёсам, з самім сабою — учарашнім, недасканалым, кансерватыўным...

Я не магу назваць у сённяшняй нашай літаратуры пісьменніка, літаратара, роўнага яму ў гэтым чалавечым і творчым подзвігу: патрэба ў самаўдасканаленні, у пастаянным самаабнаўленні была ўнутранай асновай, стрыжнем яго натуры, яго тытанічнай, па-сапраўднаму рэнесансавай постаці.

У свае семдзесят тры гады ён пайшоў ад нас да крыўднага рана, па-маладому прагны праўды і хараства, поўны шматлікіх задум, у вечнай, нясканчанай спрэчцы з жыццём і яго праблемамі.

Ягоны дух сягаў на стагоддзе!..

Прысніцца ж такое: я паставіў сваю машыну ў гараж да Калесніка!..

Генадзь ПРАНЕВІЧ

З чыстымі помысламі

Не, не, ды і згадаецца іншы раз студэнцкая пара, студэнцкі інтэрнат на вуліцы Свярдлова, вучэбны корпус на Чырвонаармейскай, дзе месціўся філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Гэта цяпер універсітэты на кожным кроку, у кожным абласным цэнтры і нават у некаторых гарадах раённага падпарадкавання. А некалі БДУ імя У. І. Леніна ў сталіцы Беларусі быў адзінай прэстыжнай навучальнай установай, студэнтам якой стаць марылі многія.

Я трапіў у БДУ імя У. І. Леніна адразу пасля сканчэння сярэдняй школы. На першым курсе, дый потым, маім сябрам быў Жэня Жываглод. Ён на пяць гадоў старэйшы за мяне, ужо адслужыў, у адрозненне ад мяне, у войску. Мы жылі ў адным інтэрнацкім пакоі, абодва гадаваліся без бацькоў: і яго, і мой загінулі на вайне і пахаваны ў брацкай магіле на чужыне. Жэня высокі, падцягнуты, з густым басам, добразычлівай усмешкай на сур'ёзным, часта спахмурнелым твары. Я доўга не мог зразумець яго спахмурнеласці, і толькі праз нейкі час мне адкрылася прычына гэтага: Жэня моцна перажываў за маці. Ён вось у студэнтах, а дома гаспадарка, і маці мусіць упраўляцца кругом адна.

Радзіма Жэні Жываглода — вёска Казловічы, што на Случчыне, якая ў тую пару грымела не толькі сваімі народнымі песнямі, але і працоўнымі дасягненнямі. Пра хор, пра яго ветэранаў, пра Казловічы я напісаў у "Чырвоную змену". З той публікацыі, мабыць, і пачынаўся мой пісьменніцкі лёс.

Мінула з тых дзён шмат часу. Жэня Жываглод пасля універсітэта настаўнічаў на Міншчыне. Быў настаўнікам, дырэктарам то ў адной школе, то ў другой. І ўвесь час пісаў вершы, але нідзе і ніколі не друкаваў. Пісаў для сябе, для душы. Іншы раз чытаў напісанае дзецям. Пісаў заўсёды па-руску. Чым вытлумачыць выбар мовы? Мабыць, тым, што яму давялося служыць тэрміновую салдацкую службу ў Закаўказзі, на аддаленых ад населеных пунктаў пагранічных заставах. Там, у цішыні, у адзіноце, у час доўгіх і няпростых салдацкіх роздумаў ён і пісаў. Праўда, апошнім часам ён піша і на роднай мове, на мове маці, бацькі, дзядоў. Я прачытаў яго паэму ў рукапісе "Княгіня Лоская" і магу засведчыць, што ягоны беларускі верш густа аздоблены каларытным беларускім словам.

Але сёння размова пра паэтычны зборнік Яўгена Жываглода "Край березовый мой", які выйшаў сёлета ў выдавецтве "Кнігазбор". Тэматычна ён разнапланавы. І гэта невыпадкова, бо ў кнігу ўключаны вершы розных гадоў. Адразу варта зазначыць, што аўтар добра валодае майстэрствам вершаскладання, тонка адчувае тэму, чуйны да слова.

У час службы Я. Жываглод быў далёка ад Беларусі, ад роднага дома, ад сцежак і дуброў дзяцінства. Вядома, яны яму сніліся, ён сумаваў па іх, не ўяўляў без іх свайго жыцця.

Как ты далек, родимый дом,
Весь ветхий, старенький,
но милый,
С сиренью синей под окном
Что вечно шепчет об одном.
Забытый сад стоит
унылый...

Там, удалечыні ад радзімага гнязда аўтар-салдат мроіць аб вяртанні дамоў, аб тым, што, вярнуўшыся, трохі адпачне з дарогі і возьмецца будаваць новы дом.

Я в поте сам пройду от вех
И до последней половицы.
Пусть будет новый дом
для всех
Кому здесь выпало
родиться.

Малая радзіма заўсёды жыла ў сэрцы Жываглода-салдата канкрэтнымі, ніколі не забыўнымі назвамі вёсак.

Голышовка, Горбаха,
Синявское —
Не названья —
истории клад.
Здесь века, словно вече
заправское,
Все родным языком говорят.

Раздзелы кнігі, прысвечаныя салдацкай службе, малой радзіме, аўтар назваў "Каўказскі блакнот" і "Розовая птица". Яны, бадай, самыя яркія, уражлівыя, запамінальныя, сюжэтна разнастайныя. Расказваючы паэтычным радком пра будні армейскага жыцця, пра Случчыну, аўтар паказвае, што гэтыя будні напоўнены паходамі, вучэннямі, роздумамі пра бацькоў, пра неба Беларусі, што жывуць у яго сэрцы заўсёды, куды б ні закінуў яго лёс.

Там, дзе давялося служыць, аўтар знаёміцца са звычаямі іншых народаў, параўноўвае іх з тымі, якія маюць месца на Беларусі, і знаходзіць, што кожны народ багаты сваёй прыязнасцю да іншых народаў. І гэта яднала народы СССР, рабіла іх неадольнай сілай, а краіну магутнай. Аб той краіне аўтар піша з любоўю, бо яна дала яму магчымасць стаць Чалавекам.

З сыноўняй любоўю, смуткам і болем піша Я. Жываглод пра бацьку — салдата Вялікай Айчыннай.

Вижу отблик отца.
Вот он гонит прокос —
Нараспашку рубаха
холщовая длинная.
Почему же не смотрит он,
как я подрос,
Почему будто тает
фигура былинная?

Ён спачувае сам сабе, што не можа прыйсці на магілу бацькі, якая дзесьці на чужыне, дзе "под небом чужим воронье" і "никто не уронит слезу на могилу".

З майго пункта гледжання, аўтару найбольш удаваліся тыя вершы, дзе ён шчыры, дзе ён спавядаецца перад самім сабой, перад сваім часам і перад тым, што яму блізка і дорага, што, так ці інакш, закранула яго сэрца, душу, не пакінула абыякавым.

Паэтычны зборнік Я. Жываглода "Край березовый мой" — вынік шматгадовай працы. Гэта першы і пакуль адзіны зборнік аўтара. Але характэрна тое, што ў ім не асабліва заўважаецца вучнёўства і тыя відавочныя агрэхі, характэрныя для пачаткоўцаў. Я. Жываглод піша вершы ўсё сваё свядомае жыццё. І гэтая яго праца, безумоўна, заслугоўвае добрага слова і станоўчай адзнакі. Яна, спадзяюся, не застанецца не заўважанай.

І, нарэшце, хочацца зазначыць яшчэ адно. Я. Жываглод знаёміць чытача з гісторыяй напісання таго ці іншага свайго твора. Гэта дае магчымасць успрымаць змест яго твораў з цікавымі дэталямі і падрабязнасцямі. Для чытача гэтакі падыход неардынарны, што дазваляе яму далучыцца да творчай лабараторыі паэта, зразумець яго творы больш глыбока і грунтоўна.

Іван КАПЫЛОВІЧ

«Apocalypse please!»

Мне прынеслі паштовы канверт — ведаеце, такі трохі большы за звычайны, жоўтага колеру — у іх, здараецца, дасылаюць каштоўныя лісты і паперы. Змесціва канверта — трошкі бруду і песімізму ў іх слоўным выглядзе, трошкі — у выглядзе сапраўдным, датыкальным, змешчаным у асобным пакеціку, нібы напамінак пра канкрэтнасць і рэчыўнасць усяго благога, што ёсць у нашым сапсаваным свеце. Ружовыя акуляры цяпер не да твару прасунутаму чалавецтву, здыміце іх неадкладна, а калі ў вас есць яшчэ нейкія наіўныя ілюзіі і маветонны аптымізм — калі ласка, чытайце, мацайце, смакуйце кнігу Ілы Сіна "Сапсаваныя лялькі", што выйшла сёлета ў выдавецтве Логвінава, і далучайцеся да натоўпу, які скандзіруе: "Apocalypse Please!" (Калі ласка — у апакаліпсіс!) І, на мой погляд, як вынікае з кнігі, ён гэты самы "apocalypse" атрымае абавязкова.

Вядомы забаўнік, штукар і пісьменнік Ілья Сін вытканы з супярэчнасцяў. Сам ён кажа, што ні ў якім разе не песіміст, і што Бог выратуе тых, хто мае намер быць выратаваным.

Але кніга не пакідае адчування, што выйсце ёсць. Мы ўсе — сапсаваныя лялькі, недзе у нашых вантробах адбылася непапраўная паломка. *"Сапсаваныя лялькі выкідаюць у сметніцу"*.

Ілья Сін не лічыць сябе постмадэрністам. Насамрэч, адна з галоўных рыс постмадэрнізму — сааўтарства пісьменніка і чытача (дзе апошні можа трактаваць твор на свой густ і заўсёды будзе мець рацыю) — відавочная ў "Сапсаваных ляльках". Напрыклад, што для вас "Нью-Бабілён" Сіна — вырашаць вам: ці пазнаеце вы гэты горад, што завяз у хлусні і самагубствах, дзе цяжка дыхаць ад дыму рытуальных вогнішчаў, дзе за каханую ты можаш толькі маліцца, успамінаючы свае спатканні з ёй на вуліцы павешаных.

Маю ўспомніць таксама і пра іншыя рысы постмадэрнісцкіх твораў, якія ўласцівыя і творам Ілы Сіна. Гэта і шматузроўневая арганізацыя тэксту, і гіперінфарматыўнасць, інтэр- і паратэкстуальнасць і канцэптуальнасць.

Усе прыкметы наяўныя. З аднаго боку, можна ўздыхнуць з палёгкай і адзначыць, што постмадэрнізм на Беларусі ёсць. З другога — пакпіць з яго зачаткавага стану. Часам заўважаеш, што некаторыя вытрымкі з кнігі нагадваюць наіўныя ў сваёй брутальнасці опусы семнаццацігадовых хлопчыкаў-максімалістаў, і тым болей гэта дзіўна, ведаючы, што аўтар — чалавек адукаваны і дасведчаны. Ставіцца да такіх момантаў у тэксце як да гульні, да "сцёбу", да своеасаблівага светаўспрымання? Калі ласка, тут вам шырокая прастора для роздуму.

"Трансгэсіўная проза" Ілы Сіна выклікае ўражанне глыбокага і жахлівага начнога кашмару. Паспрабуйце прачнуцца і адшукаць "дзесяць адрозненняў" паміж сном і явай. Адшукаеце — вы шчаслівы чалавек у ружовых акулярах.

Алеся СЯНЧУК

«Мяне трымае моцна поле праўды»

Творы, якія ўвайшлі ў гэтую кнігу, пісаліся ў час "безвременья": адшумела-адгрымела так званая перабудова, перастала існаваць вялікая дзяржава, сталі набіраць разгон негатыўныя з'явы ў жыцці, многія людзі пачалі страчваць духоўныя арыенціры... Менавіта ў тыя гады (1989—1993) і пісаліся санеты, вянкі санетаў і вянок вянкоў санетаў Змітрака Марозава. Яны і склалі кнігу "Я ўсё часцей жадаю слухаць неба" (Мінск, "Тэхнапрынт", 2002 год).

Як патрыёт сваёй Бацькаўшчыны, З. Марозаў у сваіх санетах паказаў усю складанасць таго часу, яго праблемы, клопаты, а таксама чалавека ў гэтым часе, з яго перажываннямі, думкамі, надзеямі. Як пісаў ён у той час: "Вярэдзяць сэрца вечныя пытанні". Родная Беларусь, краіны-суседзі і далёкія дзяржавы, вострыя грамадска-палітычныя пытанні і зберажэнне прыроды, гісторыя і дзень сённяшні, мірны і ваенны час, матэрыяльнае і духоўнае, культура і быт народа, сумленнасць і негатыўныя з'явы, пачварнае і прыгожае — усё гэта ў полі зроку паэта, які прызнаецца: "Мяне трымае моцна поле праўды". Ён нераўнадушны да лёсу роднай староннкі, свайго народа.

У пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя актуальнымі былі радкі паэта:

Старыя вёскі —
нашы боль і сорам
Яны глядзяць на свет
з нямым дакорам...

Сапраўды, не прайшло і паўтара дзесятка год з той пары, а ўжо вёску не пазнаць: ажыццяўляецца грандыёзная праграма яе адраджэння, абнаўляецца тэхнічная база гаспадарак, добраўпарадкоўцца і прыгажэюць населеныя пункты краіны. Мяняюцца ў лепшы бок і адносіны да працы, бо, як адзначае З. Марозаў, "У працы — паратунак для людзей".

Так, мары паэта збываюцца. Навядзенне парадку ў краіне стала пытаннем дзяржаўным, а самае галоўнае — добрасумленная, напружаная праца вяскоўцаў прыносіць плён.

Вы чуеце? Шапоча каласамі
Падзяку хлебаробу збажына.
Ад хлеба згода ў свеце і любоў.

Сапраўдны паэт-лірык, З. Марозаў у сваёй творчасці належную ўвагу надае найвышэйшаму чалавечаму пачуццю — каханню. Прычым піша шчыра, выяўляе разнастайныя гамы інтымных пачуццяў. У лепшых вершах паэта эмоцыі і перажыванні выяўляюцца не толькі праз канкрэтныя словы, але і праз музыку радка. А яна, па словах Льва Талстога, часта становіцца тым "ледзь-ледзь" улоўным, што робіць верш сапраўднай паэзіяй:

Не, чалавецтвам правяць
не цары,
Не каралі — валадары,
Мацней за ўсіх правіцеляў
— каханне.

Што ж, на палетках паэта выспеў добры ўраджай: больш трох дзесяткаў санетаў, дзесяць вянкоў санетаў, якія ўвайшлі ў рэцэнзіруемую кнігу ("Сад", "Ты", "Валуны", "Прызнанне", "Дума", "Наканаванне", "Барок", "Аб роўнасці, аб волі, аб зямлі", "Таемнасць", "Вянок Беларусі").

Першым у славянскай паэзіі З. Марозаў стварыў вянок вянкоў санетаў "Апакаліпсіс душы", які прысвяціў светлай памяці таксама майстра санета Анатоля Сербантовіча. Твор напісаны ў 1988—1990 гадах. Па словах Леаніда Дайнекі, Змітрок Марозаў, без перабольшвання, здзейсніў паэтычны подзвіг.

"І вянкі санетаў, і, тым больш, вянок вянкоў санетаў патрабуюць ад паэта і майстэрства, і вялікай працавітасці, настойлівасці ў пошуку цікавых тэм, актуальных праблем", — напісаў у прадмове да кнігі Вячаслаў Рагойша. Таленавіты сейбіт на паэтычнай ніве Змітрок Марозаў падкрэслівае:

Надзеі, веры, шчасця і кахання
Хачу сваім нашчадкам пажадаць.

Міхась КАВАЛЁЎ

Кніжная паліца

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла кніжка Аляксандра **АФЯРОЎСКАГА** *"Анэлін хутар"*. Гэта раман — заключная частка трылогіі ("Двое на тонкім лёдзе", "Феафанія"), у якой распавядаецца пра героя дзвюх папярэдніх кніг Антона Каласоўскага. Напружаны сюжэт твора пра самае светлае пачуццё — каханне.

У выдавецтве "Кнігазбор" выйшаў другі выпуск калектыўнага зборніка *"Сопричастность"* (на беларускай і рускай мовах). Гэта вершы аўтараў, што працуюць на прадпрыемстве ЗАТ "Атлант", сярод якіх і ўжо вядомыя ў літаратуры людзі, як А. Кудласевіч і Я. Малец.

Я раман тык незалежны,
Я паэт, хоць нявідомы,
Будзе талент мой бязмежны,
Будзе жыць ён, пакуль плённы.

Так піша М. Максімчык. На тое маюць спадзеў і ўсе астатнія аўтары зборніка. Шчырыя пачуцці нават на "Атланце" не замарозіш...



У выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў серыі "Млечны Шлях" выйшаў калектыўны зборнік беларускай фантастыкі *"Люстэрка Сусвету"*. У кнігу ўвайшлі творы беларускіх пісьменнікаў, напісаныя на беларускай і рускай мовах. Сярод **дваццаці чатырох аўтараў** — класікі жанру і зусім маладыя літаратары. Прадмову напісаў Ст. Саладоўнікаў.



У выдавецтве Віктара Хурсіка выйшла ў свет кніга Уладзіміра **СОДАЛЯ** *"Волат з Мігаўкі"* (успаміны землякоў пра Аляксандра Уласава). Расповед сусядзяў-вяскоўцаў пра вядомага першага беларускамоўнага эканаміста, рэдактара газеты "Наша Ніва" (да 1914), дэлегата першага Усебеларускага кангрэса (1917), сябра Прэзідыума Рады Беларускай Народнай Рэспублікі і сенатара Польскага сойма ад Беларусі. Займальнае чытанне — уражлівая постаць, высокадухоўная асоба, беларускі чалавек.

У Гродзенскай друкарні пабачыла свет першая паэтычная кніга Дзмітрыя **РАДЗІВОНЧЫКА** *"Пиррова техника"* (на рускай мове). Гэта дэбют аўтара (дарэчы, 16 гадоў ён адпрацаваў у друкарні). Прадмову напісаў вядомы паэт Юрка Голуб, які напрыканцы зазначыў, што "налицо как раз тот самый случай, когда первая книга Дмитрия Радиончика является, надо же, избранным автора. И этот неординарный на поэтическом небосклоне эпизод на глазах становится предтечей собственного продолжения и, вполне возможно, восхождения".

Вытокі нацыянальнай рэалістычнай традыцыі

Толькі ў «ЛіМе»

Выдатны помнік прыгожага пісьменства Беларусі першай паловы XV ст. – летапісная "Аповесць пра паўстанне ў Смаленску". Твор напісаны выдатнай старабеларускай мовай, на высокім мастацкім узроўні і ў рэчышчы нацыянальных эстэтычных традыцый, дзякуючы чаму ён з'яўляецца арганічнай часткай беларускай літаратуры даўняга перыяду.

"Аповесць пра паўстанне ў Смаленску", верагодней за ўсё, была створана ў Смаленску, які на той час уваходзіў у склад Вялікага княства Літоўскага. Яна захавалася ў складзе Слуцкага летапісу. Імя яе аўтара, на жаль, невядомае. Шматлікія дэталі "Аповесці..." сведчаць, што стваральнік жыў у Смаленску, выдатна арыентаваўся ў гарадскім жыцці і ў палітычных рэаліях таго часу.

Унікальнае ідэйна-эстэтычнае значэнне "Аповесці пра паўстанне ў Смаленску" ў тым, што ў ёй упершыню ў нацыянальнай мастацкай прозе знайшоў панарамнае адлюстраванне сацыяльны канфлікт, глыбокае непаразуменне і антаганізм паміж шараговымі месцічамі і ўладамі горада Смаленска, што вылілася ў грамадзянскае непадпарадкаванне і маштабнае ўзброенае паўстанне. У мастацкай форме раскрыты ідэйныя і палітычныя разыходжанні паміж двума сацыяльнымі станамі, матывацыя іх учынкаў і паводзінаў падчас змагання.

Аўтар "Аповесці..." выступіў як пісьменнік-наватар, заснавальнік рэалістычнага напрамку ў беларускай мастацкай літаратуры. Ён аб'ектыўна, усебакова і праўдзіва раскрывае логіку гістарычных падзей, паказвае палітычныя перадумовы, канкрэтныя прычыны і абставіны, што прывялі да ўзброенага паўстання ў Смаленску.

Пісьменнік не ідэалізуе варагуючыя бакі. Ён застаецца рэалістам пры абмалёўцы ўсіх удзельнікаў канфлікту — паўстанцаў, смаленскага ваяводы Андрэя Ісаковіча з яго атачэннем, а таксама ўрадавых войскаў ВКЛ. Так, аўтар аб'ектыўна піша пра жорсткую расправу вайсковых аддзелаў ваяводы Андрэя Ісаковіча над паўстанцамі, у выніку якой мноства гараджан было заколата дзідамі, шэраг — смяротна параненыя. Затым у творы намалявана каларытная сцэна жахлівай смерці смаленскага маршалка Петрыка, які быў затоплены ў Дняпры раз'юшанымі гараджанамі. Пісьменнік не шкадуе цёмных фарбаў, апісваючы падаўленне ўзброенага паўстання ў Смаленску ўрадавымі войскамі ВКЛ, якія спалілі мноства гарадскіх прысадаў, цэркваў і манастыроў, нялітасна пасеклі безліч людзей, шмат каго ўзялі ў палон.

Аўтар відавочна імкнуўся быць дакладным у гістарычных дэталях. Так, ён падрабязна пералічвае ўдзельнікаў паўстання, "чорных людзей", сярод якіх былі прадстаўнікі розных рамесніцкіх цэхаў. Ён карэктна піша пра вайсковы рыштунак і віды ўзбраенняў паўстанцаў.

"Аповесць пра паўстанне ў Смаленску" адметная тым, што ў ёй даволі поўна адбілася барацьба гараджан за ўласныя палітычныя і грамадзянскія правы, перадусім, — за захаванне гарадскога самакіравання. Так, прывядзенне да прысягі смалянаў ваяводам Андрэем Ісаковічам у перыяд безуладдзя ў ВКЛ, пра што падрабязна пішацца ў творы, дыктавалася імкненнем перашкодзіць росту сепаратных настрояў у горадзе.

Пісьменнік не шкадуе цёмных фарбаў, апісваючы падаўленне ўзброенага паўстання ў Смаленску ўрадавымі войскамі ВКЛ, якія спалілі мноства гарадскіх прысадаў, цэркваў і манастыроў, нялітасна пасеклі безліч людзей, шмат каго ўзялі ў палон.

Твор надзвычай цікавы і тым, што ў ім знайшлі адлюстраванне першыя, яшчэ ледзь заўважныя праявы палітычнай пераарыентацыі Смаленска ўжо ў першай палове XV ст. з Вільні на Маскву, пра што сведчыць запрашэнне смалянамі ў якасці новага ваяводы князя Андрэя Дзмітрыевіча Дарагабужскага, а затым прызнанне сваім гаспадаром князя Юрыя Лынкверіевіча, які паходзіў з Ноўгарада Вялікага.

Пераклад "Аповесці пра паўстанне ў Смаленску" ажыццёўлены паводле Слуцкага летапісу. (гл.: ПСРЛ. М., 1980. Т. 35. С. 77—78).

Іван САВЕРЧАНКА,
доктар філалагічных навук

АПОВЕСЦЬ ПРА ПАЎСТАННЕ Ў СМАЛЕНСКУ

У 1440 годзе было ўчынена вялікае злачынства ў Вялікім княстве Літоўскім. На вербную нядзелю, перад абедам, у Троках забілі вялікага князя Жыгімонта.

Паўсюдна ў краіне ўспыхнулі беспарадкі.

У той час у Смаленску ўладу трымаў Жыгімонтаў стаўленік — Андрэй Ісаковіч. Ён пачаў прыводзіць смалянаў да прысягі. Ваявода патрабаваў ад гараджанаў:

— Вы павінны пакорліва чакаць, пакуль князі і паны будуць абіраць гаспадара на вялікае княжанне. Вам нельга пакідаць Вялікага княства Літоўскага і выходзіць з-пад улады вялікага князя, а тым болей — далучацца да іншых земляў. Вы мусіце цалаваць крыж мне, як вашаму ваяводзе, і падпарадкоўвацца маёй уладзе, пакуль у Вільні на вялікае княжанне не ўзыдзе новы манарх.

Смаленскі епіскап Сімяон, усе князі, баяры, месцічы і чорныя людзі цалавалі крыж на вернасць ваяводзе Андрэю Ісаковічу, падпарадкоўваючыся яго ўладзе.

Але праз пэўны час, на святым тыдні, у сераду, чорныя людзі — кавалі, кажамякі, шаўцы, мяснікі, кацельнікі — пераступілі крыжацалаванне і пастанавілі прагнаць ваяводу Андрэя Ісаковіча з горада. Яны адзелі кальчугі, узялі ў рукі сулiцы, лукі з стрэламі, косы, сякеры і ўдарылі ў звон.

Пан Андрэй Ісаковіч пачаў радзіцца са смаленскімі баярамі.

Баяры параілі ваяводу:

— Загадай, пане, сваім дваранам узбройвацца. А мы з табою. Не трапляць жа нам у іх рукі жывымі!

І выступілі вайсковыя аддзелы ваяводы Андрэя Ісаковіча на конях, узброеныя дзідамі, супраць чорных людзей.

Сутычка адбылася каля гарадка Барыса і Глеба. Шмат паўстанцаў было заколата дзідамі, паўсюль стагналі параненыя. Астатнія збеглі пад націскам вайсковых аддзелаў Андрэя Ісаковіча.

Праўда, у тую ж ноч ваявода Андрэй Ісаковіч пакінуў Смаленск, забраўшы з сабой сваю сям'ю. Разам з ім ад'ехалі і яго баяры.

Пасля ад'езду ваяводы ў Смаленску зноў выбухнула вялікае паўстанне. Чорныя людзі злавілі смаленскага маршалка Петрыка і затапілі яго ў Дняпры. Затым смаляне абралі сабе ваяводу — князя Андрэя Дзмітрыевіча Дарагабужскага.

У гэты час Паны-Рада Вялікага княства Літоўскага, князі і паны ўсяго гаспадарства, пасля працяглых узгадненняў, абралі вялікім князем каралевіча Казіміра. Урачыста і з шанаваннем ён быў узведзены ў Вільні на вялікае княжанне і абвешчаны гаспадаром усёй Рускай зямлі.

Каля таго часу князь Юры Лынкверіевіч прыйшоў у Літву з Ноўгарада. Вялікі князь Казімір даў яму ў гаспадаранне вотчыну — горад Мсціслаўль.

Неўзабаве смаленскія баяры, што пакінулі горад з ваяводам Ісаковічам, захацелі вярнуцца ў Смаленск. Але чорныя людзі не пусцілі іх у горад. Баяры раз'ехаліся па сваіх вёсках.

Праз пэўны час баяры і чорныя людзі зноўку сышліся ў крывавай бойцы.

Тады смаляне паклікалі да сябе гаспадаром акурат князя Юрыя Лынкверіевіча. Князь Юры ўзяў у палон смаленскіх баяраў, закаваў іх у ланцугі, а іх маёнткі раздаў сваім баярам.

Увосень таго ж года, на Піліпавы запусты пад Смаленск былі падцягнуты ўрадавыя войскі Вялікага княства Літоўскага. Паўтара тыдні яны трымалі аблогу горада, спалілі мноства прысадаў, цэркваў і манастыроў, пасеклі безліч народу, шмат людзей узялі ў палон.

Вялікае зло ўчынілі ўрадавыя войскі, а затым — адышлі прэч.

Пераклаў Іван САВЕРЧАНКА

Аповесць для падлеткаў Алеся Наварыча "Пакланюся Перуну, памалюся Вялесу" (часопіс "Маладосць", №№ 4—5 за 2007 год) выклікала ў педагагічных калектывах спрэчкі. Адны ў палемічным запале сцвярджаюць, што аўтар, абраўшы жанр фэнтэзі, абрынуўся ў містыку. Другія пераконваюць у тым, што пісьменнік, захапіўшыся ідэяй распаўсюджвання хрысціянства, тым не менш "агітуе" за мірнае суіснаванне рэлігій рознага кшталту (не сказана, маўляў, у аповесці, да якой канфесіі належыць таямнічы манах). Трэція падзяляюць трывогу пісьменніка наконт дэмаграфічнага крызісу ў апісаным А. Наварычам рэгіёне (хутка не будзе каго вучыць у школе).

Легенды славяць Бацькаўшчыну

Як высветлілася ў час сустрэч са школьнымі настаўнікамі, ёсць сярод іх і тыя, хто лічыць, што А. Наварыч увогуле выступае за "пераробку" свядомасці суайчыннікаў на "візантыйскі капыл". Падліла масла ў агонь крытык Лада Алейнік, якая, аналізуючы змест беларускіх часопісаў у "ЛіМе" (нумар ад 11 мая 2007 г.), убачыла ў аповесці казку, расказаную настаўнікам-фантазёрам Савіцкім вучням.

Дык вось заяўляю з поўнай адказнасцю: аповесць А. Наварыча не мае ніякага дачынення да жанру фэнтэзі. У творы дамінуе эсхаталагічны аспект апакрыфічна-жыційнай літаратуры (які эфектыўна выкарыстоўваўся, праўда, у ідэалагічна-атэістычных мэтах, Янкам Маўрам у творы "Падарожжа ў пекла", а таксама ў казках Якуба Коласа і А. Якімовіча, у прозе У. Караткевіча).

У аснову аповесці А. Наварыча пакладзены факт выключны: манах са стольнага Кіева выпраўляецца ў небяспечнае падарожжа на Піншчыну, хаваецца ў час навальніцы ў дупле дрэва і засынае летаргічным сном. Прыцягнуўшы ўвагу чытача да асобы манаха, які рушыць у далёкую дарогу з сакрэтным пасланнем ад настаяцеля кіеўскага манастыра, пісьменнік звяртаецца да элементаў прытчы, панегірыка, буфанады, пераўвасабленняў, выкарыстаўшы форму падарожжаў.

Пакладзеная ў аснову твора падзея сапраўды развіваецца па законе парадокса, узмацняючы напружанасць, алегарызм, іншасказальнасць, спараджаючы ланцуговую рэакцыю. Манах, які прабіраўся на Палессе з сакрэтным пасланнем, схаваным у посаху і залітым смалой, трапіў у бяду: дуб, сховішча падарожніка, падчас навальніцы абрынуўся ў раку. Канфлікт, пазначаны празаікам у завязцы, развіты ў творы да ступені высокага напружання. Маю на ўвазе прыход у школу да настаўніка Савіцкага Паўла Камара з намерам папрасіць прабачэння ў Мікалая Лявонавіча за пераўвасабленне ў таямнічага манаха. Захоплены аповедам педагога студэнт на вачах закаханых Міхася і Алены выбраўся з мораной рачной вадой векавога камля. Гэтак званы манах і кінуўся шукаць царкву, каб атрымаць боскае бласлаўленне. У царкву (вось вам і сімволіка навідавоку) пацягнуліся за ім людзі. А адна з жанчын, паверыўшы ў цуд, знаходзіць Паўла ў студэнцкім інтэрнаце і просіць блаславіць яе...

У аснову аповесці А. Наварыча пакладзены факт выключны: манах са стольнага Кіева выпраўляецца з сакратным пасланнем на Піншчыну, хаваецца ў час навальніцы ў дупле дрэва і засынае летаргічным сном. Далей — бяда: дуб, сховішча падарожніка, падчас навальніцы абрынуўся ў раку...

Узнясенне героя працягваецца. Эпізод прыходу "ўваскрослага" манаха (Паўла Камара) у школу ёмісты па змесце: хлопец сыходзіць, так і не сустрэўшыся з настаўнікам. Бо ўбачыў, як пасля званка з класа цяперашняй малакамплектнай школы выкаціліся ў аблезлы калідор толькі чатыры вучні, якія перад гэтым слухалі аповед Савіцкага аб прыгодах паляўнічага ў афрыканскіх джунглях. Вось і праблема: хто пасля састарэлага настаўніка зможа расказаць нашчадкам пра родны край, ажывіць легенды і паданні дзеля ўслаўлення Бацькаўшчыны, роднага дома, адкуль пачынаецца шлях да духоўнасці. "Зрэшты, — піша аўтар, — дом і ёсць Харома. Бо гэта родная хата кожнага, кожнаму ў гэтай Хароме прызначаюць і ўстаўляюць у цела душу. Стаіць Харома пад шатром з кляновага галля, сонечныя плямы бегаюць па яе свежым, вечна свежым зрубе з цукровымі, такімі пахкімі падцёкамі смалы. Гэта ладан і міра нашых ваколіц, нашай зямлі".

У аповесці А. Наварыча кранае і эпізод вяртання незнаёмцам Паўлу Камару ягонага гадзінніка. Гадзіннік у творы — сімвал часу, вяртання героя да самога сябе, фактар духоўнай падзіткі, умова канчатковага пераходу ў іншае вымярэнне, у свет дабрыні. Гадзіннік — гэта і ўзнагарода. За ажыўленне героем легенды.

Аўтар, сыходзячы з канцэпцыі нелінейнага часу, вяртае нас, чытачоў, да вытокаў вечнага, вопыту продкаў. Пазначаная праблема духоўнасці соцыуму празаікам пададзена ў плане ўзаемаабумоўленасці інтэлекту і духоўнасці. Празаіку ўдалося вызначыць каштоўнасныя арыентацыі, зазірнуўшы ва ўнутраны свет герояў, зацікаўленых у раскрыцці тайны з'яўлення манаха. Аўтар аповесці, што станоўча, адшукаў механізм духоўнай трансфармацыі герояў, іх маральнага сталення. Апраўданы ў творы выбар эрудзіраванага героя, які з павагай ставіцца да гісторыі народа і яго традыцый. З твора бачна: Павел-гісторык шукае карані агульнага, асэнсоўваючы вечнае. Своеасаблівым культурным цэнтрам, лічыць А. Наварыч, належыць стаць і школе, якая павінна абудзіць пачуццё сацыяльнай адказнасці чалавека. Менавіта праз культуралагічны змест адукацыі і можна адшукаць алгарытм сацыяльнай дзейнасці асобы, сцвярджаць адзінства чалавека і прыроды. З імператывам чалавечнасці суадносіць празаік сваіх герояў (вобразы Фаіны Барвінковай, Марыі Мікалаеўны), якія ўмеюць супрацьпаставіць часоваму вечнае.

Кароткa пра недахопы аповесці. Нараканне выклікае аднастайная рэакцыя некаторых герояў (асабліва Лены Заронак) на тыя ці іншыя падзеі. "І манах ажыў, — працягнула Лена думку настаўніка". "Аў! — піскнула Лена і моцна ўчапілася за хлопца". Альбо яшчэ: "Калі Лена піскнула і моцна ўчапілася за Пятра, ён сам спужаўся, хоць выгляду не падаў"; "Глядзіце, глядзіце! — ледзь не заверашчала Лена. Усе глянулі туды, куды яна паказвала". "Лена хіхікнула, і гэтым вырашыла ўсё".

І апошняе. Інтрыга ў творы — не самамэта. Аднак, захапіўшыся ёю, празаік перагрузіў твор другараднымі эпізодамі, якія выпадаюць з сюжэтнай канвы аповесці (з'яўленне ў вёсках прыхадняў, "п'яныя прыгоды" Яшкі і Івана на чале з Паўлам). Заштампаванасць, перыядычнае паўтарэнне моўных адзінак, калькі з царкоўнаславянскай мовы, частае ўжыванне адасобленых акалічнасцей у нейкай ступені збядняюць маўленчыя паводзіны герояў цікавай аповесці таленавітага празаіка.

Браніслаў ЗУБКОЎСКІ

Віктар БУБНАЎ

* * *

Я так люблю сваю зямлю,
Што патрапіўшы да сябра
На студыю гуказапісу,
Шчыра прасіў запісаць
На новую грампласцінку
Шум вятроў,
Спеў птушак,
Цурчанне крынічных ручаёў
І куванне зязюлі
Пад незабыўныя коласаўскія радкі:
Мой родны кут, як ты мне мілы...

* * *

Борам не пахне ніколі дуброва,
Флейтай не будзе іграць барабан,
Добрым не можа
быць крыўднае слова,
Сум, калі светлы — ужо не журба.

Вецер ёсць вецер, а ціша ёсць ціша,
А пачуццё прачынаецца зноў...
І ні рэкламаю, і ні афішай
Быць аніколі не зможа любоў!

* * *

Вясною пахне белы снег,
Ён сонцам — бы прапалены:
Глядзіць трава, нібыта ў сне,
На белы снег з праталіны.

І промні гэтак кожны дзень
Сняжынкі ціха злізваюць,
Каб у вясновы час надзей —
Зямлю ад снега вызваліць...

* * *

Віхор звілі вятры,
Ён там — навідавоку...
Высока ж угары —
Шар сонца,
нібы вока.

І злых вятроў віхор
Зрабіўся раптам смерчам,
Хаця зямны прастор
З ім не чакаў сустрэчы.

Ды страшны смерч, як цмок,
Спакой і ў небе рушыць:
Няўжо ж ляціць пясок,
Каб сонца запарушыць?..

Не рвіся, кругаверць,
У неба так высока —
Табе не даляцець
Да сонечнага вока.

У ПАЛОНЕ САМОТЫ

Зноў самота скрушная мяне
Узяла ў палон, нібы з дакукі...
Выпусціць не думае — о, не! —
Мне звязаўшы неспадзеўна рукі.

Гэтаю самотнаю парой
Са свабодай, мабыць,
не сустрэцца,
Бо настрой, хоць вызваліцель мой,
Ратаваць сягоння не бярэцца.

* * *

Прыйшла пара ўлюбёнасці
І пачуццю — зноў быць.
Вясной я маю здольнасці
Хоць двойчы палюбіць.

Жыццё — нібыта хроніка...
А праўда — добры свет:
Не пражыве без сонейка
Ні бездар, ні паэт...

Хоць думка і банальная,
Ды піша ўсё ж рука,
Што проста геніяльныя
Ўсе песні жаўрука.

Анастасія РОГАЧ

* * *

Мітусня, штодзённыя турботы
Закруцілі у сваёй віхуры.
Так з дня ў дзень: работа,
дом, работа...
І якія там ужо амуры?!

А жыццё праходзіць год за годам,
У знаёмых падрастаюць дзеці,
А ў цябе — работа, дом, работа...
І заўсёды спаць кладзешся ў дзесяць.

* * *

Ўсім нягодам сваім насупраць,
У вясновы кваціcты вечар
Праз натоўп я іду насустрач,
Да цябе іду на сустрэчу.

І ўсё роўна, што скажуць людзі.
Думкі іх мяне не турбуюць,
Бо такога, як ты, не будзе,
І шукаць ужо не спрабую...

Ужо ў небе нам поўня свеціць.
Мы маўчым, бо слоў не хапае.
Мы адны на усёй планеце.
Я, здаецца, цябе кахаю...

* * *

Такі прыгожы з дзьмухаўцоў вянок
Ты мне прынёс сягоння ў падарунак.
О, колькі мараў уваскрэсіць змог
Салодкі твой і моцны пацалунак.

Тваіх жаданых і ласкавых рук,
Здаецца, не забыць ужо ніколі.
Яны вялі мяне ў кваціcты луг,
Яны вялі мяне праз лес і поле.

Здаецца, мы сваіх не чулі ног,
Бо ўсё было святочным, незвычайным.
Такі прыгожы з дзьмухаўцоў вянок
Стаў для мяне
пярсцёнкам заручальным.

* * *

Імгненні шчасця трапяткія
Хай застануцца на вякі,
І хай ніколі не пакіне
Мяне цяпло тваёй рукі.

Хай застануцца нашы душы:
Мая — ў тваёй, твая — ў маёй,
Каб аніхто не змог парушыць
Адзінасць нашую з табой.

* * *

Прыйшоў? Ну што ж, заходзь,
не стой,
Пастаўлю чайнік.
І вось ты, мой паўночны госць,
Глядзіш адчайна.
Вачэй не зводзіш і маўчыш,
Усё сказа́на.
Ды толькі вось яшчэ баліць
На сэрцы рана.
Прабачыць? Не, Гасподзь з табой,
Усё забыта.
Вось толькі зараз для цябе
Душа закрыта.
Ты быў ці не, я не скажу.
Навошта словы?
Адчайна ў вочы пагляджу,
Бы выпадкова.
О, як калісь два пачуцці
Свой вальс кружылі!..
Два кубкі кавы на стале
Даўно астылі...

* * *

Я цябе ніколі не пабачу,
Голас твой ніколі не пачую.
Не, каханы, я даўно не плачу,
Не, ўжо нават болей не сумую.

Ты не той, і я зусім не тая.
Не апошні ты ў мяне, не першы.
Хоць каханне птушкай адлятае,
Будзе жыць яно у нашых вершах.

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ

* * *

Ён раптам зразумеў,
што час нас забівае.
Ў акно зірнуў, дзе сонца не знікае,
дзе ліст самазабыўна трапятаў,—
і штось успомніў, і зарагатаў.

Яго і трэсла, й курчыла ад смеху,
трымцелі шыбы і вярталі рэха.
Сабой мяняліся падлога, столь...
Падумаў сам,
што розум страцію свой.

І скончыў рагатаць з сябе ён стомна,
і лоб ахаладзіў сцяной пакорна...

* * *

Папярок дарогі — і куды імкне? —
цень адыходзіць ад мяне.

Выцягнуўся, цемень расхінуў —
і будынак дальні закрануў.

Слізгануў павольна па сцяне,—
я іду, нібыта ў нейкім сне.

Толькі крок яшчэ марозна гулкі.
Вуліца. Аціхлыя завулкі.

Шолах бы чуцён і за вярсту.
Побач з ценем са сваім іду.

Толькі й тут яму прасторы мала:
павярнуўся — і зусім не стала.

Азірнуўся — так і не знайшоў,—
быццам сам я ад сябе сышоў...

* * *

Прачнуўся. Ад снегу — святло.
І ўміг адчуванне такое,
што беды мае замяло
халоднай яго белізною.
Ухутаны ў снег правады,
так вейна кранае іх вецер,
бы мне ўжо ніякай бяды
не выпадзе болей на свеце...

* * *

Ранне. Вецер варочае кроны,
мкнецца ўпоперак, рвецца ўдаўжкі.
Зноў крычаць вераб'і і вароны,
заліваюцца дружна шпакі.

Над балотам — трывожлівы гогат,
першы жоўты, зняможаны ліст,
траскатлівы, драўляны, бы клёкат,
манатонны, адрывісты свіст.

Ў гэтым карканні,
ў свісце панурым,
ў гэтым дні, дзе не ціх ветравей,
першы раз я так страшна
падумаў:
толькі месяц пяе салавей.

* * *

С.Ш.

Я жыць пачаў, калі сустрэў цябе я, —
ізноў, ізноў падказвае завея
у лютым, падсупаючы здаля.
Ізноў зімой становіцца зямля.

Ты пад маім удзячна-думным зрокам
заўсёды побач, хоць парой далёка.
Я не самотны нават і адзін,
ні сівізны не страшна,
ні маршчын.

Так, толькі ты
ўсёй сутнасцю зямною
мне памагаеш быць сягоння мною.
Надзею вось на поспех
зноў святлом
снег чыста праясняе за акном.

Міргаючы, калышацца, іскрыцца...
Само сябе сумленне скрозь баіцца.
Я так цяпер табе і снегу рад!
Зноў паміж намі толькі снегапад.
Захоплена слязамі пазіраю,
дыханнем словы шчасця напаўняю...
А без цябе ну што, скажы, я мог?!
Напэўна, і мяне ўсё ж любіць Бог.

Пераклад з рускай мовы
Соф'і ШАХ

Мікола МІНЗЕР

ВЕЧНАЕ

Жыццё, жыццё!
Навошта ты вось так:
Вядзеш, вядзеш
Да нейкай пэўнай мэты,
А потым раз —
І абарвецца шлях...
Бы ты й не жыў
На свеце белым гэтым.

Бы ты й не бачыў,
Як квітнее рунь,
Як першы крок
Даецца немаўляці,
Як сонца бліск
Запальвае зару,
І ад яе —
У печы паліць маці.

Бы ты й не чуў,
Як правіць дзед касу,
І як зязюлька
Роспачна кукуе,
І як, макнуўшы
Ноты у расу,
Над полем песню
Жаўранак спрабуе.

Бы ты й не браў
Касы ў рукі сам,
Бы ты й падаў
Стомлены ў пракосы,
А потым бег
Хутчэй напіцца там,
Дзе мілая
Свае купала косы.

Мільён разоў
Я ўнікаў у гэта —
Заўсёды думка
Мроіла адна:
Чаму працуем
Зранку да цямна
І ўзвесці дом —
Бяром сабе за мэту.

Фота К. Дробава

Малітоўнік

Апавяданне

Павел САВОСЬКА

Малітоўнік быў невялічкі, у карычневай вокладцы. На яго я выпадкова трапіў, калі перабіраў на гарышчы кніжкі. Я даставаў іх з абшарпаных чамаданаў, кошыкаў, і нават са звычайных мяшкоў. У асноўным гэта былі падручнікі, па якіх калісьці вучыўся ў школе, але часам трапляліся і даволі цікавыя творы з мастацкай літаратуры. Я абтрос з іх пыл і перанёс у свіран, дзе змайстраваў з новых дошак шыкоўныя стэлажы.

Малітоўнік забраў з сабою ў хату. Ён пагадаў мне падзеі трыццацігадовай даўніны.

Служыў я тады першы год у войску, вучыўся на механіка-вадзіцеля цяжкіх танкаў. І тут пасябраваў з Іванам Сухавым, або, як усе ласкава называлі яго, Ванюшам. Гэта быў сапраўдны асілак: рослы, шыракаплечы, а сілу меў — узвод наўрад ці справіўся б з ім. Праўда, быў ён на дзіва спакойны і маўклівы. Цяжка было выцягнуць з яго лішняе слоўца. Нават на шматлікія жарты амаль не звяртаў увагі.

Праз які месяц-другі я прыкмеціў, што ён зусім не атрымлівае лістоў. Запытаў аднойчы ў яго пра гэта. Ён моўчкі зірнуў на мяне, уздыхнуў і ціха адказаў:

— Я з дзіцячага дома.

Толькі пазней я даведаўся, што ягоная маці, шаснаццацігадовай дзяўчынкай, выпадкова зацяжарыла і памерла пры родах.

Нашаму сяброўству паспрыяла яшчэ тое, што нашы ложкі ў казарме стаялі побач. Сам я да войска паспеў скончыць толькі вучылішча трактарыстаў, а Ванюша — горны тэхнікум, працаваў на Урале.

У вольныя хвіліны, якія зрэдку нам выпадалі, Ванюша чытаў адну і тую ж кніжку. Праз які час пачаў прыкмячаць, што чытае яе неяк дзіўна — заўсёды пачынае з сярэдзіны, ды аніяк не можа дачытаць да канца.

Гэта мяне зацікавіла. Аднойчы выбраў зручны момант, зазірнуў цераз яго плячо і ўбачыў, што ў той кніжцы ляжала яшчэ адна — зусім невялікая па сваіх памерах. Вокладка яе была ўмела і надзейна прымацавана да "Кароткага курса гісторыі КПСС".

"Вось табе і Ванюша", — падумаў я. Як піць даць — забароненую літаратуру чытае. У той жа вечар спытаў у яго пра тую кніжку. Ён адразу збянтэжыўся, нават пачырванеў, азірнуўся навокал, а пасля ціха спытаў:

— А ты нікому не раскажаш?

— Ты ж мяне ведаеш — ні слова, — адказаў я.

Тады Ваня шапнуў мне на вуха:

— Гэта малітоўнік.

Я здзівіўся і распавёў, як пасля заканчэння дзесяцігодкі не паступіў у марское вучылішча, прыехаў дадому, ды не ведаў куды падацца. Жыў толькі з маці, тая білася з апошніх сіл, але заробкі ў калгасе былі тады мізэрныя. Мне хацелася хутчэй рвануць у самастойнае жыццё, а тут такая асечка! Пайсці куды працаваць — пашпарта не было, бо ў той час вяскоўцам яго не выдавалі. Думаў я думаў, ды вырашыў падацца ў духоўную семінарыю. Тут якраз адзін хлопец з нашай вёскі вучыўся ў Жыровічах. Паехаў я туды, але і там не прынялі, бо гадоў не хапіла — залічвалі толькі з васемнаццаці.

Ванюшу мой аповед зацікавіў да немагчымага. Не было таго дня, каб ён не распытваў у мяне пра жыццё семінарыстаў. А я ж і сам пра іх мала ведаў. І тут ён мне прызнаўся, што пасля службы вырашыў паступіць у семінарыю, а пасля і духоўную акадэмію скончыць. І вось цяпер, каб не марнаваць дарэмна час, рыхтаваўся да будучых экзаменаў: завучваў на памяць малітвы.

Адно было дрэнна: Ванюша амаль штодня выходзіў паўгалодны з нашай вайсковай сталоўкі. Крыўдна было, што яму не хапала аднаго сантыметра росту, каб атрымліваць двайную порцыю. Яе выдавалі тым, у каго было сто дзевяноста пяць сантыметраў. І ён, бедачок, часцяком падыходзіў "да амбразуры", дзе повар амаль заўсёды, калі не было побач начальства, кідаў Ваню чарпак-другі кашы.

Мне і самому ў войску вельмі хацелася есці. Калі былі грошы, то забягаў у нашу вайсковую краму, купляў батон, бутэльку напітку і тут жа імгненна з'ядаў. Але аднойчы нам з Ванюшам пашчасціла — да таго наеліся, што ледзь жывымі засталіся.

Здарылася гэта пасля майскіх святаў. Амаль у кожную нядзелю для нас была палёгка: з раніцы прабяжым крос, або яшчэ якія спаборніцтвы, а пасля — вольныя казакі. А тут у чарговы выхадны паступіў загад: усёй ротай вывучаць новую песню. Спяваць на галодны жывот нам з Ванюшам не вельмі хацелася. І тут нас выратаваў, калі так можна сказаць, невялікі, але шустры капітан-артылерыст.

Наш ротны аддаў загад: хто не хоча спяваць — выйсці са строю. Набралася нас чалавек восем. Капітан нам растлумачыў, што затрымае на гадзіну, не больш.

Пасля прыехалі на таварную станцыю і пачалі разгружаць з платформаў славутыя гарматы-саракапяткі. Управіліся хутка, але ж пасля давялося чысціць ствалы вялізным баннікам. Вось тут мы і папацелі! Прайшла гадзіна, другая, а мы і паловы не вычысцілі.

Стомленыя, злыя і галодныя як ваўкі, заявіліся мы ў свой полк толькі а палове пятай. Капітан пагутарыў з дзяжурным на кухні, і нам падалі тры бачкі з мясам і чатыры — з кашай. І пачалі мы ўсё гэта ўплятаць. Што тут усчалося — толькі лыжкі мільгацелі!

Пасля ледзь дабраліся да казармы. Вось дык сачканулі! Астатнія хлопцы паспявалі тую песню з гадзіну якую, ды былі вольныя, а мы як дурні ўкалвалі.

Але на гэтым не ўсё скончылася. Першым адчуў сябе дрэнна Сцёпа Казакевіч. Спачатку стагнаў на ложку, а пасля пачаў крычаць. Хуценька адправілі яго ў санчасць, бо пачаўся заварот кішок. Урачы ўратавалі, але давялося зрабіць аперацыю. А нас маёр-медык вывеў на плац і загадаў павольна хадзіць сюды-туды. Многім наш занятак падаўся дзіўным, усе не маглі ўцяміць — дзеля чаго мы тут шпацыруем. Цэлую гадзіну пратупалі, пад няспынны рогат сваіх саслужыўцаў.

Але наш Ванюша ўсё-ткі атрымаў двайную порцыю. А здарылася вось што. Праз які месяц завітаў у наш полк з праверкай генерал медыцынскай службы. Танклявы, хударлявы дзядок, але з вельмі жвавымі і прывабнымі вачыма. Ён уважліва агледзеў санчасць, пабываў у казармах. Вядома ж, не прамінуў і нашу сталоўку. Там, як заўсёды, навялі аўральны марафет. Мы якраз толькі пачалі абедаць. А ў нашым узводзе быў такі Валера Сайгушаў — жартаўнік, якіх пашукаць. Анекдотаў ведаў — не злічыць!

Вось ён, Сайгушаў, і шапні за сталом:

— Ванюша! Такі момант упускаць — грэх. Кіньcя ў ногі генералу — адразу ж атрымаеш двайную порцыю!

Мы ўсе прынялі ягоныя словы за чарговы жарт і моўчкі працягвалі абедаць пад пільным вокам старшыны роты. А генерал, у суправаджэнні сваёй світы, збіраўся якраз пакінуць сталоўку, як здарылася непрадбачанае. Нечакана для ўсіх наш Ванюша падняўся з-за стала і рашуча накіраваўся да генерала, які на хвіліну затрымаўся, акідваючы позіркам вялізную залу.

Мы думалі, што ён звернецца да генерала па ўсёй форме, але наш Ванюша і сапраўды ўпаў перад ім на калені і ледзь чутна прамовіў, нізка апусціўшы галаву:

— Прашу двайную порцыю.

Наш камандзір палка збялеў, старшына роты ледзь стрымліваў сябе, каб не накінуцца на Ванюшу ці не з кулакамі. Збянтэжыўся і сам генерал:

— Падыміце яго! — усклікнуў ён.

А калі яму растлумачылі сэнс Ванюшавай просьбы, то ён ускіпеў:

— Як жа так?! Менш сантыметра не хапае — гэта жах! Зараз жа выпісаць двайную порцыю!

Ванюша тым часам падняўся на ногі. Генерал выйшаў са світай на вуліцу. Не паспеў Ванюша сесці за стол, як тут жа ля яго апынуўся старшына роты.

— Я цябе накармлю! Здубееш у мяне на кухні!

Ванюшу пасля прапясочвала начальства не адзін дзень, але двайную порцыю ён атрымаў. Вельмі гэтым быў задаволены, нават крыху павесялеў.

Сам я да канца сваіх дзён буду ўдзячны Ванюшу за тое, што ўратаваў мяне ад смерці. Здарылася гэта на танкадроме. Суседняя рота здавала экзамены па ваджэнні танка, а нас з Ванюшам адправілі абслугоўваць варонку. Гэта такая вялізная яміна-перашкода. Нам патрэбна было яе крыху падпраўляць. Але танкі імчалі адзін за адным. Тады мы вырашылі крыху перачакаць. Непадалёк, у маладым сасоннічку, разаслалі бушлаты ды прылеглі адпачыць.

Заканчваўся жнівень, дзянёк быў цёплы і сонечны, я нават зняў гімнасцёрку, каб крыху загарэць. Навокал стаяў гул ад танкавых матораў. Праз які час я раптам убачыў перад сабою ствол танкавай гарматы. Не паспеў нават спалохацца, як Ванюша імгненна схапіў мяне за дзягу і перакінуў цераз сябе. І ў той жа момант у нейкім метры ад нас праімчаў танк, праехаў правай гусеніцай па маім бушлаце.

І толькі тут я зразумеў усё — закалаціліся і рукі, і ногі. Мы падхапіліся на ногі, кінуліся да варонкі і ўсё зразумелі. У варонку заехаў адзін танк, яго крыху развярнула, і ён не мог адтуль выбрацца. Убачыўшы такое, іншыя вадзіцелі пачалі абмінаць варонку, вось і паімчалі па сасонніку, дзе мы адпачывалі.

Пасля таго здарэння Ванюша стаў для мяне быццам родны брат. А я... я пастаянна ў думках прасіў Усявышняга, каб дапамог яму ў жыцці.

Мы ўжо рыхтаваліся да выпускных экзаменаў, як Ванюшу нечакана на тыдзень адправілі ў Маскву. Калі прыехаў, то расказаў, што яго адпраўляюць да канца тэрміну службы ў Егіпет на будаўніцтва Асуанскай плаціны.

Шкада было з ім развітвацца, але ж нічога не зробіш. А перад самым ад'ездам ён і падарыў мне свой малітоўнік, бо баяўся браць яго з сабою. Дасылаў пасля зрэдку кароткія лісты. Пісаў, што працуе на экскаватары, тыднямі стаіць страшэнная спякота, але пачаў патроху прывыкаць.

Я ўжо заканчваў другі год службы, калі Ванюша напісаў, што прыдбаў талон на атрыманне аўтамабіля "Волга". Я вельмі ўзрадаваўся. Што б там ні казалі, а Божанька ёсць на небе і ўсё бачыць. Вось і Ванюшу Ён не пакінуў без увагі.

Пасля так здарылася, што перапіска наша спынілася. І па сённяшні дзень я не ведаю пра лёс Ванюшы. Ды думаецца мне, што ён усё-ткі ажыццявіў сваю мару — стаў святаром.

...Цяпер, калі — здараецца, наваліцца самота ў маю халасцяцкую кватэру — дастаю з паліцы Ванюшын малітоўнік, паволі перачытваю малітвы, успамінаю сваю маладосць, і адразу ж ціхая радасць апаноўвае маю душу.

Навела

Мікола СТАНКЕВІЧ

Гора на падворку

Па-вераснёўску пяшчотна-цёплым днём Раман — спецыяльна ўзяў дзеля гэтага адпачынак — капаў удваіх з маці бульбу. Загон быў не дужа каб вялікі — сотак на дваццаць. Лічы, напалову меншы, чым летась, пры жывым яшчэ бацьку. Сёлета ж, навошта ёй, адной, тыя плантацыі, як называлі гэты ладны сядзібны ўчастак яе нявесткі. Гаспадарку жанчына зменшыла — адной хапае, а дачка й сыны на хлеб сабе зарабляюць там, у гарадах сваіх. Найбліжэй жыве малодшы яе, Раман, дык вось, дзякаваць богу, і дапамагае. А гаспадаркі ёй, адной, і гэтай занадта: парсючок, каза з казлом і двое казлянят. Ёсць, праўда, на падворку яшчэ Тузік і котка Рыска — як жа без іх вясковаму чалавеку. От, няправільную прыказку пусціў нехта ў свет пра тых, што не ўжываюцца адно з адным, — маўляў, жывуць як кот з сабакам. Тузік і Рыска вунь яшчэ як жывуць, дурэюць, бывае, як дзятва якая. Рыска маладзейшая, а Тузік, дык той стары. "Ды на мой век хопіць і яго, — разважала амаль васьмідзесяцігадовая гаспадыня, згадаўшы леташняе пахаванне свайго гаспадара. — Доля чалавечая гэткая..."

Раман-гараджанін вёску любіў. Лашчыла сэрца асабліва вёска восеньская. Нават гэтае капанне бульбы, якое шмат хто з яго аднагодкаў-вяскоўцаў лічыў заняткам нудным... Ведаў Раман з вопыту свайго: спіна смыліць пры копцы бульбы дзень-другі, толькі напачатку, а потым — прывыкае, і толькі адзінае патрабуецца, каб целяпацца ў барознах з ранку да вечара — толькі цярпенне. А каб разагнуць спіну, дык рэгулярна хадзіў у сад, падымаў адзін яблык, другі. А яблыкі, што ў траве паляжалі ўжо — не раўня тым, што з яблыні сарваныя. Здавалася, што толькі на яблыках і трымаўся б... Але што гэта такое: казліная сям'я ўся — Раман аж прыпыніўся — не траву скубе, а стаіць моўчкі-нерухома, як укопаная, галовы ўзняўшы? "Ці не галадоўку аб'явілі?.." — прамармытаў Раман.

Мінула гадзіна якая і — кіраваўся Раман ізноў, выпрастаўшы спіну, у сад. Разумны быў той, хто яблыкі прыдумаў. Не, не той, нехта, быў разумны, а гэта ягоны бацька гаспадаром талковым быў, бо сад гэты ён пасадзіў, — удакладніў, у такт сваёй стомленай хадзе, малады мужчына. Глянуў — казліная сямейка паранейшаму ўся стаіць, кожны "сямейнік" на тым жа месцы, што і той раз, і кожны — моўчкі, з прыўзнятай галавой. Падышоў Раман да казы, пагладзіў яе, за казловы рогі патузаў, казлянятак прылашчыў. Не зважалі на чалавека жывёліны. Не бэкнула, не мэкнула ніводная. Стаяць... статуэткамі тымі, як у парках некалі, на пастаментах. Моўчкі швэндалася між яблынь, нібы сонная, Рыска. Не абзываўся з хлеўчука і парсючок. Пачулася толькі, як разы са два коратка візгатнуў — там, за плотам, каля хлява была яго будка — Тузік.

Устрывожаны, ужо на полі, расказваў маці. "Ат, і скаціна ж хоча палайдачыць, — разважала вяскоўка, — а, можа, у іх настрою зараз няма", — усміхнулася жанчына. Не, быць не можа — прыкідваў Раман, — каб раптам ды ва ўсіх чатырох настрой той знік. "Нешта павінна здарыцца, — падрахаваў Раман і сказаў пра гэта маці. — Ці зацьменне сонца ці землятрус які, можа..." "Не выдумляй", — старая жанчына не выказала аніякага клопату наконт паводзін казлінай сям'і. Вядома ж, у вясковых да хатніх жывёлін адносіны, як кажуць цяпер, прагматычныя — мець ад яе малако, яйка, а як выгадуецца, дык мяса, сала, часам рубель які, калі на продаж. Раман, скажам, ніводнага разу за ўсё жыццё не выканаў мацярынскай просьбы адсекчы курыцы ці пеўню галаву. Бралася за гэтую работу сама маці і выконвала яе, як здавалася Раману, і бязлітасна і раўнадушна. Хоць да верашчакі той, — папракнуў тут жа сябе Раман, — раўнадушным ён не быў ніколі...

Не вытрываў на гэты раз Раман запланаванай для сябе паўзы між сваімі вандроўкамі ў сад па яблыкі. Дзіва-дзіўнае: зменаў аніякіх — стаялі ў тых жа, нямых, сваіх позах. Быць-быць землятрусу ці зацьменню! Дык і Тузік жа не абзываецца... Заснуў?

Пакіраваўся Раман да хлявоў, адчыніў брамку — і, праўда, спіць выцягнуўшыся ва ўвесь рост вартаўнік гаспадаркі каля будкі сваёй. "Тузік", — прысеў каля сабакі Раман, звычна, усёй пяцярнёй, ухапіўся за яго цёмна-рудую галаву. І тут жа рэзка адарваў руку, ускочыў. Халодная галава... ненатуральна заплюшчаныя вочкі. Ды і ўся Тузікава поўсць падалася нейкай нежывой. Усё — ясна! Аджыў сваё. І ціха адышоў... "Па старасці", так пішуць чалавеку дактары цяпер у графе "прычына смерці", — узгадалася Раману, бо ведаў, што Тузіку гадоў пад дваццаць быць павінна.

...Перагаварыўшы з маці, загарнуў Раман Тузіка ў чысты зрэбны ручнік, узяў лапату, выкапаў напрыканцы гумнішча магілку глыбінёй у калена... Успомніў, як некалі, тады яшчэ зусім малы, сын яго Андрэйка так падоўгу цешыўся з Тузікам, сябрам усё яго называў...

...Глядзеў і глядзеў Раман на казу, казла, казлянят, зазіраў у іхнія па-чалавечы сумныя вочы. Знікавеў, калі ў казы з аднаго вока выкацілася, ну проста натуральная сляза... Смуткуюць, як і мы, калі трацім блізкага свайго... Але адкуль... адкуль ведаць маглі яны, хто... хто падказаў ім, што праз гадзіну-дзве страцяць яго, насельніка свайго падворка?.. Загадка... Дзівіўся Раман. Разважаў.

...Разважалі потым, у барознах, разам з маці. Круцілася побач Рыска — мышак тых, пэўна, высочвала яна ў разорах. Паважліва скублі траву каза з казлом, падбрыквалі казляняты. Падаў голас і парсючок — блізіўся час вячэрняга кармлення.

Арт-пацеркі

Пятнаццаты раз прайшоў у Магілёве Міжнародны фестываль духоўнай музыкі "Магутны Божа". Зважаючы на тое, што сёлета ён юбілейны, арганізатары вырашылі не надаваць традыцыйнай пільнай увагі конкурсам харавых калектываў і камерных салістаў, а наладзіць узнёслае свята. Сярод разнастайных праграм, што праходзілі на працягу дзесяці ліпеньскіх дзён у залах і пад адкрытым небам, а таксама, як заўжды, у касцёле святога Станіслава, былі канцэрты харавой, вакальнай, арганнай, камернай інструментальнай, сімфанічнай і нават — упершыню! — звонавай музыкі. Так, на Архірейскім валу адбылося сапраўднае свята звона. Удзельнікамі і гасцямі фестывальных імпрэз былі, апроч нашых суайчыннікаў, прадстаўнікі Германіі, Латвіі, Польшчы, Расіі, спеўныя калектывы і салісты з розных краін, ужо знаёмыя заўсёднікам фэсту "Магутны Божа", у тым ліку і ўладальнікі яго конкурснага Гран-пры ў ранейшыя гады. Міжнародны форум хрысціянскай духоўнай музыкі "Магутны Божа", пра які ў свой час вельмі падрабязна распавядаў "ЛіМ", упершыню адбыўся ў Магілёве летам 1993 года. З таго часу ён годна і нязменна выконвае сваю высокую гуманістычную і экуменічную місію: спрыяе ўзаемаразуменню, сяброўству, яднанню людзей рознай веры і тых, чыя свядомасць не вызначаецца рэлігійнасцю, — дзеля агульначалавечых каштоўнасцяў, міру і гармоніі на зямлі.

Новае захапляльнае відовішча з яскравымі акцёрскімі работамі рыхтуе Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы: у ліпені тут пачаліся рэпетыцыі спектакля "Слуга двух гаспадароў" — паводле класіка сусветнай камедыі К. Гальдоні. У творчай працы сустрэліся прадстаўнікі розных тэатральных школ: рэжысёр-пастаноўшчык са Швецыі А. Нардштром, расійскі харэограф І. Качаеў, знаны беларускі кампазітар С. Картэс і наша маладая мастачка В. Праўдзіна. Амаль тры дзесяткі артыстаў розных творчых пакаленняў атрымалі ролі ў новай пастаноўцы: А. Памазан, М. Кірычэнка, В. Манаеў, Р. Падаляка, Г. Хітрык, Ю. Міхневіч, І. Пятроў, Ю. Шпілеўская ды інш. Пра што мяркуюць аўтары пастаноўкі, ствараючы жыццесцвярджальнае святочна-камедыйнае відовішча? Паводле слоў рэжысёра, мэта спектакля — паказаць, што для чалавека, які імкнецца дасягнуць лепшага ў жыцці, няма перашкод, што яго магчымасці бязмежныя. Стваральнікі камедыі "Слуга двух гаспадароў" на купалаўскай сцэне спадзяюцца, што іх версія неўміручага твора прагучыць як "гімн маленькаму чалавеку, які прыкладае намаганні і працу і можа, калі захоча, "перакуліць свет". Паказаць прэм'еру плануецца напярэдадні новага, 2008-га, года.

З перамогай віншуюць народны ансамбль песні "Мілавіца" Мышкавіцкага сельскага дома культуры Кіраўскага раёна, што на Магілёўшчыне. Творчы калектыў атрымаў адразу дзве галоўныя ўзнагароды на XXVII Міжнародным фестывалі народных капэл, які прайшоў у Торуні (Польшча). "Мілавіцы", якая заваявала першае месца ў намінацыі "Прафесійнае харавое выкананне" і прыз глядацкіх сімпатый, уручылі дыпломы і грашовыя прэміі. Гэтым ансамблем песні, які існуе ў Мышкавічах 15 гадоў, нязменна кіруе Уладзімір Барэйша.

С. ВЕТКА

Сэрца сусветнай сцэнаграфіі

Міжнародная выстаўка сцэнаграфіі і тэатральнай архітэктуры "Пражская Квадрыенале" была арганізаваная ў 1967 годзе. У 2007-м яна прайшла адзінаццаты раз. Колькасць краін-удзельніц шораз павялічваецца, сёлета іх было 55. Сцэнографы з Беларусі і студэнты спецыялізацыі "Тэатральна-дэкарацыйны жывапіс" Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў удзельнічалі ў "Пражскай Квадрыенале" трэці раз.

Гэта выстава-конкурс, дзе працуе міжнароднае журы, ёсць галоўны прыз — "Залатая Трыга" — за лепшую нацыянальную экспазіцыю. Свае работы прадстаўляюць таксама студэнты розных школ. Удзел у такой маштабнай і сусветна вядомай выстаўцы лічыцца вельмі прэстыжнай і пачэснай справай, бо прасачыць за рухам сучаснага тэатра планеты праз сцэнаграфію нельга, бадай, больш нідзе.

Некаторымі краінамі за аснову быў абраны гульнёвы пачатак у мастацтве. Творцы наўпрост "паддражнівалі" гледача, паставіўшы сабе за мэту не ўразіць прафесіяналізмам і новымі ідэямі, а пацешыць публіку.

Зразумела, што многія рабілі стаўку на візуальны эфект ад грандыёзных павільённых збудаванняў, але часцей яны не былі насычаныя зместава, а толькі дэманстравалі тэхнічныя дасягненні мастакоў-дызайнераў ды фінансавыя магчымасці краіны.

Свежую плынь унесла экспазіцыя літоўцаў. Іх павільён уяўляў сабой своеасаблівую сцэну-каробку з парталам, каласнікамі, планшэтам, паміж кулісамі якой і змясціліся макеты. Галоўнай тэндэнцыяй тут зрабілася здатнасць сцэнічнай прасторы да ўнутранага развіцця, чаго не хапала ў экспазіцыях іншых удзельнікаў.

"Залатую Трыгу" заслужана атрымала расійская нацыянальная экспазіцыя пад назвай "Наш Чэхаў. Дваццаць гадоў пасля". Мастакам удалося сумясціць і асаблівую атмасферу павільёна, і элементы гульні, і глыбокія, напоўненыя філасофскім роздумам прасторавыя вырашэнні спектакляў, па-майстэрску ўвасобленыя у макетах.

На фоне такіх выбітных прац, як у Літвы і Расіі, творы беларускіх мастакоў выглядалі больш блякла. Але сярод вялікіх збудаванняў, зробленых замежнымі творцамі са шкла і пластыку, наш павільён здаваўся выспай з чалавечых пачуццяў. Асабліва тое адчувалася ля макета А. Сарокінай да спектакля "К'ёджаўскія перабрэхі" (К. Гальдоні, рэжысёр У. Шчэрбань). Гэты макет стаўся стрыжнем, вакол якога і арганізавалася экспазіцыя нашага павільёна і які надаў нейкай паветранасці і вытанчанасці ўсім астатнім работам. Вылучылася сцэнаграфія В. Цімафеева: маляўнічыя фотаздымкі са спектакляў купалаўскага тэатра "Дзікае паляванне караля Стаха" (У. Караткевіч, рэжысёр У. Савіцкі), "Балада пра каханне" (В. Быкаў, рэжысёр У. Савіцкі), што перадавалі непаўторную атмасферу містычнасці ігры светлавых плям. Зацікавіла яркая, незвычайная па форме ў той жа час змястоўная і функцыянальная канструкцыя В. Рачкоўскага да лялечнага спектакля "Пацукалоў" (М. Цвятаева, рэжысёр А. Жугжда).

Цікава, што напрамкі думак маладых сцэнографаў і майстроў шмат у чым супадалі. Многія ўдзельнікі студэнцкай выставы таксама вырашылі ўразіць вонкавай абалонкай свайго павільёна. Некаторыя пажадалі сыграць на спрадвечным жаданні чалавека зазірнуць за зачыненыя дзверы. Такую магчымасць прапаноўвалі мастакі Карэі, Турцыі, Германіі, Польшчы, Чылі. Але расчараванне ад убачанага прыходзіла непазбежна, бо тыя галаграмы, малюнкі і слайды, якія знаходзіліся ўнутры, асаблівымі мастацкімі вартасцямі чамусьці не вылучаліся.

Асаблівай унутранай лёгкасці ва ўвасабленні ўласных задум удалося дасягнуць маладым беларускім сцэнографам, якія навучаліся пад мастацкім кіраўніцтвам народнага мастака Беларусі Б. Герлавана. Іх работы вызначаліся глыбінёй задумы і вобразнасцю вырашэння. Было відавочна, што ў аснову сцэнаграфічных ідэй усё часцей закладваюцца дзейснасць і канфлікт. Тое прыводзіць да стварэння не толькі атмасферы і вобразна-знакавай партытуры, але і ўнутранай дынамікі твораў, якая з максімальнай напружанасцю ўздзейнічае на гледача. У гэтым рэчышчы асабліва вылучыліся наступныя работы : "Раскіданае гняздо" І. Анісенкі (паводле Янкі Купалы), "Прымакі" В. Праўдзінай (паводле Янкі Купалы), "Той самы Мюнхаўзен" В. Мацкевіч (паводле Р. Горына)...

Кожны, хто заходзіў у беларускі студэнцкі павільён, абавязкова заглядваў ва ўмоўны калодзеж, выстаўлены перад экспазіцыяй. Унутры яго —чыстая роўнядзь вады, дзе адлюстроўваецца твой уласны твар з задуменнай усмешкай. І такі ачышчаны ад мітуслівых думак, настроены на філасофскі лад крочыш далей, разглядаючы макеты і эскізы, прасякнутыя глыбокім роздумам пра месца чалавечай істоты ў матэрыяльна-рэчавым свеце.

Каб не разгубіць гэткі аптымістычна-лірычны настрой, варта было пасля зайсці ў секцыю студэнтаў Маскоўскай школы тэатральнага мастацтва, дзе побач з даволі традыцыйнымі манументальна-акадэмічнымі вырашэннямі прасторы суседнічалі арыгінальныя па задуме і ўвасабленні макеты і эскізы.

Вонкавая частка японскага павільёна нагадвала вітрыну магазіна цацак, што забаўляла і нараджала асацыяцыю з вялікай міжнароднай гульнёй дарослых дзяцей на "Пражскай Квадрыенале".

Крэатыўны дух, які панаваў у студэнцкай і часам — у нацыянальнай секцыях, настройваў на аптымістычнае ўспрыманне мастацтва ды і ўвогуле чалавечага жыцця. Ад соцень твораў зыходзіў наймацнейшы энергетычны імпульс, які падштурхоўваў да новых мастацкіх задум. І здзяйсненняў.

Ксенія КНЯЗЕВА

На здымках: у выставачных павільёнах "Пражскай Квадрыенале-2007".

Гульня ў жыццё

Усе людзі — лялькі ў руках фартуны. Гэтая капрызлівая жанчына не церпіць слабых і не даруе памылак. Але як заслужыць прыхільнасць уладаркі нашых лёсаў?

Спектакль "Позняе каханне" паводле А. Астроўскага ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа Віталя Баркоўскага (прэм'ера адбылася ў красавіку) пачынаецца менавіта з гульні ў лялькі. Пастаноўшчык лялечных нумароў — Вольга Корзун. І вось перад гледачом усплываюць малюнкі мінулага жыцця герояў п'есы, іх мары і спадзяванні. Твор класіка рускай літаратуры распавядае не толькі пра тое, даўняе, што адбывалася з нашымі продкамі. Найперш ён закранае праблемы вечныя: каханне, здрада, падман, любоў да бацькоў...

Адзін з галоўных вобразаў у спектаклі ўвасобіў карыфей коласаўскай сцэны народны артыст СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Фёдар Шмакаў. Сёлета мэтр адзначыў свой 90-гадовы юбілей. На вясновым бенефісе ён выконваў ролю Гразнова ва ўласнай пастаноўцы "Праўда — добра, а шчасце лепш" А. Астроўскага. П'есу "Позняе каханне" да сцэнічнага ўвасаблення таксама прапанаваў Фёдар Іванавіч. Чым выклікана такая любоў мэтра да твораў Астроўскага? Магчыма, нейкія жыццёвыя мудрасці, глыбокія ісціны вабяць карыфея коласаўскай сцэны да п'ес класіка. У віцебскага гледача ёсць цудоўны шанц асабіста ў гэтым упэўніцца. Коласаўцы запрашаюць аматараў тэатра разам паразважаць над спрадвечнымі жыццёвымі праблемамі і атрымаць асалоду ад сустрэчы з любімымі акцёрамі. А імёны і сапраўды годныя: Фёдар Шмакаў, Уладзімір Савіцкі — Маргарытаў, Галіна Букаціна, Ірына Цішкевіч — Лябёдкіна, Ульяна Ацясава, Анжаліка Баркоўская — Людміла, Раіса Грыбовіч, Ніна Левашова — Шаблова, Арцём Бародзіч і Андрэй Качан — Мікалай, у ролі самага маладога героя Дармідонта — дэбютант Юрась Гапееў і Андрэй Касцючэнка. Адначасова на сцэне моладзь і карыфеі — удалы сінтэз!

Гульня фартуны, гульня жыцця на сцэне — для сапраўдных аматараў мастацтва.

Ганна ДАШКЕВІЧ,
памочнік мастацкага кіраўніка тэатра імя Якуба Коласа

Тэатр і толькі

(Працяг. Пачатак на стар. 1)

Тэатр, Камсамольскае возера і ... Маша

Так няпроста, з прыгодамі, адольваў Арнольд Памазан дарогу да творчасці... І вось ён — славуты купалавец.

— Арнольд Кандратавіч, якая ваша першая роля ў Купалаўскім?

— Я іграў немца ў "Канстанціне Заслонаве". Затым Каўеля — "Мешчанін у дваранстве": больш сур'ёзная роля, мая першая візітоўка, своеасаблівы бенефіс... А Адольфа Быкоўскага ў "Паўлінцы" выконваю з 1968-га...О! Я тады трапіў у сапраўдны кветнік майстроў сцэны, працаваў разам са Стомам, Макаравай, Дзядзюшкам, Бірылам.

— А цяпер?

— Цяпер у мяне шмат роляў, я ніколі не адмаўляюся ад працы. Нават калі мне давалі маленькія ролі, я заўсёды працаваў над імі з натхненнем і адказнасцю. А цяпер у мяне і роля Губернатара ("Чычыкаў"), і Майкла Гамона ("Смак яблыка"), і Дзеда Данілы ("Сымон-музыка")... Праца ёсць, і гэта галоўнае для акцёра — быць неабходным тэатру, гледачу...Увогуле, заўсёды павінна быць нешта, над чым можна падумаць. А то, бывае, спектакль адыграліі — і ўсё?!! Патрэбна, каб у галаве пастаянна нешта круцілася, свярбела, прымушала разважаць і ўдасканальвацца!..

— Вы апошнім часам іграеце Пранцыся Пустарэвіча ў "Паўлінцы". Не сумуеце па сваім пане Адольфе?

— Пэўна не. Трэба даваць дарогу маладзейшым! Гэтую ролю ў мяне не адбіралі. Яна заўсёды за мною і са мною... Але сам разумею: тут я адыграў сваё.

— А што для вас тэатр нагул?

— Многія кажуць: "тэатр — маё жыццё"... Дык і насамрэч так! Забяры ты ў мяне зараз тэатр, што ж я буду рабіць? На паравоз не возьмуць (смяецца. — **І. Г.**)! Можа, спартсменам быў бы...

— Няўжо і спортам займаліся?

— Так. Калі яшчэ ў школе вучыўся, прыйшоў настаўнік фізкультуры, паказаў нам "сонца" на турніку і сказаў: "Займайцеся спортам — гэта вам у жыцці вельмі дапаможа!" На мяне яго словы моцна падзейнічалі. Дык я і цяпер займаюся! Стараюся падтрымліваць фізічную форму. "Маржую" нават рэгулярна! На веласіпедзе езджу! Амаль кожны дзень, як толькі выпадае вольная хвілінка, — адразу на Камсамольскае возера: калі не трэніруюся, дык хоць пешшу на свежым паветры прагуляюся. Настрой уздымае, і адчуваеш сябе значна лепей. Увесь негатыў, назапашаны за дзень, кудысьці знікае! Яднанне з прыродай — вялікая сіла! Быў у мяне такі кранальны выпадак... У парку, ля возера, жыве шмат бяздомных жывёл. Часам прынясеш што-небудзь з дому, падкорміш сабачку якога ці кацянятка. Там была ў мяне сяброўка — котка Маша. З'явіліся ў яе кацяняты, дзікія, не бачыў іх ніколі. Кажу ёй: "Маша, ну пакажы ж ты мне сваіх дзетак!". А яна паглядзела на мяне, мармытнула сваё "мрр-мяў" — і аднекуль з-за вугла амаль што паўзком з'явілася маленечкае кацяня, аж да маіх ног падпаўзло і сцішылася. У мяне мурашкі па спіне, а я стаў мёртва, не рухаюся. Толькі руку да яго працягнуў — шусь і няма! А Маша ў вочы глядзіць: "Ну, што: паказала?!..". У мяне нават слёзы навярнуліся... Даверыла...

Пра пачуцці

— У якія хвіліны вы адчуваеце сябе шчаслівым?

— Самыя хвалюючыя хвіліны перажыў, калі атрымліваў "Паўліначку!.." (прыз "Крыштальная Паўлінка-2007". — **І.Г.**). Я чакаў яе вельмі даўно. І шчаслівы цяпер. Перапоўнены пачуццямі. Найвялікшая асалода трымаць у руках тое, што для цябе сапраўды дорага, і ведаць, што заслужыў гэта сваёй працай. Шчасце ведаць, што зробленае табою ацэньваецца людзьмі. А шчаслівым чалавек не можа быць вечна: гэта — момант! Для мяне асалода: іграеш нейкі эпізод, імгненне — апладысменты! Адчуваеш, што глядач разумее цябе, і ты з ім, але ты і кіруеш ім. Гэта вельмі дорага каштуе...

Быў, памятаю, у нас выязны спектакль у нейкую вёсачку. "Паўлінку" паказвалі. Сцэна невысокая, зала маленечкая, блізенька. Такі момант: Паўлінка спявае, Адольф Быкоўскі засынае (а ў мяне паводле ролі боты — латка на латцы, драныя...). Нейкі хлопчык ціхенька так, але настойліва з залы: "Пан Адольф! Пан Адольф! У вас боты парваліся!" Пачулі ўсе — рогат стаяў!!! Так перажываў за мяне дзіцёнак, за тое, што з абуткам мне не пашанцавала!.. А было і такое. Таксама на вёсцы, таксама з "Паўлінкай". Жанчына старая падыходзіць пасля спектакля і пытаецца: "Вы "жаніха" іралі?" Быкоўскага, значыць. "Так, я", — кажу. А яна мне: "Ой! Дзякуй вам вялікі! Ой, як хораша! Вось паглядзела я "Паўлінку" і можна памірацьі". Як тут не задумацца: ці ж гэта не шчасце, адчуваць такую шчырую ўдзячнасць, цеплыню!..

— Якіх жыццёвых прынцыпаў вы прытрымліваецеся?

— Трэба быць праўдзівым. І ў тэатры, і ў жыцці. Я сумленна і адказна выконваю сваю працу. Я такі, які ёсць. Нічога з сябе не строю, не "выстаўляюся". Стараюся добра адносіцца да людзей. Трэба жыць з іншымі так, каб яны адчувалі, што яны для цябе значаць.

— Без чаго ў жыцці вы не можаце абысціся?

— (Думае. — **І. Г.**) Без тэатра...

Ірына ГРЫГАРАН

Фота К. Дробава

Дантэ — гэта вечнасць...

Колькі стагоддзяў прамінула, колькі змянілася эпох, а творчасць Дантэ Аліґ'еры, якая ў свой час істотна паўплывала на свядомасць і літаратурныя пастулаты яго еўрапейскіх сучаснікаў, не страчвае сваёй актуальнасці. Вось што значыць геній! "Боская камедыя" вялікага італьянца з нястрачанай загадкавай сілай вабіць кампазітараў і дзеячаў тэатра, мастакоў і, вядома ж, майстроў прыгожага пісьменства. Кожны, па-свойму спрычыніўшыся да яе, адкрывае для сябе свет вялікіх перажыванняў, якіх ужо ніколі не пазбыцца. Гэта сапраўдны душэўны вопыт і досвед, што сілкуе ўласную мудрасць і праз уласную творчасць перадаецца далей...

Паэт Уладзімір Скарынкін, завяршыўшы некалькі гадоў таму першы ў свеце пераклад неўміручай кнігі Дантэ на беларускую мову, здзейсніў не толькі асабісты творчы подзвіг, але і сапраўды гістарычны ўчынак у адносінах да нашай літаратуры, да беларускай культуры. Пра знамянальнасць з'яўлення яго перакладу "Боскай камедыі" для нацыянальнага літаратурнага працэсу, пра важнасць гэтага факта для беларуска-італьянскіх стасункаў неаднойчы гаварылася на старонках "ЛіМа". І да сказанага раней трэба дадаць згадку пра падзею ўжо гэтага лета, якая адбылася ў Мінску.

Музей сучаснага выяўленчага мастацтва (пры падтрымцы дыпламатычных службаў, вядома) наладзіў выстаўку выдатнага італьянскага графіка Марка Карны "Увасобленае слова". Экспазіцыя прадставіла ўражлівую падборку малюнкаў да кнігі "Пекла" з Дантавай паэмы, якія Марка Карна рабіў на працягу 1953 — 1993 гадоў. Адмыслова да вернісажа па ініцыятыве італьянскага боку, пры садзейнічанні прафесараў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Васіля Шаранговіча і Міхася Баразны і з дапамогай спонсараў быў выдадзены шыкоўны альбом работ Марка Карны. Сюды ўвайшло больш як 100 графічных кампазіцый — сюжэтаў, вобразаў, думак з неўміручай кнігі, памастацку пераасэнсаваных нашым таленавітым сучаснікам. Яго работы, выкананыя пераважна пяром і тушшу, не ўспрымаюцца як ілюстрацыі, строга падпарадкаваныя зместу вершаваных радкоў: адчуваецца неабыякавая пазіцыя мастака-філосафа, які вачамі чалавека новай эпохі прасочвае метамарфозы Дантавай фантазіі, самастойна разважае над спрадвечнымі праблемамі быцця, над містычнымі повязямі лёсу зямнога і замагільнага наканавання. Дасканала высокая тэхніка родніць творчасць Марка Карны з традыцыямі майстроў Адраджэння.

Сапраўдная адметнасць рарытэтнага выдання (наклад 600 экземпляраў, без права на продаж) — тэкст, пададзены не толькі па-італьянску, па-англійску, але і па-беларуску. І які тэкст! Кожны з малюнкаў, зробленых паводле "Пекла", суправаджае асацыятыўная цытата, узятая з арыгінала "Боскай камедыі", з англійскага перакладу і з беларускай версіі, якая ёсць у нас дзякуючы Уладзіміру Скарынкіну. Прыемна, што наша мова прадстаўленая на роўных з вялікімі еўрапейскімі мовамі ў такім салідным кантэксце. Дарэчы, перакладчык атрымаў "Увасобленае слова" ў падарунак ад арганізатараў выстаўкі.

С. Б.

Фота К. Дробава

Любаму гораду

Жэст гэтага мудраца-дойліда ў нечым нагадвае магічны рух дырыжорскай рукі. Наблізіўшыся да яго манументальнай постаці, што панаванчуруе над ландшафтам казачнага горада, адразу ўспамінаеш крылатае параўнанне і міжволі пагаджаешся: так, архітэктура — гэта застыглая музыка. А скульптура? Здаецца, і яна вартая такога ж высокага параўнання.

Сапраўды, кампазіцыя "Дойлід", новая работа скульптара Уладзіміра Жбанава, нібыта поўніцца дзівоснай маўклівай музыкай. Глыбакадумны суровы барадач са скруткам чарцяжоў пад пахай (партытура несканчонай "мураванай сімфоніі" амаль дзевяці з паловай мінскіх стагоддзяў?) аглядае створаны ім свет. Прычым, што надзвычай прыемна і каштоўна, стварэнне гэтага фантастычнага будаўніка не выглядае абстрактнай урбаністычнай панарамай, а падаецца як абагульненне свайго, роднага, пазнавальнага. У бронзавым сімвале архітэктуры Мінска розных эпох знойдзеш і абрысы брамы старажытнага драўлянага замка XII стагоддзя, і выяву касцёла бернардынак, узведзенага тут амаль 400 гадоў таму, і пластычнае адлюстраванне гмаха Вялікага тэатра оперы і балета, што стаіць на Траецкай гары з перадваенных 1930-х...

"Дойлід" з'явіўся ў Мінску на плошчы Незалежнасці як увасабленне ідэі, прапанаванай генеральным дырэктарам сталічнай кампаніі "Эльвіра" Валерыем Поткіным. (Гэтая фірма рэстаўрыравала будынак, у якім сёння месціцца камітэт па архітэктуры і горадабудаўніцтве Мінскага гарвыканкама, — адметны дамок паблізу Чырвонага касцёла). Арыгінальны помнік, гожа ўлучаны ў ансамбль вялікай плошчы, быў урачыста адкрыты незадоўга да святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. І нібы нарадзілася яшчэ адна, такая цудоўная — нягучная, але вельмі выразная, — песня пра Мінск ці гімн у гонар нашай сталіцы. Зробленая на сродкі кампаніі "Эльвіра", гэтая скульптурная работа Уладзіміра Жбанава, як і ўстаноўленая адначасова з ёю бронзавая кампазіцыя "Экіпаж" ля Мінскай ратушы, з'явілася непаўторным падарункам да 940-годдзя роднага горада.

С. БЕРАСЦЕНЬ

Фота К. Дробава

Агульнарэспубліканскі конкурс сачыненняў (эсэ) сярод школьнікаў, студэнтаў і моладзі краіны


Фота К.Дробава

Палітра Айчыны

Аднойчы мне падумалася: а што калі б кожнаму жыхару планеты Зямля задаць пытанне «З чым вы параўналі б колеры вясёлкі?». Цікавае атрымалася б даследаванне.

Існуе безліч навуковых прац пра ўспрыманне чалавекам колераў. А для мяне сем нябесных адценняў — гэта палітра Радзімы. Менавіта сваю родную зямлю я бачу ў святле таемнай прыгажуні.

Раскажу пра кожны колер.

Першая знізу сцяжынка вясёлкі чырвоная. Менавіта гэткай фарбай вылучаюцца правілы ў падручніках, з чырвонага радка пачынаецца новы абзац. У даўніну нашыя продкі ўпрыгожвалі рукапісы вялікай чырвонай літарай. А яшчэ гэта колер жыцця, крыві і вайны. Гэтай фарбай пазначана ўся гісторыя Айчыны — ад старадаўняга Полацка да фашысцкай акупацыі.

Наступны колер — аранжавы. Мне ён нагадвае пра бесклапотнасць і весялосць. «Аранжавы настрой» — напамін пра нешта экзатычнае, накшталт Нацыянальнай бібліятэкі, пра добрасуседства з іншымі краінамі, бо толькі пры сяброўстве з усімі на паліцах крамаў увесь год мы маем апельсіны, мандарыны...

Жоўты колер сонца і цяпла ўяўляецца мне ўтульнасцю, дабрабытам, камфортам. А яшчэ гэта адценне дзяцінства, нездарма немаўлят жартоўна клічуць жаўтароцікамі. З гэткім апярэннем шпацыруюць па жыцці смешныя і безабаронныя кураняты, качаняты. Таму гэта колер дабрыні, уласцівай усім беларусам.

Безліч зялёных адценняў мае прырода Беларусі. Гэта колер раслін Белавежы, газонных гарадскіх клумбаў, смарагдавых паплавоў Палесся і ўсяго жывога на Зямлі, колер адноўленага жыцця. У народзе кажуць, што людзі з зялёнымі вачыма валодаюць здольнасцю да чараўніцтва. А хіба не зачароўваем мы суседзяў? Зялёны прысутнічае на сцягу Беларусі, як сімвал нашай неспасцігальнасці і нязломнасці.

Блакітны колер вачэй беларусаў стаў паэтычным штампам. Ззяюць блакітам Нарач, Свіцязь і Браслаўскія азёры. Крышталь ны нябесны блакіт — сімвал міру і добрага стану навакольля. А яшчэ гэта напамін пра холад у зімнія дні.

Сінія Нёман, Дзвіна і Дняпро, сінія вочы знічак, валошкі на залатых жытніх палях, названыя М. Багдановічам «цвяткамі радзімы», апярэнне Птушкі Шчасця, якая абавязкова да нас даляціць. Для мяне гэта колер нашай мары.

Амаль няўлоўны фіялетавы водар бэзу разносіцца цёплым ветрам па навакольлі. Званочкі, фіялкі, астры — гэта ўсё наша. Але гэтая фарба мае і адмоўнае значэнне. Цёмна-фіялетавыя хмары, па словах відавочцаў, плылі над мінскай станцыяй метро «Няміга» ў дзень трагедыі. Гэты колер нагадвае: акрамя мар існуе і горкая рэчаіснасць, якой не абдзелена і сучаснасць. Але моладзі не «фіялетавая» будучыня.

Вось такая яна, «вясёлкавая» Беларусь — розная, цікавая, непаўторная. Прымружу вейкі — і зноў бачу вясёлку, але не толькі над Айчынай. Яна, быццам рознакаляровы абруч, абдымае ўсю нашу планету і нясе свету вестку пра пакуль яшчэ не ўсім вядомую краіну ў цэнтры Еўропы.

Вольга ЛЯСОТА, 17 гадоў
вучаніца Вярэйскай СШ
Ваўкавыскага раёна
Гродзенскай вобласці

Адкуль цыбуля ў Дубне

На правым беразе Нёмана размясцілася вялікая і прыгожая вёска Дубна. Народ тут збіраўся заўжды працавіты. Адна бяда: не мелася побач з селішчам шырокіх лугоў з сакавітай травой. Яны былі на левым беразе. Каб нарыхтаваць сена, людзі пераплывалі раку на чаўнах і везлі сабранае назад у вёску. Назіральнікі захапляліся: счэпленыя чаўны, да нябёс нагружаныя сенам, нагадвалі караван вярблюдаў. Нёман для дубненцаў быў і дарогай, і лазняй, і пральняй, і месцам адпачынку, даваў і мажлівасць загартоўкі цела і волі. Нават каровы ў вёсцы два разы на дзень пераплывалі раку, бо пасвіліся на левабярэжжы. Іх не прыганялі дамоў у абед — гэта адзіны выпадак у акрузе.

Аднойчы ў спякотны летні дзень людзі сушылі сена. Пах падвялай травы казытаў нос, цвыркалі і скакалі вышэй галавы конікі, мушкі і матылі бесперапынна мітусіліся перад вачыма. Адчуваўся спакой, задавальненне. Чуліся жарты, песні, смех...

Раптам на небе з'явіліся чорныя хмары. Людзі зразумелі, што будзе моцная навальніца і паспяшаліся дадому, праўда, не ўсе. Сямёра цыбатых мужыкоў схаваліся ў капу сена. Дождж ліў як з вядра, грукатаў гром, бліскалі маланкі, але стог быў надзейным прыстанішчам, дзе і цёпла, і не мокра.

Усё адбылося імгненна. Тыя людзі, якія адплылі на чаўнах дадому, убачылі маланку. Ад яе стог сена запалаў яркім агнём. Мужчыны загінулі.

У апошні шлях цыбатых касцоў праводзіла ўся вёска. Слёзы родных, суседзяў палівалі дубненскую зямлю. Яны напіталі глебу і зрабілі яе салёнай. З таго часу, якое б насенне ні трапляла ў мясцовую зямлю, з яго вырасталі цыбатыя расліны. Людзі чакалі, што будзе далей. Напрыканцы лета палягліі пасохлі цыбатыя чубы гэтых раслін, а ў зямлі знайшлі круглыя караняплоды. Пакаштавалі іх едакі, адчулі горыч з салодкім прысмакам. Корань спадабаўся, яго елі сырым, дадавалі ў розныя стравы. Толькі назвы цыбатаму, не было. Цыбатаму? Прыдумалі: цыбукі... цыбулькі... цыбуля!

Дубненцы вырашылі падзяліцца плодам з іншымі людзьмі, бо цыбуля з году ў год добры ўраджай давала.

І пацягнуліся па ўсім свеце дубненцы з цыбуляй. Адна гандлярка магла перавезці за сезон колькі тон гэтай гародніны. Еў яе і Брэст, і Мінск, і Гродна, і Івацэвічы. Цыбульнымі вянкамі гараджане ўпрыгожвалі свае кухні.

А жанчын гэтай вёскі пачалі называць бабулькамі-цыбулькамі.

Дар'я КАНДРАТОВІЧ, 13 гадоў
вёска Дубна
Мастоўскага раёна
Гродзенскай вобласці

Куточак любы, дарагі...

У кожнай птушкі ёсць гняздо, дзе яна гадуецца.

У кожнага мятліка ёсць кветачка, на якой ён распраўляе ўпершыню свае крыльцы. У кожнага яблыка ёсць свая галінка, на якой з зялёнай малюсенькай завязі вырастае сакавіты плод. А ў кожнага чалавека ёсць куточак, дзе ён прыйшоў у гэты свет, дзе падаў свой голас, дзе гадаваўся. Той куточак самы блізкі і любы, самы светлы і казачны, самы прыгожы і ўтульны. Завецца ён — Айчына. І як бы далёка ні адыходзіў ад таго месца чалавек, якой бы маленькай кропачкай тое месца ні было на геаграфічнай карце, у душы чалавека для яго заўсёды ёсць месца.

Услухайцеся ў гэтае слова: Ай-чы-на! Яно — пяшчотнае і ўзнёслае адначасова; яно — простае і мудрагелістае ў адзін і той жа момант, яно ціхае і гучнае, як ні мяняй інтанацыю. Я вымаўляю "Айчына!", а перад вачыма паўстае кожны раз што-небудзь знаёмае даўным-даўно, але заўсёды новае...

Айчына... І вочы бачаць наша беларускае неба.

Яно — агромністае, бяздоннае, глыбокае, высокае, зорнае, неабдымнае, шырокае і цёплае. Дзе яшчэ можна пабачыць такое рознапланавае неба?

Яно то аксамітнае, то барвовае, то бэзавае. Летам — васільковае, жамчужна-малочнае і вясёлкавае. Увосень — залаціста-чырвонае, часам касмыкаватае, а то і каламутнае. Зімою — зіхатлівае, матава-белае, а ў смужныя дні попельнае. Увесну — зеленавата-сіняе, празрыстае і нават ясна-залатое.

Вечнае, звонкае, лагоднае, прыветлівае, утульнае неба маёй Айчыны! Нічога, што яно высока-высока. Не так важна, што яно далёка-далёка. Галоўнае — яно ў мяне ёсць, неба Бацькаўшчыны, неба майго дзяцінства, неба, якое хочацца ўзвышаць словамі. А яшчэ — абараняць, калі ў тым будзе неабходнасць.

Айчына... І вочы бачаць нашы лясы — паблізу роднага Брэста, недалёка ад бабулінай вёскі, па-суседстве з дарогай ці далёка-далёка на ўзгорку. Якія ж яны прыгожыя! Не хопіць эпітэтаў, каб даць беларускаму лесу ўсе вызначэнні: агністы, вялікі, дзівосны, загадкавы... Кожны куст, кожнае дрэва, кожная травінка ў лесе маёй Айчыны прывеціць, усцешыць, супакоіць.

Айчына... І вочы бачаць малюсеньскую рэчку на выгане за бабулінай вёскай, а таксама рэчку куды большую, што працякае праз Брэст. Іх мноства — гэтых блакітных сцяжынак і дарог на маёй Беларусі. Абмялелыя і бурныя, выгінастыя і вяртлявыя, крышталь на-светлыя і каламутныя, сцюдзёныя і цёплыя — усе цешаць вока. Іх успрымаеш па-рознаму, бо яны — белакрылыя, велічныя, задумлівыя, няўрымслівыя, сціплыя, шалёныя... І толькі адно нязменна — гэта рэкі маёй Радзімы.

Айчына... І вочы бачаць палеткі. Ах, якія на Беларусі палі! Быццам сінія акіяны — льняныя; быццам залатыя дываны — пшанічныя, ячменныя, жытнёвыя, быццам рознакаляровыя карціны — люпінавыя, канюшынныя.

Бацькоўскае, бяскрайняе, духмянае, любімае — вось яно, поле таго краю, дзе жывуць самыя шчырыя, цярплівыя, працавітыя, сардэчныя і адкрытыя людзі — беларусы.

Айчына — гэта яны ўсе: тата, мама, брацік, бабулі, дзядулі, сваякі, аднакласнікі і пакуль яшчэ незнаёмыя мне добрыя людзі. Я абавязкова сустрэнуся з імі. У далёкіх вандроўках, у самых экзатычных месцах яны будуць землякамі, якіх яднае заўсёды Айчына — мілы, спрадвечны, мужны, бласлаўлёны Богам край. Я гляджу на яго вачыма, а бачу сэрцам, адчуваю душою.

Лідзія ТАБОЛІЧ,
вучаніца СШ № 15
г. Брэста

Страчаная Радзіма

Я сяджу на беразе мора, якога, мабыць, ніколі не бачыў ты. Я слухаю шэпт яго хваляў. Я пішу вершы. На чужой мове. Прадаю іх чужым людзям. Яны чытаюць іх, а потым... Мае вершы забываюць. Як і мяне. Але я пішу, бо гэта мой хлеб. Я атрымліваю нядрэнныя грошы за іх. Але сёння я наўрад ці што-небудзь атрымаю, бо мне ўспомніўся ты... І што табе трэба? Ты, знакаміты і велічны чараўнік купальскай ночы, прыйшоў да мяне. Ты прыйшоў да здрадніцы. Так, я добра разумею, хто я. Я здрадзіла сваёй краіне, свайму слову, сваім вершам. Я ўсё пра-да-ла... Я ведаю. Але што табе трэба ад мяне? Я не разумею...

Немагчыма прагнаць цябе з памяці. Твае вершы, вершы з майго мінулага, усплываюць у ёй. Я была маленькай, калі чула іх. У школе мы вучылі іх на памяць. Уся краіна вучыла твае вершы. І нам падабалася. Падабалася, што мы — маленькія БЕЛАРУСЫ. Потым мы выраслі. І ўсе, як адзін, слухалі N.R.M. і яшчэ штосьці. Але твае вершы не выходзілі з галавы. І адчуванне любові да роднага краю таксама... А што здарылася потым, я не памятаю. Але тваё слова змоўкла. І я стала здрадніцай...

...Але зразумей: я не магу іначай. Я таксама пісьменніца. Хто будзе чытаць мае вершы Там? Бабулі? Я хачу, хачу іншага жыцця. Хачу славы і грошай. Мне патрэбны яны. А што ты думаў? Ты быў знакаміты пры жыцці, цябе любілі... Не, зараз нельга інакш. Сам ведаеш, якім стаў свет. Зараз той, у каго ёсць грошы, мацнейшы. Тут няма сяброў, ёсць канкурэнты і ворагі. Іх трэба знішчаць, інакш яны знішчаць цябе. Я хачу добра жыць. І буду. Так, я прадаю свае вершы. Так, на іх потым забываюцца... Але гэта жывыя грошы. Пра што я пішу? Бывае па-рознаму, гледзячы які заказ. А што? Ці пішу я калі-небудзь тое, што ідзе ад сэрца? Не, не пішу. Бо гэта непатрэбна. За гэта не плацяць...

...Не глядзі на мяне, калі ласка. Што табе трэба? Хочаш, я сама скажу табе праўду? Я не ведаю, што раблю тут. Я не ведаю, навошта пішу гэтую брыдоту. Я наогул нічога не ведаю. Я нічога не адчуваю. Я зарабляю грошы. І гэта ўсё.

...Я прадала сваё імя. Раней бацькі звалі мяне Алесяю... Маці спявала песню. Пра мяне. А зараз... Зараз я Алісія і ніхто пра мяне не спявае. Але ты... Ты прыходзіш да мяне кожную ноч. Будзіш маё сумленне, ці што? Я не магу працаваць, бо чую твае песні, твае словы.

Што табе трэба? Я не магу вярнуцца дахаты. Але, ведаеш, там у мяне засталася дачка. Ёй пяць гадкоў, яе завуць Веранікай. Бабуля, настаўніца роднай мовы, навучыла яе пісаць. Зусім нядаўна я атрымала ліст ад яе. Яна піша: "Дарагая мамачка! Я люблю цябе, бабулю, дзядулю і Янку Купалу!"... Я плакала... І зараз плачу... Усё... Маё жыццё — карагод падзей. Модныя спадніцы, упрыгожанні, прычоскі, манікюры, педыкюры... Мужчыны... Яна з'яўляюцца ў маім жыцці і знікаюць. Бясследна. Я не магу вырвацца з гэтага кола. Мае думкі і пачуцці атручаныя. Не, я ўжо не магу жыць іначай.

Ідзі, народжаны ў купальскую ноч, вярніся ў яе зноў. Вярніся назаўсёды. І больш ніколі не прыходзь. Бо я не магу слухаць цябе, бо ты лішні тут...

Ідзі да маёй дачкі, у сваю краіну. Ты патрэбны ёй. Я веру, што там, у маёй назаўсёды страчанай Беларусі, шмат такіх хлопчыкаў і дзяўчынак, як мая дачка. І ўжо не я, але ўсе яны дапамогуць табе ўславіць у шчырых песнях тваю (і маю) Радзіму.

Аляксандра ТАРАСЮК,
вучаніца 11 "Г" класа
СШ № 37 г. Брэста

З біяграфіі аднаго кніжніка

Так склалася, што ў агромністым акіяне цікавых, адметных беларускіх кніг няма выданняў, якія расказвалі б пра кнігазбіральнікаў, пра кніжны букіністычны гандаль. Быў у свой час зроблены адзін выпуск альманаха "Свіцязь". Сёе-тое пісалася ў газетах "Кнігарня", "Книга и мы», «Книжный мир», якія, на вялікі жаль, зараз не выходзяць. Таму сёння імёны легендарных кніжнікаў сыходзяць у нябыт. Сталага веку краязнаўцы, проста інтэлігентныя людзі, якія маюць дачыненне да гісторыі, асветы, трымаюць у памяці імя Лявонція Клока, збіральніка кнігі... А ўвогуле, хто гэта такі — збіральнік, калекцыянер?

Пісьменнік В. Каверын у сваіх "Нататках пра чытанне" ўспамінаў:

"У дваццатыя гады я часта бываў у букіністычных лаўках на Ліцейным праспекце... Аднойчы разгаварыўся з Ф. Шылавым, вядомым знаўцам старой кнігі. Размова зайшла пра кніжныя зборы, і ён, на маё здзіўленне, заўважыў, што сапраўдных калекцыянераў у Ленінградзе даўно ўжо няма. У адказ я адразу ж назваў прафесара Л., уладальніка можа быць самай вялікай у Савецкім Саюзе бібліятэкі.

— Не, — адказаў Шылаў, — Л. не калекцыянер. Ён дарожыць выданнем, але для яго на першым месцы не кніга, а тое, колькі яна па прычыне сваёй рэдкасці каштуе. Ён, трэба думаць, не раз і не два з алоўкам у руцэ падлічваў кошт сваёй бібліятэкі. Яна для яго — капітал. Значыць, гэта не кніжнік.

Я назваў Т. — вядомага раманіста, які сабраў каштоўную, хаця і не вельмі вялікую бібліятэку, у асаблівасці рэдкую таму, што ў ёй з вялікай паўнатой было прадстаўлена XVIII стагоддзе.

— Не, — сказаў Шылаў, — і Т. не збіральнік, паколькі кнігі патрэбны яму для працы, не самі па сабе, а дзеля таго, каб напісаць новыя кнігі.

Я спытаў яго, хто ж тады, на яго меркаванне, збіральнік, і ён назваў два ці тры незнаёмыя прозвішчы.

— Што значыць кнігалюб? — спытаў ён. — Гэта чалавек, для якога нічога няма на свеце, акрамя гэтай любові. Ні жонкі, ні сяброў. Кніга для яго — усё жыццё. А жонкі ў яго, між іншым, нават не можа быць, таму што жанчына кнігу не любіць".

...Пра Лявонція Клока легендарны санкт-пецярбургскі кніжнік Шылаў, напэўна сказаў бы: "Вось ён — сапраўдны збіральнік..." А я, збіраючы па крупінках звесткі пра мінскага кніжніка, сустрэўся з Віктарам Андрэевічам Рабковым. Ён і расказаў мне пра Клока.

—...Клок не так даўно памёр, было яму 75—76 гадоў. Зусім нядаўна запрашаў сяброў у сваю сціплую аднапакаёўку на праспекце "Правды", што на Паўднёвым Захадзе. Кватэра была перагароджана кніжнымі стэлажамі на дзве паловы. Уся прастора застаўлена кнігамі.

— Якую колькасць кніг мела яго бібліятэка?

— Прыкладна каля дзесяці тысяч тамоў кніг стаялі на паліцах, у шафах, ляжалі на падлозе, займалі ўсемагчымыя куточкі кухні...

— Калі гаварыць пра тэматычныя абсягі бібліятэкі, то нейкім чынам яны вылучаліся?

— У асноўным Клок збіраў беларусіку. Большая частка бібліятэкі — гісторыя Беларусі і славянства. Багаты збор выданняў на беларускай мове. І тыя, што выходзілі да рэвалюцыі, і пазнейшыя, у 1920—30-я гады: заходнебеларускія, віленскія. Камплекты літаратурна-мастацкай перыёдыкі Савецкай Беларусі з 1920-х... Але аснову складалі кнігі на рускай мове. У тым ліку — і рэдкія выданні Ключэўскага, Бястужава-Руміна...

— Некаторыя па тым часе лічыліся забароненымі і рэакцыйнымі...

— Так, і іх нельга было нават у бібліятэцы прачытаць. Асноўную частку кніг для сваёй бібліятэкі Клок прывозіў з Ленінграда (Санкт-Пецярбурга). Лявонцій Дзмітрыевіч склаў патрэбны спіс і раздаў яго па букіністычных крамах. А пасля ездзіў праз пэўныя інтэрвалы часу і прывозіў каштоўныя набыткі ў Мінск. У Лявонція Дзмітрыевіча быў сапраўдны нюх на кніжкі. Шкада, што не пісаў ён пра свае пошукі... Але вернемся да размовы пра змест бібліятэкі, яе класіфікацыю. Беларусіка ў Клока была на самых розных мовах: на беларускай і на рускай, а таксама на польскай і лацінскай. Між іншым, Клок добра ведаў французскую мову. Былі ў яго бібліятэцы кнігі і на французскай мове, дзе згадвалася Беларусь. Словам, накірунак кнігазбору Лявонція Дзмітрыевіча я вызначыў бы наступным чынам: беларусіка, гісторыя Расіі, гісторыя Польшчы ды іншых суседніх з Беларуссю краін. Мяркую, што палова ці дакладней трэцяя частка сабранага адносілася да XIX стагоддзя па часе выдання. Былі нават цікавыя выразкі з дарэвалюцыйных газет і часопісаў — тыя публікацыі, дзе размова ішла пра гарады і мястэчкі Беларусі. І цяпер перад вачыма стаіць клокаўскі экземпляр "Вянка" Максіма Багдановіча.

— Працуючы ў музеі гісторыі і культуры, Клок часта выязджаў у экспедыцыі па закупцы, росшуку экспанатаў. Відаць, рабіў уласныя набыткі падчас тых паездак?

— Мы разам працавалі ў сектары феадалізму. Памятаю сумесную паездку ў Паставы. Там Лявонцій Дзмітрыевіч купіў для сябе і беларускія выданні і кнігі на лацінскай мове. Яму, гісторыку па адукацыі, чалавеку дасведчанаму, які ведаў французскую і лацінскую мовы, лёгка было ацаніць вартасці нават незнаёмых дагэтуль выданняў.

— Як ашчадна ставіўся Клок да сабранага, ці лёгка расставаўся з кнігай, ці ішоў насустрач зацікаўленням іншых?

— Канечне ж, мяняўся. У мяне ад яго застаўся трохтомнік Мікалая Палявога "История русской словесности"... А я тады аддаў Клоку "Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі" В. Ластоўскага. Многім кніжнік даваў свае выданні на час, а пасля аказвалася, што так званыя сябры "забываліся" вярнуць кнігу.

Такімі якраз былі стасункі з Лявонціем Дзмітрыевічам у аднаго па тым часе высокага партыйнага, а затым і дзяржаўнага функцыянера. Забягаў ён, як правіла, да Клока з пляшкай "старадарожскай" ці іншай саматужнай гарэлкі. На крамную, відаць, грошай не хапала. І выцыганьваў на тыдзень-другі патрэбныя кнігі. Лявонцій Дзмітрыевіч неяк паказаў мне нават велізарны спіс тых выданняў, якія ўжо і пад пагрозамі "аўтарытэтны" чын ніяк не пагаджаўся вярнуць.

Мне і сёння шкада, што бібліятэка Клока сышла ў нікуды.

Клок вёў перамовы з выдавецтвам "Беларуская Энцыклапедыя" наконт продажу бібліятэкі гэтай установе. Гаварыў, што для яго нават не важна, калі яны не адразу разлічацца. Але нешта не склеілася. Шкада.



— Спадчыннікі не здолелі распарадзіцца належным чынам?

— Справа тут зусім не ў сямейніках. Жывучы апошнія дзесяцігоддзі адзін, Лявонцій Дзмітрыевіч, маючы дачку і ўнука, перапісаў кватэру выпадковаму чалавеку. Перад смерцю кніжніка мы заходзілі да яго разам з дачкою. Спрабавалі перапісаць кватэру на ўнука. Лявонцій Дзмітрыевіч як быццам пагадзіўся. Але ж нічога зрабіць мы не паспелі. Літаральна праз тыдзень Клок памёр. Той выпадковы спадчыннік разам з хаўруснікамі і пахавалі старога, зрабілі гэта ледзьве не тайком. На крайні выпадак — родзічам, блізкім знаёмым нічога не паведамілі. Паўгода, згодна існуючаму заканадаўству, кватэра была апячатанай. Затым літаральна пачкамі кнігі з бібліятэкі Клока пачалі з'яўляцца ў букіністычных крамах Мінска.

Памятаю, што Клок вёў перамовы з выдавецтвам "Беларуская Энцыклапедыя" наконт продажу бібліятэкі гэтай установе. Гаварыў мне, што для яго нават не важна, калі яны не адразу разлічацца. Але нешта не склеілася. Шкада.

— Віктар Андрэевіч, ці маглі б вы згадаць асобныя рарытэты з бібліятэкі Лявонція Дзмітрыевіча?

— На памяці — даволі рэдкі, як мне асабіста падаецца, трохтомнік Аляксандра Станіслававіча Дамбавецкага "Спроба апісання Магілёўскай губерні ў гістарычных, фізіка-геаграфічных, этнаграфічных, прамысловых, сельскагаспадарчых, лясных, вучэбных, медыцынскіх і статыстычных адносінах". Дарэчы, мінчанін па нараджэнні Клок пасля заканчэння гістфака БДУ настаўнічаў на Магілёўшчыне. Таму, відаць, як цяпер успамінаю, часта ён і звяртаўся да трохтомніка Дамбавецкага. Узгадваюцца і тамы "Беларускага зборніка" Еўдакіма Раманава. Хацеў бы падкрэсліць, што кнігі ў бібліятэцы Клока дзесяцігоддзямі не пыліліся. Лявонцій Дзмітрыевіч шмат чытаў. Да яго па кансультацыі звярталіся энцыклапедысты, пісьменнікі, гісторыкі і кіношнікі. Клок, будучы бяссрэбранікам, жыў толькі кнігай.

— І як усё ж канчаткова склаўся лёс бібліятэкі легендарнага кніжніка пасля таго, як Клока не стала? Яшчэ можна разлічваць хаця б на існаванне істотнай яе часткі?

— Я ўжо крыху расказаў пра гэта. Магу з пэўнай доляй дакладнасці засведчыць, што яе, бібліятэкі Клока, як цэласнага фарміравання ўжо не існуе.

— Адвечная славянская звычка — страціць тое, што было ў руках...

— Так, памятаеце, як у ЗША адышла бібліятэка Юдзіна па гісторыі Сібіры, Аляскі... А кнігазбор, архіў Рубакіна?!. Зразумела, калі знікалі кнігі ў Вялікую Айчынную, калі не стала бібліятэкі Купалы, Коласа. Зусім цяжка ўцяміць, як гінуць каштоўныя кнігазборы ў наш час. Так не павінна быць!..

Клок жыццём сваім распарадзіўся на карысць Яе Вялікасці Кнігі. З памяці ўсплывае амаль анекдатычны выпадак. Аднойчы Лявонцій Дзмітрыевіч прывёз з Ленінграда прыблізна 250 кілаграмаў кніг. Цікаўлюся, а як жа, маўляў, яму такое ўдалося. Жартую: "Няўжо насільшчыкаў наймаў?!." Тлумачыць, што пешшу перанёс з Ліцейнага да чыгуначнага вакзала. Перавязаныя стосікамі кнігі насіў па чарзе. Метраў 15—20 перанясе, тады подбегам вяртаецца за чарговай партыяй. У цягнік не хацелі пускаць, неяк угаварыў праваднiцу ці брыгадзіра праваднiкоў, падараваўшы ім не самы каштоўны з набытых экземпляраў. Лічы, давёз да Мінска без страт. І падобных гісторыі пра Клока можна было б расказаць мноства.

— А пра яго нават артыкула ў "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" няма...

— Фармальна энцыклапедысты паступілі правільна. Ён жа не быў ушанаваны навуковай ступенню. Ведаю, праўда, што ўсё ж тры артыкулы аўтарства Лявонція Дзмітрыевіча змешчаны ў "ЭГБ". Мо, праўда, з часам выйдзе даведнік "Кніжнікі Беларусі" — дык там спадзяюся для Клока знойдзецца месца.

Кастусь ЛЕШНІЦА

Хведар ЖЫЧКА



Не стала Хведара Жычкі — аднаго з нямногіх сёння беларускіх пісьменнікаў, хто складае слаўную кагорту ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Не стала літаратара яркага, шматграннага таленту.

Не стала аднаго з галоўных рэдактараў штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва".

Не стала цудоўнага чалавека, які сваёй сумленнасцю, прынцыповасцю, актыўнасцю грамадзянскай пазіцыі з'яўляецца прыкладам усім нам, як трэба жыць.

Ягоная біяграфія — гэта жыццяпіс чалавека, які, не шукаючы лёгкай дарогі, настойліва ішоў да сваёй мэты. Ураджэнец пасёлка Марс Жлобінскага раёна, Хв. Жычка ў 1944—1951 гадах служыў на Балтыйскім Ваенна-Марскім Флоце. Пасля дэмабілізацыі працаваў літаратурным работнікам у рэдакцыях газет "Чырвоная змена", "Піянер Беларусі", адказным сакратаром рэдакцыі часопіса "Бярозка". Скончыўшы ў 1959 годзе Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве, быў рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі выдавецтва "Беларусь", галоўным рэдактарам штотыднёвіка "ЛіМ", старшым рэдактарам выдавецтва "Мастацкая літаратура".

Прыйшоў у літаратуру 60 гадоў таму. Прыйшоў упэўнена, адразу надрукаваўшыся ў часопісе "Полымя". Пасля былі публікацыі ў іншых літаратурна-мастацкіх выданнях, пераклады на рускую і іншыя мову. І кнігі, кнігі, кнігі...Паэзія, проза, для дзяцей і юнацтва, навукова-папулярныя. Колькасць іх паступова набліжалася да 30. Ды, зразумела, справа не ў колькасці. Правільней сказаць, што колькасць пераходзіла ў якасць. З кожным творам, з кожнай кнігай жыццядайны талент Хведара Дзмітрыевіча ўсё больш набіраўся сілы. Ягоныя кнігі любілі і любяць тыя, каму да сэрца сапраўдная літаратура. Высокамастацкая, напоўненая глыбокім роздумам і светлымі парываннямі. Тая літаратура, якая нясе ў сабе агульначалавечыя каштоўнасці.

Надзіва паспяхова Хв. Жычка выступаў і ў галіне перакладу. Дзякуючы ягонагаму таленту, па-беларуску загаварылі многія прадстаўнікі іншых літаратур. А наколькі высокае ягонае майстэрства ў гэтай галіне, сведчыць ужо тое, што ён з'яўляецца лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Віцезслава Нэзвала за пераклады і прапаганду чэшскай і славацкай літаратур, узнагароджаны Дыпломам і медалём Славацкага літаратурнага фонду.

І, канечне ж, нельга не сказаць і пра рэдактарскую дзейнасць Хведара Дзмітрыевіча. І падчас працы ў выдавецтвах, але ў большай ступені — на пасадзе галоўнага рэдактара "ЛіМа".

Нават зоркі — нявечныя. Тым больш — нявечны чалавек. Жыццё Хв. Жычкі абарвалася на 81 годзе. Аднак, як святло памерлых зорак даходзіць да людзей, гэтаксама застаецца запатрабаваным і талент сапраўдных пісьменнікаў.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Саюз пісьменнікаў Беларусі глыбока смуткуе з прычыны смерці старэйшага беларускага пісьменніка Хведара ЖЫЧКІ і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім пісьменніка Хведара ЖЫЧКІ з прычыны яго смерці.

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова глыбока смуткуе з прычыны смерці вядомага паэта, празаіка, перакладчыка, былога галоўнага рэдактара газеты "Літаратура і мастацтва" (1972—1976) Хведара ЖЫЧКІ і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае спачуванне пісьменніку Уладзіміру Васіленку з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.

Да 90-годдзя народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля

Не магу пісаць, што "я яго ведаў". Што я мог ведаць, калі Брыль з 1917-га, а я з 1959-га — век адзін, а час у кожнага свой.

Летам 1994-га паехаў я ў Мінск паступаць у Саюз пісьменнікаў. Іван Шамякін спытаў і паслухаў толькі пра маю працу ды сказаў "у мяне больш няма пытанняў", а потым на вечарыне мы з Шамякіным міла пагаварылі пра аповесць "Тандлярка і паэт", пра Мурманск 1945 года і чаму я пішу вершы, а не пераходжу на прозу. Але калі Шамякін сказаў, што няма пытанняў, мяне ізноў ашаломіў Брыль. Справа ў тым, што маіх рэкамендацый Бічэль, Быкава, Мацяш і Дранько-Майсюка было пісьменніцкай радзе мала, а меў быць яшчэ жывы "адвакат", а з тых, хто мяне рэкамедаваў, на тую раду кожны са сваіх прычынаў ніхто не хадзіў. І тут на ногі падняўся Брыль... і пачаў мяне хваліць — і так я быў прыняты ў СП Беларусі...

...Дагнаў я Брыля толькі ў гардэробе, калі ён ужо браў плашч і прыладжваў берэт.

— Гэта мне Быкаў пазваніў. Кажа, напісаў Чобату рэкамендацыю, а сам у той СП даўно не хаджу, то схадзі ты і дапільнуй тую раду.

І па развітанні я навек запомніў, што такое іерархія розуму, у якой Брыль і Быкаў, людзі абавязку, былі і будуць вышэй за мяне і за многіх другіх.

І калі цяпер гляджу ягоныя пісьмы з нашай кароткай перапіскі, то сэрца рэжуць словы з яго апошняга ліста за дваццаць дзён перад тым: "трэба ўсім вытлумачыцца" — і таму, піша, не злуйце, што пішу Вам коратка...

Трэба вытлумачыцца... Самому яму так было трэба. Усё жыццё было трэба. Жыў абавязкам. І для таго святы і вечны — у маёй і не маёй памяці.

Іван Антонавіч Брыль...

Алесь ЧОБАТ

«Трэба перад усімі вытлумачыцца...»

28.VIII.05

Дарагі Аляксандр Фёдаравіч!

Пазаўчора я вярнуўся з Крынічнага ў Мінск. Перад гэтым, на дачы, карэспандэнцыю мне не прывозілі цэлых два тыдні, і таму Ваша змястоўна-заказное пісьмо прачытаў з двухтыднёвым спазненнем.

Затое прачытаў і пісьмо, і вершы двойчы, спачатку прывыкаючы да ледзь не стараславянскай вязі Вашага почырку, а праз дзень, каб з новай увагай усё засвоіць.

Дзякую і за пісьмо, і цэлы своеасаблівы зборнік паэзіі, і за прысвячэнне!

Шчырасць і свежасць пачуццяў, грунтоўная сталасць роздуму і майстэрства бачыцца, адчуваецца і ў "чыста" сваім, асабістым, і ў евангельскіх матывах, блізкіх і мне, і ў "З Чэслава Мілаша". Дай Бог Вам і далейшых поспехаў!

Над Нёманам я прабыў 35 дзён, пад роднай апекай дочак, старэйшай — гішпаністкі, і малодшай — рэдактаркі ў "Мастацкай літаратуры". Па сваёй старэчай "возрастной норме", як гаварыў мне адзін з лекараў, хадзіў з кульбай на недалёкія паходкі, з ганку або з крэсла пад старой чарэшняй любаваўся летняй красою. Многа чытаў і — Богу дзякаваць! — трохі пісаў. Па ранейшай дамоўленасці з Янам Чыквіным і ягонай Галяй Твараовіч, паслаў у "Тэрмапілы" падборку запісаў, балазе ў альманах сёлетні не спазніўся.

У маім узросце вельмі не паспяшыш, аднак і спазняцца не хочацца.

Што будзе далей — "Бог Бацька", як гаварылі нашы папярэднікі.

Скідаль я ведаю з пачатку 1937 года, бываў у ім і пазней разоў колькі, і думаю пра яго ў нейкай меры, па-сваяцку.

Хай Вам у ім добра здаровіцца і плённа працуецца!

Яшчэ раз — дзякую!

(Я. Брыль)

15.I.06

Добры дзень, Алесь!

Дзякую за пісьмо.

Што да Панамарэнкі, дык я яго ведаю мала. На партызанскім парадзе ў Мінску, у ліпені 1944-га, слухаючы, як ён грымеў з трыбуны, дзіўным было пачуць, ды не толькі мне, бо пра гэта гаварылася з хлопцамі, што СССР перамог Гітлера... дзякуючы калгаснаму ладу. Мы спадзяваліся іншага.

У маёй кнізе "Дзе скарб ваш", на старонках 99—100, трохі пра маю, адзіную ў жыцці, сустрэчу з гэтым аматарам гісторыі. А ў зборніку "Пішу як жыву", на старонках 352—353, яшчэ менш пра яго "благие намерения" што да беларускай мовы.

Адзін раз слухаў яго на пісьменніцкім пленуме, а са слоў свайго сябра, паэта Валянціна Таўлая, памятаю такое. Таўлай у "Советской Белоруссии" выступіў з рэзкай крытыкай пра бяздарную "партызанскую" кнігу Міхася Клімковіча, дарэчы, артыкул гэты варта прачытаць у яго, Таўлаевай, кнізе "Творы" (1961 год, назва: "У крывым люстры «Ляснога возера»").

Панамарэнка прыслаў па Таўлая свой чорны "ЗИС" і ў прысутнасці сваіх чыноўнікаў сказаў: "Вот беспартийные и научат вас разбираться в литературе!" Таўлай — рэвалюцыянер з 14-ці гадоў, у верасні 1939 года выйшаў з гродзенскай турмы, але ж годам раней КПЗБ была ліквідавана і нашы змагары сталі ўраз беспартыйныя.

Вось і ўсё, што ведаю або пра што чуў.

Калі Панамарэнка паехаў з Беларусі — плачу не было чуваць. Начальства часта мянялася, асабліва не адрозніваючыся адзін ад аднаго.

Усяго добрага!

(Я. Брыль)

08.VII.06

Дарагі Алесь!

Якраз у тыя дні, калі прыйшло Ваша пісьмо, я ўжо лёг у бальніцу, а вярнуўся дахаты толькі пазаўчора, гатовы праз тыдні два ехаць з дочкамі на Нёман.

З Вашых "вложений" у пісьмо не чытаў я толькі таго, што друкавалася ў беластоцкай "Ніве" і што я прачытаў з адпаведнай цікавасцю. Цікава сказалася Вамі пра спакой, які нам патрэбен у сучасным шоламе ды мітусні, і яго мне хочацца паважаць, на ім трымацца, таго ж жадаючы і другім.

Прабачце, што пішу коратка, бо пісьмаў трохі сабралася, пакуль гаспадар не быў дома, і трэба перад усімі вытлумачыцца.

Усяго добрага!

(Я. Брыль)

Гартаванне на праведным агні

Ён быў юнаком, калі трапіў пад колы жахлівай сталінскай рэпрэсіўнай машыны. І ён жа адным з першых расказаў праўду пра ГУЛАГ. У адрозненне ад соцень тысяч ахвяраў крывавых часоў 30-х гадоў, пераважная большасць якіх зламалася пад цяжарам лагера і турмы, Сяргей Грахоўскі быў незвычайна моцнай асобай — ён не толькі вярнуўся да Літаратуры, але і працягваў пісаць да апошніх дзён жыцця.

Дзіўлюся, што пасля *такога* перажытага, Чалавек не расчараваўся ў людзях, не схаваў у душы злосць і варожасць да свету, нават пачуцця нянавісці і помсты не было да тых, хто стаўся прычынай яго пакут. Яго творчая спадчына надзвычай багатая: больш за шэсцьдзесят кніг паэзіі і прозы, выходзілі двухтомнікі выбраных твораў, перакладная літаратура, публіцыстыка, дзённікі, лісты... За актыўную грамадскую і літаратурную дзейнасць пісьменніку было нададзена званне "Заслужаны работнік культуры Беларусі". А таксама Сяргей Грахоўскі — лаўрэат літаратурнай прэміі імя А. Куляшова і лаўрэат Дзяржаўнай прэміі.

Сёння, праз пяць год пасля смерці Пісьменніка, чытач мае магчымасць яшчэ раз (ці ўпершыню) пазнаёміцца з высокадухоўнай, таленавітай, яркай паэзіяй Сяргея Грахоўскага, ягонымі празаічнымі творамі, асабліва з дакументальнымі аповесцямі "Зона маўчання", "Такія сінія снягі", "З воўчым білетам", якія атрымалі ў свой час шырокі грамадскі рэзананс (Сяргей Грахоўскі. Выбраныя творы. — Мінск: Кнігазбор, 2007). Іх чыталі, перачытвалі. Гэта былі кнігі-помнікі, як і лагерныя творы А. Салжаніцына, В. Шаламава, Я. Гінзбурга, Н. Мандэльштам і іншых. Апроч упомненага, том змяшчае ў сабе і дзённікавыя запісы пісьменніка і лісты вядомага спевака Міхаіла Забэйды-Суміцкага...

Увогуле, эпіграфам да ўсяго выдання я ўзяў бы словы Людмілы Рублеўскай, якая колькі гадоў таму напісала: "Нашым літаратарам не трэба шукаць, чым здзівіць публіку, дастаткова проста пажыць на гэтай зямлі, і ўражваючыя сюжэты падкіне само жыццё". Толькі, на жаль, не ўсім было дадзена данесці праўдзівыя сюжэты гісторыі да нашчадкаў. Не ўсе вярнуліся, не напісалася колькі яшчэ цікавых і шчырых кніг... Пра гэта таксама згадваецца ў аповесцях Грахоўскага. Сяргей Дарожны, Алесь Пальчэўскі, Платон Галавач, Валеры Маракоў, Міхась Зарэцкі, Лукаш Калюга, Васіль Шашалевіч, Міхась Чарот... Пералік далёка не поўны тых творцаў, якія як і Сяргей Грахоўскі, былі беспадстаўна арыштаваны і асуджаны на расстрэл ці на вялікія тэрміны зняволення. Перачытваючы "Зону маўчання" (дарэчы, у дакументальных творах пісьменнік часта згадвае пераліченых творцаў, з большасцю якіх лёс наканаваў яму сустрэцца менавіта ў зняволенні) міжволі параўноўваю з сучаснымі серыяламі і бульварнымі раманчыкамі, што распавядаюць пра турмы, зоны, блатную рамантыку. Вядома, збольшага гэта выдумка сцэнарыстаў і аўтараў, разлічаная на скандальнасць і тыражнасць нізкаякасных твораў. А ў "Зоне маўчання" — перад намі *праўда*, цалкам супрацьлеглая ўсім нават самым смелым уяўленням. Бадай, ніхто не здолее так выдумаць як само жыццё. Усе тыя катаванні і жахі, якія перажыў у сталінскіх лагерах, і ў следчых ізалятарах пісьменнік, не паддаюцца ўяўленню. І ці не таму ўжо ў "Слове да споведзі" немагчыма без хвалявання чытаць радкі: "*Я двойчы прайшоў усе кругі пекла і не зламаўся, не знік на таежных скрываўленых трасах. Смерць з дня ў дзень цікавала кожнага з нас, глядзела ў ашклелыя вочы і збірала шчодрую даніну. А я не паддаўся ёй.*

...Нас з тысячы вярталіся адзінкі, з мільёнаў — сотні. Усё меней і меней застаецца сведак тае страшнае пары, калі кожны баяўся ўласнага ценю, не адважваўся прызнацца да закатаванага бацькі, а бацька — да сына, калі па праведнай крыві з рыпам ступалі катавы боты".

Мяркую, няма сэнсу пераказваць, нават павярхоўна, *такія* творы. Яны павінны быць *адчутымі*. Нельга, напрыклад, камусьці пераказаць, падрабязна і пераканаўча, падзеі, захаваныя ў памяці іншага чалавека. Але можна сказаць упэўнена: кожнае слова дакументальнай прозы Сяргея Грахоўскага — гэта пройдзены крывавы шлях, які асэнсоўваецца наноў, але з не меншым душэўным цяжарам, як *тады*. І не па сабе рэквіем складае аўтар — а па тых, хто гінуў на яго вачах, пакутліва, жахліва, закатаваны бязлітаснымі паслугачамі Зла..

Здаецца, падобным чынам маглі меркаваць і ўкладальнікі кнігі — Кастусь Цвірка і Таццяна Грахоўская, калі пасля грунтоўнай і цікавай прадмовы да выдання Лідзіі Савік пачалі вершам Сяргея Грахоўскага "Душа". Гэта своеасабліва крэда пісьменніка, вершаваная ў хуткім рытме строгага радка вера найперш у сябе, у сваю моц, якая нададзена Звыш і якая дапамагала выжыць, не страціць чалавечую годнасць у самых цяжкіх умовах.

Мяне выхоўвалі,
Мяне захоўвалі,
Я то з'яўляўся,
То знікаў.
Мяне вадзілі
І ахоўвалі,
Хоць я нікуды
Не ўцякаў.

І пад замкамі,
І пад пломбамі,
Нібы каштоўнасць,
Бераглі
І неба клеткамі
І ромбамі
Разлінавалі,
Як маглі.
<...>

Мая душа
Супраціўлялася,
Бо верыла і тым жыла,
І не чарсцвела
Не ламалася —
Была такою, як была.

Хоць дзіўна,
Ў чым яна трымалася,
А паспрабуй
Яе сагні!
Яна ж з маленства
Гартавалася
На чыстым
Праведным агні.

Акрамя "лагернай" паэзіі і прозы, у кнізе змешчаны творы, тэма якіх вызначаецца "адвечным". Тым не менш, шаблоннасць "вечнага" Сяргей Грахоўскі таленавіта пераўтварае ў яркую і захапляльную мелодыю фарбаў, пахаў, гукаў, краявідаў і ў гэтым многагалосным хоры паэтызуе *Беларускую вечнасць*, як сімвал святла, спакою, душэўнай мудрасці і бясконцага хараства прыроды... Таму нават у "сацыяльных", творах пісьменніка рэфрэнам гучыць матыў Радзімы. Таму і ў філасофскіх вершах першапрычынай усяго існага прачытваецца родны край, дараваны Богам.

Яшчэ адна важная дэталь: гэты унікальны том выбранага вядомага паэта быў выдадзены дзякуючы Магілёўскаму аблвыканкаму і сям'і пісьменніка. Хацелася б, каб такое "мецэнацтва" ператварылася ў добрую традыцыю, і неўзабаве чытач мог пабагацець на многія іншыя цікавыя і яркія кнігі падобнага кшталту.

Павел ГАСПАДЫНІЧ

Усе мы, гісторыкі, ходзім у архівы, але далёка не кожны з нас становіцца архівістам. І справа не ў тым, дзе ляжаць нашы працоўныя кніжкі. Справа ў адмысловым стаўленні да таго, што суха і паказённаму завецца "дакументам". Для многіх гэта проста ліст паперы, пэўны аб'ём інфармацыі, матэрыял для гістарычнага даследавання. Значна менш тых, хто прызнае за дакументам сапраўдную сілу, бачыць у ім не проста ілюстрацыю, але згустак гістарычнага часу, пасланне да нашчадкаў. Чытаць, берагчы, знаходзіць падобныя лісты з мінулага — сапраўдны дар. Ім валодае Віталь Уладзіміравіч Скалабан, постаць па-свойму знакавая для беларускай гістарыяграфіі, архіўнай справы, краязнаўства, ён яшчэ і гісторык літаратуры, кнігазнаўца і бібліёграф, энцыклапедыст, выдавец, драматург, сцэнарыст, выкладчык, аўтар тэлевізійных перадач.

Дзядзька Скалабан

Чым ёсць Пецярбург-Ленінград для беларускай гісторыі — асобная тэма. Хоць, мабыць, маладзенькі хлапчук з Ляхавічаў, калі ехаў паступаць у тамтэйшы універсітэт, менш за ўсё думаў пра тое, што ідзе па шляху Адама Міцкевіча і братоў Каліноўскіх, Браніслава Эпімаха-Шыпілы і Вацлава Іваноўскага, Яўхіма Карскага і Аляксея Сапунова, Усевалада Ігнатоўскага і Аляксандра Сержпутоўскага. Мэта ставілася больш простая і даволі празаічная: паступіць у ВНУ, вучыцца, атрымаць дыплом. Планы былі не проста выкананыя, але перавыкананыя.

Ужо цягам працы над дыпломам выявілася галоўная тэма ягоных навуковых пошукаў: станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці на пачатку XX стагоддзя. І яшчэ адзін важны нюанс: выпускнік ленінградскага універсітэта не заблукаў на бязмежных расійскіх абшарах, а вярнуўся на Радзіму. Ён не страціў Беларусь, а Беларусь набыла свайго гістарыёграфа.

Калі пачалася "перабудова" ў айчыннай гістарычнай навуцы? Стандартны адказ — у часы Гарбачова, новага палітычнага мыслення, развалу СССР і станаўлення Рэспублікі Беларусь. Але хіба ў нашай гісторыі і гістарыяграфіі ўсё гэтак прасталінейна і адназначна? Яе рухалі наперад не тыя, хто чуйна рэагаваў на змену палітычнай кан'юнктуры і новую гістарычную моду, але тыя, хто наважыўся пайсці супраць цячэння, хто, звяртаючыся да мінуўшчыны, раней за сваіх сучаснікаў здолеў убачыць гістарычныя далягляды будучыні. Прадаўжальнікам традыцыі, што бярэ пачатак ад Мітрафана Доўнар-Запольскага, Вацлава Ластоўскага, Мікалая Улашчыка, стаў Віталь Скалабан. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў з яго іменем цесна звязаная рэалізацыя важнейшых ініцыятыў у айчыннай гуманістыцы.

Першай такой вялікай справай стала Беларуская — тады яшчэ Савецкая — энцыклапедыя. Пачынала яна стварацца ў эпоху Брэжнева, у самыя, здавалася б, застойныя часы; стваралася цэнтралізавана, як акадэмічны інстытут, па загадзе "зверху", і, бадай, нечакана нават для ініцыятараў яе з'яўлення некалькі дзесяцігоддзяў была галоўным парушальнікам спакою ў беларускай навуцы. Вінаватая ў гэтым гісторыя. Яна і раней вярэдзіла грамадства сваімі пытаннямі, але беларуская савецкая гістарыяграфія — акадэмічная, партыйная, універсітэцкая — навучылася іх віртуозна абмінаць. Усе ведалі пра наяўнасць забароненых праблем, недысертабельных тэм, пералік табуіраваных імёнаў, што не траплялі на старонкі навуковых выданняў. Энцыклапедыя такой раскошы дазволіць сабе не магла. Гэта супярэчыла б прынцыпам энцыклапедычных выданняў. Натуральна, "белыя плямы" і "чорныя дзіркі" былі і там, але ў цэлым энцыклапедычныя "астраномы" значна пашырылі беларускія гуманітарныя далягляды. Пасля таго, як тэма ці імя траплялі на старонкі энцыклапедычных выданняў, праблема быццам бы легітымізавалася, станавілася аб'ектам паўнавартасных навуковых доследаў. Не магу дакладна меркаваць, які вопыт Віталя Скалабана — вопыт арганізатара ці вопыт даследчыка — быў найперш запатрабаваны на энцыклапедычнай ніве, але без ягонага досведу не магло абысціся ніводнае фундаментальнае выданне.

Хоць і са спазненнем на 200 гадоў, але Беларуская энцыклапедыя здзейсніла тое ж, што і яе знакамітая французская папярэдніца — паспрыяла адраджэнню, а часам і станаўленню айчыннай бібліяграфіі, біяграфістыкі, гістарычнай геаграфіі, картаграфіі, генеалогіі, храналогіі. Пад "энцыклапедычным" дахам, у прамым і пераносным сэнсах, пачалі выдавацца гісторыка-дакументальныя хронікі "Памяць". І падрыхтаваная Віталем Скалабанам хроніка Ляхавіцкага раёна сталася ўзорам, эталонам згаданых выданняў.

Краязнаўчая тэма не адпускае яго і сёння. Гэта не толькі ўласныя даследаванні, але і пастаяннае кансультаванне тых аматараў мінуўшчыны, што цвёрда перакананыя — у беларускай гісторыі для дзядзькі Скалабана няма закрытых старонак. Як і няма забытых імёнаў. Бо менавіта дзякуючы яму ў беларускі гістарычны кантэкст вернутыя імёны Н. Чарноцкага, С. Скандракова, Ф. Кудрынскага, Я. Хлябцэвіча, У. Фальскага, Ф. Шантыра, Ф. Турука, М. Мялешкі, М. Каспяровіча, А. Вазілы, Я. Канчара, А. Гзоўскага і многіх іншых, не кажучы пра постаці У. Ігнатоўскага, М. Доўнар-Запольскага, М. Улашчыка. А хтосьці, магчыма, прыгадае, што ўсесаюзную вядомасць беларускаму даследчыку прынесла адкрыццё імені першага ленінскага біёграфа — загадчыка выдавецкага пададдзела петраградскага аддзялення Белнацкама Івана Баранкевіча.

Пасля Беларускай энцыклапедыі Віталь Скалабан працаваў намеснікам дырэктара Беларускага НДІ дакументазнаўства і архіўнай справы, потым займаў такую ж пасаду ў Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтры імя Ф.Скарыны. Але ў "чыноўніка ад навукі" так і не ператварыўся. Працягваліся архіўная адысея, актыўнае друкаванне, удзелы ў навуковых канферэнцыях і "круглых сталах", як у Беларусі, так і за мяжою — у Расіі, Украіне, Латвіі, Польшчы, Германіі. Сціплы энцыклапедыст стаўся публічным дзеячам, які не проста даследаваў мінулае, але мэтаскіравана і паслядоўна вяртаў яго свайму народу. Тэма вяртання бачыцца лейтматывам ягонай працы. Беларуская архівістыка за мяжою, неапублікаваная літаратурная спадчына Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, Алеся Гаруна і інш., знойдзеныя ў прыватным архіве дагэтуль невядомыя тэксты беларускай літаратуры XIX стагоддзя з так званы рукапісаў Аляксандра Рыпінскага, уласная версія знікнення знакамітага крыжа Еўфрасінні Полацкай, лёс гістарычнай спадчыны Беларусі, вывезанай падчас вайны ў Германію, — вось толькі кароткі пералік тых праблем, да якіх звяртаўся гісторык. Зрэшты, калегам яго могуць назваць і літаратуразнаўцы: быць рэдактарам і ўкладальнікам асобных тамоў Поўнага збору твораў Янкі Купалы — важкі аргумент на карысць таго, што і ў цэху літаратараў Віталь Скалабан не апошні чалавек.

Драмы гісторыі зрабілі з гісторыка драматурга. Усё пачалося са сцэнарыяў дакументальна-мастацкіх стужак пра З. Жылуновіча, У. Ігнатоўскага, Янку Купалу, Беларускую Народную Рэспубліку. Пасля былі п'есы, гістарычныя драмы "У жніўні 36-га", "Людвіка і Фабіян" (у сааўтарстве з Л. Рублеўскай) і нядаўняя — "Абняць вышыню" (у сааўтарстве з А. Карэліным; апублікаваная, яна чакае сваіх рэжысёра, акцёраў і гледачоў). А яшчэ — праца сцэнарыстам і кансультантам, па сутнасці — галоўным архіварыусам "Адкрытага архіва", аўтарскай праграмы А. Матафонава на Першым Нацыянальным тэлеканале.

Гісторыкаў у нас шмат. Дактароў навук і прафесараў, акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў, не кажучы пра кандыдатаў з дацэнтамі, а дзядзька Скалабан — адзін. Сёння ён загадвае аддзелам публікацыі дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Можна было б сказаць: чалавек знайшоў сваё месца. Але варта аддаць перавагу іншай фармулёўцы: месца знайшло чалавека. Красамоўнае пацвярджэнне таго — архіўныя зборнікі пра чарнобыльскую трагедыю, пра пачатак Вялікай Айчыннай вайны, рэалізацыя даўнішняй задумы па выданні зборніка дакументаў і матэрыялаў Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі. Сярод выданняў гэтага года — "Накануне. Западный особый военный округ (конец 1939 г. — 1941 г.)", сумесная праца з Федэральным архіўным агенцтвам Расіі і Расійскім дзяржаўным ваенным архівам.

Ёсць і новыя праекты, так што свой 60-гадовы юбілей ветэран беларускай архівістыкі сустракае ў творчым пошуку. Веры ў Беларусь яму не бракуе. Таму разам будзем шукаць адказ на пытанне: ці дазваляе беларуская мінуўшчына з аптымізмам узірацца ў будучыню?

Андрэй КІШТЫМАЎ

Гісторыя аднаго подзвігу

У кнізе "Паляванне на ката", якая сёлета выйшла ў выдавецтве РВУ "Літаратура і мастацтва", — пра пакаранне стаўленіка Гітлера ў Беларусі Вільгельма Кубэ — падрабязна расказваецца пра подзвіг, да якога былі далучаны сотні выканаўцаў.

Раней шырокі чытач ведаў пераважна трох асноўных выканаўцаў народнага прысуду — Герояў Савецкага Саюза Алену Мазанік, Марыю Осіпаву і Надзею Траян, чые здымкі віднеюцца (не ў алфавітным парадку) на вокладцы кнігі, дасведчана і займальна напісанай архівістам Вячаславам Селяменевым і журналістам Віктарам Шымоліным. Першая з гераінь выканала самае небяспечнае заданне — заклала міну ў ложак гаўляйтэра, другая з не меншай рызыкай даставіла міну ў кошыку з ягадамі ў Мінск, трэцяя з цяжкасцю здабывала тую міну, апрача таго рыхтавала замах на Кубэ ў Смалявічах, куды ён меўся прыехаць на дажынкі, але не прыехаў. Алены Мазанік і Марыі Осіпавай ужо няма ў жывых, а наша суайчыннiца, ураджэнка Дрысы (цяпер Верхнядзвінск) медык Надзея Траян жыве ў Маскве, доўгі час узначальвала там Саюз таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца.

Аднак сёння, дзякуючы кнізе "Паляванне на ката", мы ведаем, што да народнай акцыі пакарання былі далучаны каля тысячы выканаўцаў, больш дзесяці спецатрадаў. Задумана яна была ў Маскве, не без удзелу ўсемагутнага Іосіфа Сталіна. А потым да акцыі далучыліся такія вядомыя кіраўнікі, як Павел Судаплатаў, Лаўрэнцій Цанава, Кірыла Арлоўскі, Станіслаў Ваўпшасаў. Куды менш або зусім нічога да выхаду кнігі не было вядома пра такіх герояў з пакручастым лёсам, як Мікалай Хахлоў, Таццяна Каліта, Сямён Юрын, Мікалай Фёдараў або... нямецкі генерал Карл Кляйнюнг. І ўсе іх памкненні скрыжаваліся на мінскай Тэатэрштрасэ, сённяшняй вуліцы Энгельса, дзе ў трохпавярховым доме (пасля вайны там, насупраць цяперашняга кінатэатра "Піянер", месціўся Саюз беларускіх пісьменнікаў, потым будынак быў знесены) пражываў генеральны камісар акупіраванай Беларусі.

Кніга Вячаслава Селяменева і Віктара Шымоліна асабліва каштоўная тым, што ў ёй шырока выкарыстоўваюцца невядомыя, раней засакрэчаныя дакументы (найперш пратаколы "размоў" з трыма асноўнымі гераінямі мінскай акцыі пасля таго, як іх на самалёце даставілі праз лінію фронту ў Маскву). Аўтары не прыхарошваюць, але і не драматызуюць залішне ўсе дзеянні, звязаныя з ліквідацыяй гаўляйтэра. Ён паказаны ўсебакова — не толькі як падручны Гітлера і Розенберга, але і як складаная, супярэчлівая асоба, што імкнулася спазнаць беларускую культуру (аднак як блізкую да... арыйскай), пісаў вершы і нават прадбачыў у іх сваю пагібель. Ён быў чалавекам вонкава інтэлігентным, але скрытным, хітрым і таму асабліва небяспечным. Не ідэалізуецца і тагачаснае падполле: у ім быў гераізм, а побач — патаемнае саперніцтва, імкненне прысвоіць сабе поспехі іншых. Аб'ектыўна паказана беларускае нацыянальна-культурнае жыццё акупіраванага Мінска: побач з людзьмі, якія думалі пра будучыню свайго народа знаходзіліся і здраднікі. Прытрымліваючыся асноўнай, дакументаванай версіі замаху на Кубэ, аўтары звяртаюць увагу і на іншыя версіі, на тое, што паралельна магла аказаць уплыў на падзеі "рука СД", бо для гестапа некаторыя дзеянні гаўляйтэра здаваліся празмерна мяккімі. Пасля яго да ўлады дарваўся больш жорсткі Готберг.

Да кнігі дададзены 22 дакументы, якія паслужаць крыніцай для наступных даследчыкаў, а таксама падрабязная бібліяграфія, аснову якой складаюць архіўныя справы.

"Паляванне на ката" нельга пераказаць, яго трэба чытаць. Гэтая кніга — яшчэ адзін напамін пра народныя пакуты, але і народны гераізм.

Дзіяна ГРЫШАНАВА



Задайце дзеля інтарэсу пытанне сваім знаёмцам: адкуль звaліліся на тутэйшыя абсягі камяні? Сёй-той спашлецца на скандынаўскія ледавікі, якія некалькі дзесяткаў тысяч гадоў таму прыцягнулі ў сваім чэраве жыўцом сарваныя пароды граніту, базальту, пясчаніку... Але на аднаго дасведчанага суразмоўцу знойдзецца не менш трох зніякавелых маўкліўцаў, хоць і з вышэйшай адукацыяй. Адзін пацісне плячыма, другі пачне чухаць патыліцу, а трэці, наогул, адмахнецца :"Адчапіся... Рабіць табе няма чаго."

Камяні векапомныя

Шматлікія пакаленні беларусаў, асабліва сяляне, лічылі, што камяні... растуць з-пад зямлі. Як трава ці дрэвы. Існавала і іншае тлумачэнне. Як бы навуковае. "Зямля верціцца? Верціцца. Значыць, браце, узнікае адцэнтрабежная сіла, якая і выштурхоўвае камяні на паверхню. Каб зямля хутчэй раптам закруцілася, то камяні выскоквалі б з яе нетраў як гарматныя ядры. Во было б!"

За голаў па-сапраднаму хапаліся напрадвесні.Калі снег сыходзіў. Гэта ж трэба! Восенню усё поле прыбралі. Не тое, што ладныя валуны на ўскраек лесу бульдозерам пассоўвалі, дык нават галышы з кулак невялічкі ў крушні пазвозілі, а тут зноў, як насеяна. Павылазілі з раллі і нахабна шэрыя, белыя, чырванаватыя лабаціны на сонейку грэюць. Ах, ліха!

Справа ў тым, што пасля заворвання сярэдніх і дробных камянёў, скібы ўзімку наскрозь прамярзаюць, трымаюць камяні ў лядовых абдымках, а, як пацяплее — адпускаюць на волю. Да святла. Дарэчы, майце на ўвазе. Ноччу асцерагайцеся хадзіць уздоўж старых замкавых сцен. Нагрэтыя за дзень камяні, маюць моду падаць з вышыні трох-сямі метраў на сцежку...

Крыху — пра смешнае. А мо і грэшнае. Аднойчы ў маёй роднай вёсцы выпадак быў. З вобласці прыехалі на вытворчую нараду: паглядзець, якія чыстыя ў нас ад камянёў палеткі. Поле, дзе сабралася грамада, сапраўды, было прыбранае. Хітры гаспадар-брыгадзір напярэдадні сабраў каля трыццаці мужчын, і тыя спецыяльнымі драўлянымі даўбешкамі заганялі



камяні... назад у зямлю. Начальства было ўражана: "Да, поля прекрасные. Хоть самому катись!" Ішла першая палова 80-х...

Мне падаецца, што беларускі каменны летапіс па сваёй спракавечнасці і змястоўнасці не саступае летапісу кніжнаму. Толькі ў маёй сціплай калекцыі звыш 400 "адзінак": легенды, паданні, памятныя знакі, загадкавыя выявы...

Сёе-тое — да вашай увагі. Буду рады, калі яшчэ нехта пачне "збіраць" камяні, дрэвы, крыніцы...І складваць з іх (пісаць, тварыць) Трыадзіны Вобраз Беларусі.

1. Камень-следавік. Ляжаў ля вёскі Шалухі Маладзечанскага раёна. Некалі падчас восеньскіх фэстаў ля яго збіраўся люд. Гаманілі, весяліліся. Радаваліся, калі са "слядка" на камені птушка вадзіцу піла. "Калісьці Бог па зямлі хадзіў, камяні яшчэ мяккімі былі, і след застаўся..." Птушачка п'е, значыць, шчасце прысутным зычыць. Так цягнулася некалькі стагоддзяў. У перабудову знайшоўся нейкі мясцовы начальнік і пры рамонце дарогі загадаў завярнуць камень у канаву...

2. Бераг Нарачы... Чый партрэт на камені? Прычынілася тут рука чалавека ці прырода сама пачала "лішняе" адсякаць, імкнучыся Чалавека

ўхваліць? Хаця ў апошняе цяжка паверыць.

3. На Лагойшчыне ёсць невялічкая вёсачка Жукаўка. На горцы цэркаўка драўляная стаіць. Аднойчы яе абрабавалі, іконы выкралі. І каменьахоўнік з высечанымі лічбамі, што ляжыць замест прыступкі, не дапамог. На гэты пляскач не раз ступаў сам Янка Купала.У Жукаўцы кірмашы праходзілі.Непадалёчку купалаўскае радавое гняздо — Акопы.Тут і "Паўлінка" створана, і выдатная лірыка напісана...

4. Акуты ланцугамі "Барысаў камень". Заходняя Дзвіна, вёска Падкасцельцы. Здымак зроблены ў 1982 годзе. Тады адной вельмі разумнай галаве захацелася перацягнуць славуты камень з ракі бліжэй да Сафійскага сабора. Валун важыць 26 тон і 400 кілаграмаў. Дапамаглі з транспартам ваенныя.У той год я змясціў у газеце "Звязда" абуральную карэспандэнцыю: сусветную каштоўнасць нельга было вырываць са звыклага прыродна-гістарычнага асяродку. Хаця б ужо па той прычыне, што выцягнуты на паверню волат, калі яго своечасова не пакрыць спецыяльным ахоўным шклом, стварыўшы адпаведны мікраклімат, абавязкова пачне разбурацца.Скруцілі, зацягнулі і.... кінулі пад адкрытым небам. Вядома ж, Крыж, надпіс XII стагоддзя пад уздзеяннем ападкаў пачалі паступова сцірацца, знікаць. А камень ляжаў як па заказе. Пасярэдзіне Полацка і Наваполацка. Ляжаў восем стагоддзяў! Побач, на беразе, бруіла крынічка. Для ўпрыгожвання і ўпарадкавання яе і малых сродкаў хапіла б. Затое, якое месца для турыстаў! Між іншым, уладная кабета пры партфелі, якая распарадзілася перацягнуць камень, даўно з'ехала за мяжу...

5. Вось ён, Барысаў камень, "вызвалены" з рачнога палону.

Відаць, шмат што давядзецца нам яшчэ перавозіць і адкопваць наноў. Цешыць адно — людзі на талаку збяруцца. Мы — не сізіфы. Свае камяні, сваю памяць, уніз не дамо абрынуць.

Вячаслаў ДАШКЕВІЧ

Фота К. Дробава

Прыродныя лекі

Бортніцтва — адзін са старажытных спосабаў гаспадарання на тэрыторыі Беларусі. І самы смачны. Мёд з'яўляецца сапраўдным гаючым сродкам, бо змяшчае ў сабе шмат вітамінаў, мінеральных рэчываў і мікраэлементаў.

Прыгадваю, як сёлета ў Мінску ў Палацы мастацтва адбылася чарговая выстава-кірмаш "Мір мёду і здароў'я", што стала ўжо добрай традыцыяй. Арганізатары выставы — рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Беларускія пчаляры" і Свята-Елісавецінскі манастыр.

На кірмашы было прадстаўлена шмат сартоў салодкага прадукта: грэчневы, доннікавы, баяраш-нікавы, з сардэчніку, рамонку, пырэю, а таксама лясны (сумесь маліны, каліны, крушыны і звярабою) мёд. І кожны наведвальнік мог выбраць на свой густ.

Выстава сабрала пчаляроў з Алтаю, Башкіріі, Кубані, Растова і Беларусі. Наведвальнікам вельмі спадабаўся алтайскі мёд пад гандлёвай маркай "Старавер". Але ніводны гатунак мёду не застаўся без увагі. "Падтрымаем айчынных вытворцаў", — заклікалі гандляры з розных куткоў Беларусі: Шчучына, Віцебска, Мінска... І людзі слухалі іх, куплялі.

Былі прадстаўленыя перга, пылок кветак, забрус, мумію, кедравы бальзам. Не кожны ведае вартасць гэтых вырабаў, але ўсе яны дапамагаюць людзям папоўніць свой арганізм карыснымі рэчывамі, вітамінамі, арганічнымі кіслотамі. З дапамогай Беларускага грамадства прапагандыстаў вырабаў пчаляр-ства, якія забяспечвалі выставу друкаванымі лістоўкамі, наведвальнікі змаглі пашырыць свае веды і стаць больш інфарміраванымі.

— На рынку назіраюцца выпадкі фальсіфікацыі мёду: дабаўляюць усялякія прымесі, — асцерагаў наведвальнікаў гандляр. — Гэта можна заўважыць, растварыўшы мёд у вадзе. Калі мёд чысты, вадкасць мутнее, без асадку. Калі ж мёд змяшчае крухмал, то з дапамогай ёду мы ўбачым змяненне колеру. Але каб пазбегнуць падману, раю купляць мёд на выставе.

У межах выставы-кірмашу праходзілі дабрачынныя акцыі. Дзеці з дзіцячых дамоў адгадвалі загадкі, удзельнічалі ў шматлікіх віктарынах, прысвечаных пчалярству, і атрымлівалі салодкія падарункі.

Выставы-кірмашы "Мір мёду і здароў'я", між іншым, рэгулярна ладзяцца у шмат якіх буйных гарадах Беларусі.

Алена НЕВЯДОМСКАЯ

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Леанід ГАЛУБОВІЧ
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Валерый ПІНЧУК
(адказны сакратар)
Мікола СТАНКЕВІЧ
(намеснік галоўнага рэдактара)
Ірына ШАЎЛЯКОВА

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны
рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага
рэдактара — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-66-71
літаратурнага жыцця, крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
музыкі, тэатра, кіно
і выяўленчага мастацтва — 284-66-71
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ"
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова
"Літаратура і Мастацтва"

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства
"Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79

Індэкс 63856
Наклад 3428
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк
1.08.2007 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 4091

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686